WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛЮТАГА 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 20
(26628)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Калі сыр, то з Бярозы, калі хлеб, дык з Мінска і Гомеля

Беларусы вызначыліся са сваімі спажывецкімі перавагамі. Журы конкурсу «Прадукт года-2009» падвяло вынікі агульнанацыянальнага маркетынгавага даследавання.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

РУП «Гомельхлебпрам» і Магілёўхлебпрам першы раз удзельнічалі ў конкурсе і адразу атрымалі дыпломы.

Калі зазірнуць у халадзільнік сучаснага беларуса, то ў ім можна знайсці малако, кефір і ёгурт ад «Савушкін прадукт», сыр Бярозаўскага сыраробнага камбіната, Лідскі квас, макарону з Барысаўскага камбіната хлебапрадуктаў, каўбасу Гродзенскага мясакамбіната, ваўкавыскія пельмені і тушонку Бярозаўскага мясаканцервавага камбіната. Менавіта такія прадукты, згодна з вынікамі конкурсу, выбіраюць беларусы сёння.

Самымі лепшымі з 80 намінацый аказаліся «Мінск Крышталь», «Аквадзіў», «Камунарка», «Малочны мір», «Бабулін гладыш», «Бярозаўскі сыраробны камбінат» і г.д. Менавіта яны і атрымалі гранпры конкурсу.

Цукеркі «Камунаркі» папулярныя ўжо больш за 100 гадоў, з 1905 года. Па словах прадстаўніка фабрыкі, цукеркі «Камунаркі» ацанілі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Нядаўна ў перадачы «Кантрольная закупка» труфельны набор заняў першае месца па спажывецкіх перавагах.

Гомельскі і Магілёўскі хлебазаводы ўпершыню ўдзельнічаюць у конкурсе «Прадукт года» і адразу ж атрымалі першае і другое месца.

— Гомельскі хлеб «Валахоўскі» — гэта распрацоўка нашых спецыялістаў. Яму ўжо дзесяць гадоў. І ён правамерна лічыцца брэндам. Ёсць і заварны, і просты. Папулярнасцю карыстаецца хлеб з дабаўкамі кургагі, чарнасліву і разынак, — расказвае Алена Ткачова, галоўны тэхнолаг РУП «Гомельхлебпрам». — Мы прадаём свой хлеб не толькі ў Гомелі, але і па ўсёй Беларусі. Нават і ў Расію. Вядзём перамовы і з украінскім бокам.

Як адзначыў старшыня аргкамітэта конкурсу Ігар Данілаў, беларусы застаюцца традыцыйнымі ў сваіх перавагах. І ў гэтым годзе рэвалюцыі не адбылося.

— Цяжка было спажыўцам, якія часта губляліся ў такіх сітуацыях, — тлумачыць Ігар Данілаў. — Шмат гандлёвых марак, шмат тавараў, і таму спажывец часта не ведаў, што выбраць. У асноўным беларусы традыцыйныя ў сваім выбары. Мы ўжо дванаццаты год праводзім конкурс, і асаблівых навін не адбываецца. Выходзяць пэўныя кампаніі, але гэта адзінкі, таму што ў нас ідзе праграма імпартазамяшчэння. А ў асноўным рынак склаўся. Добра гэта ці дрэнна? З аднаго боку, заўжды хочацца новенькага чаго-небудзь, а з іншага боку — пастаянства, асабліва ў прадуктах харчавання. Вунь на Захадзе могуць гадамі і дзесяцігоддзямі аддаваць перавагу аднаму і таму ж прадукту. А ў нас бывае, што купляеш адзін прадукт, а праз паўгода ён выходзіць пад іншай маркай. Я — за пастаянства.

Пераможцы конкурсу вызначаліся згодна з рэпрэзентатыўным апытаннем, не менш за тысячу чалавек. Гэта гарадское насельніцтва 25 гарадоў Беларусі ва ўзросце ад 18 да 64 гадоў. Апытванне адбывалася метадам асабістага інтэрв'ю па 80 намінацыях.

Усяго ў конкурсе ўзяло ўдзел 116 прадпрыемстваў.

Настасся ЗАНЬКО.

Значнага павелічэння цэнаў на нафтапрадукты ў Беларусі ў найбліжэйшы час не плануецца

Аб гэтым паведаміў учора журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

«Ніякіх істотных змяненняў для аўтаперавозчыкаў, для насельніцтва не плануецца, значных ваганняў цэнаў на нафтапрадукты не будзе, — сказаў Сяргей Сідорскі. — Мы зробім усё, каб насельніцтва і тыя, хто за рулём, апынуліся ў дастаткова камфортных умовах».

Кіраўнік урада дадаў, што эканоміка Беларусі забяспечвае канкурэнтаздольнасць нафтапрадуктаў не толькі ўнутры краіны, але і ў параўнанні з сумежнымі дзяржавамі. Так, напрыклад, літр дызпаліва ў Беларусі каштуе 78-79 цэнтаў, ва Украіне цана гэтай прадукцыі за літр складае 84 цэнты, а ў Літве, Латвіі і Польшчы — 1,33-1,39 долара. У Расіі цана ніжэйшая, што тлумачыцца наяўнасцю багатых нафтавых рэсурсаў у гэтай краіне. Такая ж сітуацыя і па бензіну. Калі ў Беларусі літр бензіну AI-92 каштуе 0,96-0,98 цэнта, то ў Літве, Польшчы, Латвіі — каля паўтара долара. «Мы робім усё, каб цэны на беларускіх запраўках былі канкурэнтаздольнымі і ў той жа час прывабнымі для спажыўцоў», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі Сяргей Сідорскі і Уладзімір Пуцін учора ў час тэлефоннай размовы абмеркавалі некаторыя пытанні эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Аб гэтым паведаміў журналістам прэс-сакратар расійскага прэм'ер-міністра Дзмітрый Пяскоў. У прыватнасці абмяркоўваліся бягучыя аспекты двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі, будаўніцтва, а таксама хімічнай прамысловасці, сказаў прэс-сакратар. Гэта ўжо другая тэлефонная размова прэм'ер-міністраў дзвюх краін за апошнія 5 дзён. 30 студзеня яны абмяркоўвалі двухбаковае супрацоўніцтва ў сферы энергетыкі і паставак энергарэсурсаў, а таксама ўзаемаадносіны ў галіне будаўніцтва і крэдытна-фінансавай сферы. Сяргей Сідорскі і Уладзімір Пуцін дамовіліся таксама правесці чарговае пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы ў сакавіку ў Брэсце.

БЕЛТА.

Піва ў цягніках забароняць

Забарона на распіццё піва і слабаалкагольных напояў будзе дзейнічаць у пасажырскіх цягніках, на прыпыначных пунктах, станцыях і вакзалах. Парушальнікам пагражае штраф у памеры да васьмі базавых велічынь (адна базавая — Br35 тыс.). У транспартнай міліцыі нагадалі, што і раней у купэ і плацкартах, насуперак распаўсюджанай думцы, нельга было распіваць моцныя спіртныя напоі. Многія грамадзяне або ігнаравалі гэта патрабаванне, або проста не ведалі.

Каментуючы новаўвядзенне, ва УУДТ падкрэслілі, што закон будзе дзейнічаць і ў цягніках, якія следуюць па тэрыторыі Беларусі, якія належаць замежным транспартным кампаніям. У той жа час ужываць спіртное па-ранейшаму можна будзе ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах, у тым ліку і вагонах-рэстаранах.

БЕЛТА.

АДАРВАЛА ПАЛЬЦЫ

Вучань сёмага класа з Лельчыц быў дастаўлены ў бальніцу з траўматычнай ампутацыяй пальцаў левай рукі. НЗ адбылося падчас урока.

Як выявілася ў ходзе праверкі, якую вялі праваахоўнікі, школьнік спрабаваў злучыць акумулятарную батарэю мабільнага тэлефона з электрычным дэтанатарам. У выніку адбыўся выбух. У хлопчыка адарвала 4 пальцы на ўзроўні асноўных фалангаў, ірваная рана пятага. Іншыя дзеці не пацярпелі. Цяпер высвятляецца, дзе дзіця ўзяло дэтанатар.

БЕЛТА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	2 875,00
▲1 еўра	4 021,26
1 латвійскі лат	5 686,31
1 літоўскі літ	1 167,04
1 чэшская крона	155,61
1 польскі злоты	1016,42
▲1 расійскі рубель	96,22
1 украінская грыўня	356,48

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,8779
UAH	37,0464
1000 BYR	10,3491
EUR	41,7633

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

ПА ЎКОЛ АД ПАНДЭМІЧНАГА ГРЫПУ!

Зрабіць платную прышчэпку супраць пандэмічнага грыпу A/H1N1 цяпер можа кожны ахвотны. Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, інактываваная супрацьгрыпозная вакцына для правядзення вакцынацыі за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і асабістых сродкаў грамадзян паступіла ўжо ва ўсе рэгіёны краіны.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Для платнай імунізацыі была закуплена вакцына расійскай вытворчасці «МонаГрыпол плюс» і «МонаГрыпол Неа». У адрозненне ад «жывой» вакцыны, якую двойчы ўводзяць у выглядзе спрэя ў нос, інактываваная вакцына ўводзіцца з дапамогай ін'екцыі, а ўкол робіцца дарослым і дзецям, старэйшым за 6 гадоў, толькі аднаразова. Перавага інактываванай вакцыны заключаецца ў тым, што яе можна выкарыстоўваць для вакцынацыі цяжарных жанчын і дзяцей малодшага ўзросту. Праўда, ва ўзросце ад 2 да 6 гадоў вакцыну трэба ўводзіць двойчы з месячным інтэрвалам. Імунітэт супраць грыпу A/H1N1 выпрацоўваецца праз 14—18 дзён пасля вакцынацыі. Кожны рэгіён самастойна прымаў рашэнні аб аб'ёмах закупкі вакцыны для правядзення платнай вакцынацыі. Напрыклад, у сталіцы вырашылі, што для добраахвотнай вакцынацыі гараджан хопіць 5 тысяч дозаў вакцыны. Мінская вобласць закупіла каля 10 тысяч дозаў вакцыны. Магчымасць набыцця дадатковых партый вакцыны таксама не выключаецца, але гэта рашэнне будзе прымацца з улікам попыту на першую партыю.

Пакуль што захваральнасць на прастуду і грып знаходзіцца ў Беларусі на неэпідэмічным узроўні. У Мінску за мінулы тыдзень захварэлі на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі 26 217 чалавек. У параўнанні з папярэднім тыднем колькасць захворэлых павялічылася на 2,5 тысячы чалавек. У стацыянары былі шпіталізаваныя 437 чалавек (на 50 чалавек больш, чым на папярэднім тыдні). У панядзелак, 1 лютага, у паліклінічныя ўстановы Мінска звярнуліся з прастуднымі сімптомамі 6072 мінчаніны, у аўторак — яшчэ 5100 чалавек. Такім чынам захваральнасць у Мінску працягвае расці і на гэтым тыдні, хоць яшчэ і не дасягнула эпідэмічных парогаў.

У галоўным медыцынскім ведамстве запэўніваюць, што ў краіне сфарміраваны незніжальны запас лекавых сродкаў на перыяд эпідэмічнага пад'ёму ВРВІ і нагадваюць аб тым, што самы час паклапаціцца пра сезонную імунапрафілактыку, каб павысіць супраціўляльнасць арганізма да прастудных захворванняў. Да адаптагенаў раслінна паходжання адносяцца экстракт элеўтэракоку, эхінацыі, настойка араліі, настойка жэньшэню. Да таго ж на стале павінны прысутнічаць пастаянна любая садавіна і агародніна, багатая на вітамін С: гэта капуста, яблыкі, лімоны, журавіны і г. д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЛЯ ДАВЕДКІ

У сталіцы платныя прышчэпкі даступныя ва ўсіх дарослых паліклініках, у 10-й і 25-й дзіцячых паліклініках, у Гарадскім цэнтры вакцынапрафілактыкі на базе гарадской дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. Кошт вакцынацыі складае каля 30 тысяч рублёў.

Зберажэнні

СЕРАБРО БОЛЬШ ПАПУЛЯРНАЕ...

У студзені беларусы раптоўна страцілі цікаўнасць да 10-грамовых залатых мерных зліткаў, якія раней больш за ўсё куплялі, а папулярнымі ў насельніцтва сталі 1-грамовыя «кавалачкі» каштоўнага металу.

Яшчэ адна адметнасць студзеня, якая датычыцца аперацый з залатымі мернымі зліткамі, — упершыню зваротны выкуп металу ўшчыльную зблізіўся з прададзенай агульнай масай: за месяц насельніцтвам было куплена сорак з паловай кілаграмаў золата, а ў людзей выкуплена банкамі амаль 36 кіло. Паводле меркавання некаторых экспертаў, падобна, што людзі не хочуць рызыкаваць, і калі ў студзені намецілася тэндэнцыя да змяншэння даходнасці ад інвестыцый у золата, яны вырашылі не выпрабоўваць лёс. Нагадаем, што ў мінулым месяцы на сусветным рынку золата пачало таннець на фоне долара, які ўмацоўваўся. Відаць, далёка не ўсе схільныя верыць прагнозам наконт таго, што кошт металу можа вырасці ў гэтым годзе на 20—60 працэнтаў, як прадракае большасць сусветных аналітыкаў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, за першы месяц года банкамі было рэалізавана 2026 штук залатых мерных зліткаў, а ўсяго з пачатку продажу банкамі залатых мерных зліткаў (жнівень 2001) у краіне прададзена іх агульнай масай больш як 6 тон 326 кілаграмаў. Больш за ўсё ў студзені набылі 1-грамовых зліткаў, якіх прададзена 593 штукі. 10-грамовыя зліткі па папулярнасці апусціліся на другое месца — іх куплена 508 штук, а трэцяе занялі 5-грамовыя зліткі, якіх рэалізавана 440 штук. Знайшліся і пакупнікі на 500-грамовыя (кошт аднаго — 18 282 долары ЗША) і 1-кілаграмовыя зліткі (прадаюцца па 36 555 долараў за штуку), якіх адпаведна прададзена банкамі 5 і 2 штукі.

Амаль у два разы больш, чым залатых банкамі рэалізавана сярэбраных мерных зліткаў: пакупнікі набылі 753 штукі агульнай масай больш за 78 кіло. Прычым банкамі рэалізавана ажно 50 зліткаў вагой па 500 грамаў (адзін каштуе 318 долараў) і 18 — аднакілаграмовых (637 долараў). Плацінавых мерных зліткаў за месяц прададзена 142 штукі агульнай масай 3 кілаграмы 653 грамы. Між іншым, зваротны выкуп банкамі гэтых зліткаў перавысіў аб'ём рэалізаваных на 720 грамаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

АДТЭРМІНОЎКА АД АРМЕЙСКАГА ПРЫЗЫВУ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ-ПЛАТНІКАЎ ЗАХАВАЕЦЦА

Прапанова беларускіх дэпутатаў аб адмене адтэрміновак ад армейскага прызыву для студэнтаў-платнікаў не знайшла падтрымкі і не ўвойдзе ў лік паправак у закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе». Аб гэтым паведаміў БЕЛТА старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Віктар ГУМІНСКІ.

На пасяджэнні рабочай групы вырашана пакінуць тую частку законапраекта, якая датычыцца прадастаўлення адтэрміновак ад службы ў арміі, без змяненняў. Яна застаецца ў тым жа выглядзе, у якім была прынята дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні. Гэта значыць, адтэрміноўку ад арміі плануецца адмяніць толькі для студэнтаў завочных формаў навучання.

«Прапанова аб тым, каб замест завочнікаў, прызываць усіх студэнтаў-платнікаў не знайшла падтрымкі ні ў Міністэрстве адукацыі, ні ў Адміністрацыі Прэзідэнта, выклікала неадназначнае тлумачэнне ў грамадстве», — растлумачыў Віктар Гумінскі. Таму яна не ўвайшла ў законапраект пры падрыхтоўцы яго да другога чытання.

«Гэта не азначае, што прыйдзе час і ўсіх завочнікаў прызавуць. У армію возьмуць толькі столькі, каб даўкамплектаваць сілавыя структуры да неабходнай колькасці прызыўнікоў», — растлумачыў Віктар Гумінскі. Ён нагадаў, што студэнты атрымалі адтэрміноўку ад арміі толькі ў 2007 годзе, а да гэтага ўсе ішлі ў армію і нічога страшнага не адбывалася.

Некалькі гадоў таму была іншая сітуацыя з колькасцю прызыўнікоў. Да гэтага часу яна моцна змянілася. Міністэрства абароны заяўляе аб штогадовым скарачэнні колькасці прызыўных рэсурсаў для забеспячэння абароны і ваеннай бяспекі дзяржавы. За апошні час колькасць мужчын, якім споўнілася 18 гадоў, прыгодных да вайсковага прызыву, штогод скарачаецца на 5—7 працэнтаў. Так, у 2007 годзе прыдатнымі да службы ў арміі былі прызнаны больш за 58 працэнтаў прызыўнікоў, у 2008-м — 49 працэнтаў, у 2009-м — амаль 41 працэнт. У бліжэйшыя 2-3 гады гэта тэндэнцыя захаваецца.

У той жа час Беларусь мае самы вялікі пералік адтэрміновак сярод краін СНД: 28 падстаў для непрызыву, што ахопліваюць 49 катэгорый (у Расіі толькі 21 адтэрміноўка, ва Украіне — 17). З-за атрымання адукацыі ў Беларусі атрымліваюць адтэрміноўкі больш за 164 тыс. чалавек ва ўзросце 18—26 гадоў, з іх каля 36 тыс. навучаюцца на завочнай форме.

Дэпутат падкрэсліў, што калі законапраект будзе прыняты і атрымае статус закона, ён не будзе мець зваротнай сілы. Гэта значыць не будзе распаўсюджвацца на тых, хто сёння прызваны і навучаецца завочна. Нормы законапраекта закрануць толькі тых, хто паступіць пасля яго прыняцця. Віктар Гумінскі абнадзеіў: «Прызыў у армію студэнтаў-завочнікаў — гэта, магчыма, часовая мера». Ён не выключае, што ў будучым армія можа перайсці на аднагадовы тэрмін службы. Мінабароны выступае ў падтрымку гэтай прапановы, але іншыя сілавыя ведамствы пакуль не гатовы да такіх змяненняў.

ПАЦЯРПЕЛІ З-ЗА ДАВЕРЛІВАСЦІ... Крымінал

У Мінску ў адным выпадку старая стала ахвярай махляркі, а вось вясковец «згубіў» грошы ў выніку кахання без узаемнасці.

73-гадовая старая, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, якая жыве на вуліцы Розы Люксембург, пусціла да сябе невядомую жанчыну: тая, каб патрапіць у кватэру да пенсіянеркі, назвалася сацыяльным работнікам. Як выявілася пазней, прайдзісветка ніякага дачынення да сацыяльнай службы не мела, затое добра ведала, дзе шукаць чужыя грошы. Каля гадзіны спатрэбілася крымінальніцы, каб выкрасці прыхаваныя старой рублі: калі госця сышла, гаспадыня схамянулася і ўбачыла, што з кватэры зніклі 1 мільён 200 тысяч рублёў.

Нечаканыя «траты» таксама панёс 31-гадовы жыхар Мінскага раёна, якому «пашчасціла» на чыгуначным вакзале сустрэць знаёмую. Мужчына прапанаваў апошняй пасядзець і выпіць, разлічваючы на больш прыемны ў наступным працяг «банкету». Толькі не заўважыў небарака, як забліскі вочы ў жанчыны, калі тая ўбачыла пачак грошай у кавалера, які разлічваўся за спіртное. Пасядзець яны вырашылі на гарышчы найбліжэйшага дома. А пакуль ехалі ў ліфце ўверх, жанчына пяшчотна прыціскалася да спадарожніка, абдымала таго. Ды так старанна, што той млеў і нічога не заўважаў: мабыць, сэрца грэла думка, што робіць яна гэта ад вялікага кахання. Толькі дзе там! Калі дабраліся да гарышча, жанчына раптоўна паведаміла, што забыла набыць посуд для віна і накіравалася быццам бы ў краму. Мужчына ж выявіў пасля яе сыходу, што з кішэні куртакі зніклі 600 тысяч рублёў. Выбег на вуліцу, але жанчыны і след прастыў. Між іншым, супрацоўнікі міліцыі адшукалі зладзюжку на тым жа вакзале. Толькі дзе гэтага часу яна паспела амаль усе грошы патраціць...

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПА ТЭМПАХ ЗНІЖЭННЯ ЭКАНОМІКІ РАСІЯ ПЕРШАЯ Ў СВЕЦЕ СЯРОД ЭКСПАРЦЁРАЎ НАФТЫ

Па тэмпах падзення эканомікі сярод краін-нафтаэкспарцёраў Расія займае першае месца ў свеце. Па кантрасце з ёй іншыя экспарцёры вуглевадародаў захавалі эканамічны рост або толькі крыху знізілі свой ВУП.

РФ вылучылася таксама правальнымі паказчыкамі ў «Вялікай васьмёрцы» — G8 — і «Дваццацты». Афіцыйнае членства Расіі ў «Вялікай васьмёрцы» было спынена летась. Такія высновы аб наступствах крызісу для Расіі апублікаваў былы эканамічны дарадца Уладзіміра Пуціна Андрэй Іларыёнаў.

Па кантрасце з Расіяй шматлікія буйныя экспарцёры вуглевадародаў альбо крыху знізілі свой ВУП — на 2,0-0,2 % (Казахстан, Венесуэла, Нарвегія, Кувейт, Саудаўская Аравія, ААЭ), альбо працягвалі яго нарошчваць (Ангола, Бруней, Аўстралія, Іран, Чад, Лівія, Алжыр, Балівія, Нігерыя, Туніс, Сірыя, Бахрэйн, Туркменістан, Інданэзія, Аман, Ірак, Егіпет). Паводле слоў Іларыёнава, «тлумачэнне рэкардная зніжэння ВУП сусветнай нафтавай кан'юнктурай, якое навязваюць расійскай грамадскасці ўлады і некаторыя эканамісты, не адпавядае рэчаіснасці».

ПОПЫТ НА КРЭДЫТЫ ВА УКРАІНЕ СКАРАЦІЎСЯ Ў 10 РАЗОЎ

У 2009 годзе колькасць жыхароў Украіны, якія ўзялі крэдыт пад заклад маёмасці, скарацілася ў 10 разоў, паведамляецца ў афіцыйным прэс-рэлізе міністэрства юстыцыі Украіны.

Паводле заявы міністра юстыцыі Мікалая Анішчука, у 2009 годзе складзена ўсяго 37,5 тысячы натарыяльна заверэных дагавораў закладу рухомай і нерухомай маёмасці. З іх 18,3 тысячы крэдытаў аформлена пад заклад нерухомасці, і 19,3 тысячы крэдытаў — пад заклад іншай маёмасці.

Максімальная колькасць крэдытаў прыйшлася на 2007 год і склала 500 тысяч крэдытных дагавораў, з якіх 267 тысяч — іпатэчныя крэдыты. У 2008 годзе з пачаткам эканамічнага крызісу аб'ём крэдытавання скараціўся прыкладна на 30 працэнтаў.

Украіна — адна з найбольш пацярпелых ад крызісу еўрапейскіх краін. З-за зніжэння попыту і выручкі аб'ём прамысловай вытворчасці за 2009 год скараціўся больш як на 20 працэнтаў.

«АЛЬ-КАІДА» НЕПАЗБЕЖНА ПАСПРАБУЕ ЗДЗЕЙСНІЦЬ ТЭРАКТ СУПРАЦЬ ЗША Ў НАЙБЛІЖЭЙШЫЯ ПАЎГОДА

Амерыканскія спецслужбы лічаць непазбежнай спробу здзяйснення сеткай «Аль-Каіда» новага тэракта супраць ЗША ў найбліжэйшыя тры-шэсць месяцаў. Гэта высветлілася на слуханнях у адмысловым камітэце па разведцы сената Кангрэса ЗША.

Яны былі прысвечаныя штогадоваму агляду пагроз бяспекі ЗША. На гэтых слуханнях выступілі кіраўнікі ключавых амерыканскіх спецслужбаў, уключаючы ЦРУ і ФБР, а таксама дырэктар нацыянальнай разведкі ЗША Дэніс Блэр. Ён курыруе дзейнасць усіх 16 амерыканскіх разведвальных ведамстваў.

Як заявіў Блэр, амерыканскія спецслужбы лічаць, што «Аль-Каіда» «захоўвае намер» атакаваць кантынентальную частку ЗША «пераважна праз правядзенне буйнамаштабнай аперацыі, якая выкліча масавыя чалавечыя ахвяры, нанясе ўрон эканоміцы або дасягне абедзвюх гэтых мэтаў».

ІРАН ЗАЯВІЎ АБ ПАСПЯХОВЫМ ВЫПРАБАВАННІ РАКЕТЫ-НОСЬБІТА

Іран у сераду паспяхова выпрабаваў ракету-носьбіт «Кавашгар-3», прызначаную, па афіцыйнай версіі, для выводу на арбіту спадарожнікаў, паведамляюць мясцовыя СМІ. Ракета даставіла ў космас «эксперыментальную капсулу».

Тэхнічныя характарыстыкі ракеты і іншыя падрабязнасці запуску не паведамляюцца.

Раней дзяржаўныя СМІ Ірана паведамілі, што ў сераду ісламская дзяржава прадставіць тры новыя спадарожнікі і адну ракету-носьбіт. У краіне таксама павінен адкрыцца цэнтр вывучэння звестак, атрыманых з іранскіх спадарожнікаў.

2 лютага іранскае агенцтва FARS паведаміла таксама, што ў краіне распрацаваная прынцыпова новая ракета класа «зямля-паветра». Паводле звестак агенцтва, новая зброя сканструявана адмыслова для таго, каб супрацьстаяць амерыканскім верталётам Apache падчас магчымага ўварвання ў Іран войска ЗША. Цяпер ЗША шырока выкарыстаюць Apache падчас вайсковых кампаній у Іраку і Афганістане.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТЭХАГЛЯД ПАДАРАЖЭЎ НА 5 ПРАЦЭНТАЎ

Рост тарыфаў на паслугі па правядзенні дзяржаўнага тэхнічнага агляду транспартных сродкаў у Беларусі складае ў сярэднім 5 працэнтаў.

Як зазначаюць у Міністэрстве эканомікі, новы прэйскурант на паслугі па правядзенні дзяржтэхагляду зацверджаны ў сувязі з тым, што з увядзеннем у дзеянне з 1 студзеня 2010 года Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Беларусі стаўка падатку на дабаўленую вартасць павялічылася з 18 да 20 працэнтаў і адбылося павелічэнне затрат на аказанне паслуг. Цяпер кошт тэхагляду, у прыватнасці легкавога аўтамабіля з рухавіком, які працуе на бензіне, з улікам падатку на дабаўленую вартасць складзе 28 200, з рухавіком, які працуе на дызельным ці газавым паліве, — 29 900 рублёў, аўтобуса з тэхнічна дапушчальнай масай не больш за 5 тон — 37 600 рублёў, з тэхнічна дапушчальнай масай больш за 5 тон — 37 900, грузавога аўтамабіля з тэхнічна дапушчальнай масай не больш за 3,5 тоны — 33 300 рублёў, грузавога аўтамабіля з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 тоны, які прызначаны для перавозкі пэўных небяспечных грузаў, — 39 100 рублёў, грузавога аўтамабіля ці аўтамабіля-цегача з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 і не больш як 12 тон — 37 600, грузавога аўтамабіля ці аўтамабіля-цегача з тэхнічна-дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 і не больш як 12 тон, які прызначаны для перавозкі пэўных небяспечных грузаў, — 43 400 рублёў, грузавога аўтамабіля ці аўтамабіля-цегача з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш як 12 тон — 43 700 рублёў, грузавога аўтамабіля ці аўтамабіля-цегача з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 12 тон, які прызначаны для перавозкі пэўных небяспечных грузаў, — 49 100 рублёў, прычэпаў — ад 9300 да 26 000 рублёў, матацыкла — 12 800 рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАТАНУЎ У ПАІЛЬНЫМ КАРЫЦЕ

На ферме ў Чашніцкім раёне ў паільным карыце для цялят у нецвярозым стане патануў 38-гадовы беспрацоўны. Дарэчы, вартаўнік фермы не ведаў, што чужы чалавек знаходзіўся ў цялятніку.

Як паведаміла «Звяздзе» **следчы пракуратуры Чашніцкага раёна Кацярына АЗАРУШКІНА,** загінулы ў той ракавы для яго дзень падмяняў на ферме жывёлавода. Апошні папрасіў земляка выручыць, бо з'явіліся важныя хатнія справы. Калі на ферме скончыўся працоўны дзень, работніца фермы наліла вады цялятам у карыта і перадала памяшканне пад ахову вартаўніку. Як яны не заўважылі прысутнасць чужака? Загінулы — былы работнік гаспадаркі, жыў адзін, злоўжываў спіртным. Падчас следства было ўстаноўлена, што на момант смерці мужчына знаходзіўся ў цяжкай ступені алкагольнага ап'янення (4 праміле!). Шмат для каго гэта смяротная доза.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАД ЦЯЖАРАМ СНЕГУ АБВАЛІЎСЯ ДАХ ДВУХПАВЯРХОВАГА ДОМА

У вёсцы Гарадзішча Пінскага раёна надзвычайнае здарэнне справакаваў апошні снегапад. Дах двухпавярховага цаглянага дома 1957 года пабудовы праваліўся разам са снежнай масай.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў, пацярпелых няма. Сем гадоў таму раённай камісіяй гэты 8-кватэрны дом быў прызнаны як не адпаведны санітарным нормам пражывання людзей менавіта з-за нездавальняючага стану даху. Тады перасялілі ў іншае жыллё чатыры сям'і з другога пад'езда. А на ніжнім паверсе засталіся жыць таксама чатыры сям'і, усяго адзінаццаць чалавек.

Пасля здарэння людзі тэрмінова пераселены ў часовыя памяшканні. А райвыканкам разам з раённай камісіяй па надзвычайных сітуацыях днямі вырашыць пытанне наконт забеспячэння іх пастаянным жыллём.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

А ЦІ БЫЛА ЛАЗНЯ?

Пакуль лазня не згарэла, ніхто не ведаў пра яе існаванне. Сутнасць у тым, што лазня знаходзілася на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, у памяшканні, якое арандуе ААТ «Брэстрэстаўрацыя».

Старыя казармы цяпер арандуюць многія арганізацыі, такім чынам мемарыяльны комплекс зарабляе дадатковыя сродкі на сваё функцыянаванне. Але ад тым, што пры сваіх кавальскім і сталярным цэхах абсталяваў невялікую лазню, арандатар не праінфармаваў гаспадара. Не было на гэты конт і адпаведных дакументаў. Кіраўніцтва ж крэпасці вельмі разгневалася і пагражае санкцыямі. У сваю чаргу кіраўніцтва арганізацыі-арандатара сцвярджае, што там не было лазні, а былі бытавыя памяшканні для таго, каб рабочыя маглі прыняць душ пасля змены. Відаць, да разбору справы будуць прыцягнуты кампетэнтныя органы.

Яна СВЕТАВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 12 ФЕВРАЛЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О внесении дополнений и изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросу повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 9 февраля), а также с решением, принятым внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 12 февраля) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 9 февраля 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.

УНП 100325912.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. ВИТЕБСКЕ

Продавец: Витебский городской исполнительный комитет

ЛОТ: право на заключение договора аренды земельного участка для размещения объекта «Магазин-кафе-кулинария по ул. М. Горького-5-я Социалистическая в г. Витебске» площадью 0,1444 га, кадастровый номер 240100000003004817, срок аренды 99 лет, начальная цена продажи 28 513 549 рублей, расходы по изготовлению документации 667 599 рублей.

Задаток за участие в аукционе составляет 10 % от начальной цены лота.

Извещение опубликовано в газетах «Недвижимость Беларуси» от 19.01.2009 г. № 2, «Віцебскі рабочы» от 17.01.2009 г. № 7.

Аукцион состоится **17 февраля 2010 г. в 15.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления и документы на участие принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Последний день приема заявлений 11.02.2010 до 17.00. Аукцион проводится в соответствии с Положениями о порядке организации и проведения аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков, утв. Постановлением Совмина РБ от 26.03.2008 г. № 462. Условие – наличие не менее 2-х участников. Заключительная регистрация участников **17.02.2010 г. с 14.30 до 15.00** по месту проведения торгов. Ориентировочные затраты на организацию и проведение аукциона составляют 1 160 290 рублей. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона будут объявлены дополнительно перед проведением торгов.

Контактные телефоны:
8 (0212) 435 435; 435 495; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05;
эл. почта: vit.in@tut.by; www.Ocenka.by

Антыкрызісная эканоміка

ПРАРЫЎ ДА ПЯЦІГОДКІ

На пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама акцэнтавалі задачы на 2010 год, галоўныя з якіх — выкананне прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і 500-доларавы заробак.

Бітва за прагнозы

Летась эканоміка рэгіёна здолела адаптавацца да новых посткрызісных умоў гаспадарання, а сёлета ад яе чакаюць прарыву.

— Ад прадпрыемстваў, якія не выйдуць на выраб канкурэнтаздольнай прадукцыі і не знойдуць рынку збыту, хутка можа нічога і не застацца ва ўмовах цяперашняй жорсткай канкурэнцыі, — папярэдзіў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК.**

— Мінулы год паказаў, як шмат ёсць яшчэ рэзерваў, якія не былі задзейнічаны, — лічыць **кіраўнік Камітэта дзяржкантролю Зянон ЛОМАЦЬ,** які браў удзел у пасяджэнні аблвыканкама. — Усе яны павінны быць задзейнічаныя, таму што як ні складана, а выкананне прагнозных паказчыкаў — справа святая. Менавіта з гэтага будзе ацэньвацца праца кожнага кіраўніка і спецыяліста. Пяцігодку трэба выканаць!

Шукайце фінансы

Кіраўніцтва вобласці падкрэсліла, што летась у вельмі няпростых умовах гаспадарання некаторыя прадпрыемствы спрацавалі нават лепей, чым у дакрызісныя часы. Гэта ААТ «Магілёўхімвалакно», завод «Строммашына», Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання.

Па іх шляху, спадзяюцца ў вобласці, пойдуць і іншыя: напрыклад, ААТ «Белшына», якое вымушана выжываць у барацьбе з расійскімі канкурэнтамі і павышэннем цэнаў на сыравіну, зоймецца вытворчасцю біядызелю. Менавіта гэта новая прадукцыя выцягнула раней з эканамічнага правалу іншага хімічнага гіганта ААТ «Магілёўхімвалакно».

Актуальнай праблемай застаюцца **складскія запасы**. Цяпер на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці захоўваецца гатовая прадукцыя на суму 500 мільярдаў рублёў. Летась, вядома ж, было і болей, але лічба ўражвае: гэта вялізныя фінансавыя сродкі, якія выведзены па-за абарот прадпрыемстваў.

На парадку дня: фінансавая ўстойлівасць прадпрыемстваў, рэнтабельнасць прадукцыі, прыбыткі, наяўнасць грошай на разліковых рахунках, павелічэнне экспарту і мінімізацыя імпарту і, безумоўна, **выкананне прагнозных паказчыкаў.**

Тэрміны і якасць

У вобласці сёлета трэба пабудаваць **каля 800 тысяч квадратных метраў жылля.** Лічба перавышае план мінулых гадоў. Тым болей, што ад будаўнікоў запатрабуюць дакладнага выканання тэрмінаў і будуць строга кантраляваць якасць работ. Таму што летась да ўладаў паступіла столькі скаргаў на будаўнікоў, колькі не было ва ўсе папярэднія гады.

Дапамогуць выканаць напружаны план па жыллёвым будаўніцтве і грамадзяне, якім выдзелены ўчасткі для індывідуальнага будаўніцтва. Гэтак жа, як у сельскай гаспадарцы ўраджай, вырашчаны на прыватных палетках, будзе ўлічаны ў агульным караваі.

Прыватнае да грамадскага

Пытанне аб стаўленні **да ўласных падсобных гаспадарак** вяскоўцаў падняў Зянон Ломаць:

— Ужо ёсць выпадкі, калі сельскія гаспадаркі ўключаюць прыватныя надзелы ў свой севазварот. Людзі кампенсуюць выдаткі, а самі атрымліваюць бульбу альбо жыта. Гэта магчымасць пашырыць уласную гаспадарку і атрымаць прыбаўку да заробку і пенсіі.

У той жа час сельскія гаспадаркі павялічваюць за кошт прыватнікаў аб'ём вытворчасці. Тады не трэба будзе займацца бязглуздымі прыпіскамі, як гэта здараецца, каб выканаць прагнозныя паказчыкі.

Якасць жыцця

Самая галоўная лічба гэтага года — **500 долараў.** Такім павінен быць сярэдні заробак у сёлетнім снежні. Між тым, Магілёўская вобласць займае апошняе месца ў краіне па ўзроўні заробкаў. Заробак вырас за 2009 год намінальна, але рэальна — скараціўся. Летась удалося дацягнуць толькі 330 долараў.

Так, ёсць сферы, дзе людзі зарабляюць істотныя грошы: напрыклад, у энергетычнай галіне сярэдні заробак падабраўся да 1,5 мільёна рублёў. Аднак на швейных вытворчасцях ён не нашмат перавысіў 600 тысяч рублёў. У вобласці больш за 200 арганізацый у сярэднім плацяць людзям меней за 200 долараў у месяц. Так што павышэнне ўзроўню жыцця людзей — гэта шырокі фронт работ і канчатковая мэта дзейнасці ўлады.

— Задача № 1: павелічэнне заробку і выхад на 500 долараў, — сказаў Пётр Руднік. — Нагадаю, што 2010 абвешчаны Годам якасці, і перш за ўсё якасці жыцця людзей.

Ілона ІВАНОВА.

Твае правы

ДАГАВОР З АДВОЛЬНЫМ ГРАФІКАМ

Магчымасць зарабіць «лішнія» грошы прываблівае ці не кожнага, да таго ж самых розных варыянтаў падпрацовак, асабліва ў буйных гарадах, звычайна бывае нямала. Але ва ўсіх, хто ўжо мае сталы занятак, усё ж можа ўзнікнуць праблема. Бо тое ж уладкаванне па сумяшчальніцтве — гэта строгія «часовыя» ліміты, а калі-нікалі і цяжкавырашальны пошук кампрамісу адразу з двума наймальнікамі. Прычым, калі дасягнуць прымальнага раскладу не ўдаецца, застаецца адно — заключэнне грамадзянска-прававога дагавора. Праўда, таксама не сакрэт: тут ёсць як перавагі, так і свае «мінусы».

ЗА СПАЗНЕННЕ НЕ КАРАЮЦЬ

Як правіла, грамадзянска-прававыя дагаворы заключаюцца для выканання пэўных, часцей за ўсё аднаразовых работ. Пры гэтым вызначаецца канкрэтны тэрмін іх заканчэння. А вось іншыя нюансы па сутнасці ўжо адыходзяць на другі план. Выканаўца работы самастойна вызначае зручны для сябе працоўны графік, тут няма якіх-небудзь строгіх «рамак» па працягласці, пачатку і заканчэнні змены. Прычым для выканання сваёй агульнай «задачы» той жа падрадчык можа прыцягваць і іншых асобаў — скажам, сяброў або сваякоў.

— Чалавек, які заключае грамадзянска-прававы дагавор з юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам, не з'яўляецца штатным работнікам арганізацыі, — кажа **загадчык юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір ШЭЛКОВІЧ.** — Адпаведна на падрадчыка не распаўсюджваюцца правілы ўнутранага працоўнага распарадку і да яго немагчыма выкарыстаць меры дысцыплінарнага спагнання, напрыклад, прыцягнуць да адказнасці за спазненне або прагул. Для заказчыка не павінна быць важным, калі падрадчык працуе. Галоўнае тут — канчаткоўны вынік.

«БАЛЬНІЧНЫ» ПЛЮС ПЕНСІЙНЫ СТАЖ

Вынікам адсутнасці падрадчыка ў штаце становіцца змяншэнне ўзроўню яго сацыяльнай абароны. У прыватнасці, на выканаўцу работ па грамадзянска-прававым дагаворы не распаўсюджваецца калектыўны дагавор арганізацыі, тыя або іншыя «карпаратыўныя» бонусы. Аднак казаць, што падрадчык не мае ніякіх гарантый увогуле, таксама няправільна.

— Юрыдычныя асобы або індывідуальныя прадпрымальнікі, якія заключаюць грамадзянска-прававы дагавор, павінны ў абавязковым парадку плаціць за падрадчыка ўзносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, — падкрэслівае Улдзімір Шэлковіч. — Такім чынам, у час дзеяння грамадзянска-прававога дагавора падрадчык, які захварэў, мае права на аплату «бальнічнага», сам перыяд занятасці па такім дагаворы залічваецца ў пенсійны стаж, а сума ўзнагароджання за выкананне работы ўплывае на памер індывідуальнага каэфіцыенту заробку.

ХТО П'Е, ТОЙ НЕ ПРАЦУЕ

Асобная гаворка аб умовах працы. Так, вызначана: месцы, што пры неабходнасці даюцца для выканання работ па грамадзянска-прававым дагаворы, павінны абавязкова адпавядаць патрабаванням тэхнікі бяспекі. Заказчык мусіць праводзіць навучанне, інструктаж, павышэнне кваліфікацыі і праверку ведаў падрадчыкаў па пытаннях бяспекі працы або патрабаваць адпаведныя пацвярджальныя дакументы, і ў тым ліку — аб праходжанні патрэбнага для некаторых відаў работ медыцынскага агляду. Да таго ж пры надзвычайных здарэннях заказчык павінен расследаваць або браць удзел у расследаванні выпадкаў вытворчага траўматызму.

Нарэшце, яшчэ адзін вельмі адметны момант. Нягледзячы на адсутнасць падрадчыка ў штаце, заказчык проста абавязаны адхіляць яго ад працы на дадзеным месцы ў выпадку з'яўлення ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення, а таксама ў стане хваробы.

— Да таго ж трэба мець на ўвазе, што падрадчык мае поўнае права цалкам ці часткова адмовіцца ад выканання работ у выпадку, калі заказчык не стварыў бяспечных умоваў, — заўважае Уладзімір Шэлковіч. — Але пры гэтым у сваю чаргу выканаўцы работ па грамадзянска-прававым дагаворы абавязаны выконваць інструкцыі і правілы па тэхніцы бяспекі, эксплуатацыі машын, абсталявання і іншых сродкаў вытворчасці, строга прытрымлівацца правілаў паводзінаў на тэрыторыі, у вытворчых, дапаможных і бытавых памяшканнях арганізацыі, выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай абароны, праходзіць навучанне, інструктаж, павышэнне кваліфікацыі па пытаннях бяспекі, а таксама — праходзіць неабходныя медагляды.

ПРАТЭРМІНОЎКА — ГЭТА ГРОШЫ

Ці не галоўны нюанс. Кожны, хто бярэцца за выкананне работы па грамадзянска-прававым дагаворы, павінен заключыць з заказчыкам — юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам дагавор. Прычым ніякія вусныя дамоўленасці тут немагчымыя — дагавор заключаецца выключна ў пісьмовай форме.

— Тут неабходна вызначыць час заканчэння работ, падставы для датэрміновага скасавання дагавора, парадак разліку і ў тым ліку — непасрэдна сумы выплат, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — Канкрэтны памер узнагароджання падрадчыку залежыць ад двухбаковай дамоўленасці. Аднак нялішне памятаць: за невыкананне абавязкаў па аплаце выкананай работы, аказанай паслугі або створанага аб'екта інтэлектуальнай уласнасці заказчык павінен несці адказнасць у выглядзе няўстойкі — у памеры не менш чым 0,15 працэнта ад няўплачанай сумы за кожны дзень пратэрміноўкі. Пры гэтым усе спрэчныя моманты, у тым ліку канфлікт умоў дагавора, падпісання акта выкананых работ ці аплаты могуць вырашацца толькі ў судзе.

Сяргей ГРЫБ.

Абзац

◢ У першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы летась заключана 11 дамоў аб сурагатным мацярынстве, расказала БЕЛТА нам. загадчыцы канторы Галіна Іваннікава. Дамовы заключалі грамадзяне краіны, у т.л. жыхары Мінска, Мінскага раёна, Віцебска, Маладзечна, Магілёўскай вобласці. У дамовах абумоўліваюцца і сумы, якія выплачваюцца сурагатнай маці. Мінімальны памер аплаты складае Br10 млн, максімальны — Br25 млн. Пры гэтым некалькі дамоў заключаныя на бязвыплатнай аснове.

◢ **У Мастах учора раніцай вучаніца 9-га класа «падклала бомбу» ў сваю гімназію. Званок аб гэтым паступіў у настаўніцкую ў 7.50. Адразу ж на месца выехалі групы МНС і РАУС, брыгада хуткай дапамогі. Будынак ачапілі, вучняў і настаўнікаў эвакуявалі. Выбуховых прыстасаванняў не выявілі, вучняў адпусцілі дадому. На працягу гадзіны была ўстаноўлена асоба таго, хто тэлефанаваў. Ёй была дзевяцікласніца. Высвятляюцца матывы ўчынку.**

◢ Пракуратурай Маскоўскага раёна Мінска распачата справа аб крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў дачыненні да былых генеральнага дырэктара і галоўнага бухгалтара ТАА «СП «Беліта». Яны падазраюцца ў тым, што ў 2008 годзе незаконна пералічылі 250 млн рублёў на разліковы рахунак іншай юрыдычнай асобы. Расследаванне будзе весці УУС Маскоўскага раёна Мінска.

◢ **Цэнтрвыбаркам РФ аднагалосна зарэгістраваў дэпутатам Дзяржаўнай думы вядомага спевака, саліста групы «Любэ» Мікалая Растаргуева. Крыху раней яму быў перададзены вакантны мандат, які з'явіўся ў фракцыі «Адзіная Расія». Падчас выбараў Растаргуеў быў унесены ў спіс «Адзінай Расіі» па Стаўрапольскім краі. Для таго, каб стаць дэпутатам, Растаргуеў быў вымушаны спыніць прадпрымальніцкую дзейнасць, аб чым падаў адпаведную заяву ў падатковыя органы.**

Поўны абзац

◢ Жыхарцы Швейцарыі падсунулі ў салату французскую жабку. Жабка была памерам 3 см і сядзела ў пакунку гатовай салаты, якую жанчына набыла ў адным з буйных гандлёвых цэнтраў швейцарскага горада Санкт-Гален. Абураная пакупніца пайшла са сваёй жабай не ў арганізацыю па абароне правоў спажыўцоў і не да адвакатаў, а пазваніла ў паліцыю. Паліцэйскія забралі жабку і перадалі яе эксперту з Заалагічнага музея. Там спецыяліст па земнаводных вызначыў, што жабка паходзіць з Францыі, таму сама ніяк не магла заскочыць у салату на месцы. Цяпер «замежніца» праходзіць карантын, а затым яе паселяць разам са швейцарскімі жабамі ў тэрарыуме адной з гарадскіх школ.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АРХІВІСТЫ ПАЧАЛІ ПУБЛІКАВАЦЬ МЕМУАРЫ ЯЎСЕЯ КАНЧЭРА

УСПАМІНЫ Яўсея Канчэра «З гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі ў 1917—1920 гг.» пачаў друкаваць часопіс «Беларуская думка», а на прэс-прэзентацыі гэтай падзеі архівісты заявілі, што гэтыя ўспаміны і дакументы прывядуць да знікнення «белых плям» у гісторыі стварэння беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX стагоддзя.

Яўсей Канчэр быў старшынёй Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў, ініцыятарам склікання ў снежні 1917 года Усебеларускага сходу, адным з кіраўнікоў Беларускага нацыянальнага камісарыяту. І ў сваіх мемуарах, якія ён напісаў у 1937 годзе, ён падрабязна апісвае тагачасныя працэсы, выкарыстоўвае асабістыя ўспаміны, нататкі, гістарычныя крыніцы, запісы яго гутарак з Леніным, Сталіным, Свярдловым, Луначарскім і г.д. Але Яўсей Канчэр у 1938 годзе быў рэпрэсаваны і яго мемуары не былі надрукаваныя.

Галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка» Вадзім ГІГІН лічыць, што раней неапублікаваныя ўспаміны Яўсея Канчэра з'яўляюцца сур'ёзным каменьчыкам у агульную мазаіку развіцця беларускай дзяржаўнасці:

— У гэтых дакументах ідзе гаворка пра тое, што адразу пасля рэвалюцыі кіраўніцтва савецкай Расіі ў асобе Леніна і Сталіна актыўна цікавілася самавызначэннем народаў, якія ўваходзілі ў склад былой Расійскай Імперыі, і гатовыя былі пайсці на стварэнне нацыянальных рэспублік. Было атрымана «дабро» і выдзелена фінансаванне для стварэння БССР, і з гэтай мэтай у Мінску быў санкцыянаваны Усебеларускі сход, дзе планавалася правесці падрыхтоўчыя мерапрыемствы па абвяшчэнні БССР, — адзначае Вадзім Гігін. — Такім чынам ідэя дэмакратычнай народнай рэспублікі і ідэя савецкай дзяржаўнасці развіваліся паралельна ў 1917—1918 гадах. Акрамя таго Канчэр у сваіх мемуарах дастаткова падрабязна кажа і пра абставіны разгону Усебеларускага сходу: галоўная прычына тут — не тое, што бальшавікі выступалі супраць нацыянальнага самавызначэння Беларусі, а перш за ўсё барацьба за ўладу.

Першая старонка рукапісу Я. Канчэра «З гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі ў 1917— 1920 гг.».

Аднак архівісты не цалкам давяраюць успамінам Яўсея Канчэра — прынамсі, **Віталь СКАЛАБАН, загадчык аддзела публікацый дакументаў Нацыянальнага архіва,** бачыць там некаторыя супярэчнасці і недакладнасці:

— Некаторыя сустрэчы, пра якія піша Канчэр, у мяне выклікаюць пытанні. Напрыклад, мы адмовіліся ад фрагмента, дзе ён апісвае свае сустрэчы з Леніным на Першым усерасійскім сходзе сялян. Бо іншымі крыніцамі гэта не пацвярджаецца. Ёсць у мяне пытанні наконт сустрэчы Канчэра і Мяснікова ў Мінску, — сказаў Віталь Уладзіміравіч. — Трэба супаставіць яго тэкст з іншымі крыніцамі, трэба мець усю сукупнасць дакументаў, але, без сумнення, тэксты Яўсея Канчэра займаюць сваё адметнае месца.

«Звязда» пацікавілася: а ці плануюцца змены ў школьных і ўніверсітэцкіх падручніках па гісторыі, калі мемуары Яўсея Канчэра сапраўды раскрываюць невядомыя моманты гісторыі:

— Мы, архівісты, выказалі свой пункт гледжання, — адказаў **дырэктар Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.** — Але падручнікі працягваюць пісаць як і раней, нягледзячы на новыя дакументы і меркаванні. На сёння мы даём дакументы, а ўжо ад гісторыкаў залежыць, як гэта будзе адлюстравана ў падручніках.

Пазнаёміцца з фрагментамі ўспамінаў Яўсея Канчэра пакуль можна толькі ў студзеньскім нумары «Беларускай думкі», але Віталь Скалабан лічыць, што аптымальны варыянт — навуковае выданне ўсяго рукапісу, што, на яго думку, не замінае і публікацыі фрагментаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

НАЦЫЯНАЛЬНАМУ АРХІВУ НЕ ХАПАЕ МЕСЦА Ў «АЛМАЗЕ»

Дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі, што праз некалькі гадоў не будзе куды прымаць дакументы:

— Сёння ў нас яшчэ ёсць магчымасць прымаць дакументы, але ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі дзве арганізацыі, якія камплектуюцца, — мы і бібліятэка. У бібліятэкі ёсць рэзервовы 16-ы паверх, можа, ёсць месца на іншых паверхах, але гадоў праз 10 праблема з месцам будзе. У нас, можа, і раней — гадоў праз 5 не будзе куды прымаць дакументы. Прычына ў тым, што бібліятэка, як толькі запоўніць свае рэзервовыя плошчы, узніме пытанне пра высяленне архіва, гэта непазбежна.

Вячаслаў Селяменеў узгадаў, што за сваю архіўную дзейнасць ён ужо 4 разы пераязджаў. Ён паведаміў таксама, што цяпер Нацыянальны архіў накіраваны на прыняцце дакументаў да 1991 года:

— Ідзе інтэнсіўная камплектацыя дакументаў, бо да пераезду ў будынак Нацыянальнай бібліятэкі не было такой магчымасці. Летась мы прынялі каля 20 тысяч спраў і плануем прымаць недзе 5—10 тысяч спраў штогод.

Цяпер фонд Нацыянальнага архіва налічвае 1 006 209 адзінак захавання, сярод якіх, як расказаў дырэктар архіва, амаль усе дакументы рассакрэчаныя.

— З мільёна спраў засталося толькі 500 спраў сакрэтных. Да іх абмежаваны допуск, бо там ёсць розны кампрамат, тайны асабістага жыцця і г.д., — сказаў Вячаслаў Селяменеў. — Мы кіруемся архіўным законам, па якім устаноўлены 30-гадовы тэрмін з моманту стварэння сакрэтнага дакумента, і калі 30 гадоў праходзіць, мы маем права рассакрэціць. Цяпер засталіся дакументы 80-х гадоў, вельмі спецыфічная дакументацыя, якая для гісторыкаў зусім нецікавая.

Дырэктар Нацыянальнага архіва лічыць, што ў Беларусі сістэма рассакрэчвання нашмат прасцейшая, чым у той жа Расіі, бо там прапановы па рассакрэчванні разглядаюцца на міжведамаснай камісіі, а ў нас у краіне права на рассакрэчванне дадзена дырэктару архіва. Па словах Вячаслава Селяменева, фактычна рассакрэчванне ў Беларусі пачалося ў 80-я гады, у пачатку 90-х былі рассакрэчаныя дакументы пра акупацыйны перыяд у Вялікай Айчыннай вайне, а недзе да 2000 года быў рассакрэчаны цэнтральны партыйны архіў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

МІРОНАЎ МОЖА ПАЗБАВІЦЦА ПАСАДЫ СПІКЕРА САВЕТА ФЕДЭРАЦЫІ ЗА КРЫТЫКУ ПУЦІНА

Спікер Савета Федэрацыі, верхняй палаты расійскага парламента, Сяргей Міронаў можа пазбавіцца сваёй пасады за крытыку прэм'ер-міністра Расіі і лідара партыі «Адзіная Расія» Уладзіміра Пуціна, перадае БЕЛТА.

Бурнае нездавальненне кіруючай партыі выклікаў шэраг выказванняў Сяргея Міронава, якія ён зрабіў напярэдадні ў тэлеэфіры расійскага Першага канала. У прыватнасці, ён заявіў, што ўзначаленая ім партыя «Справядлівая Расія» падтрымлівае многія ўнутрыпалітычныя рашэнні Уладзіміра Пуціна, але справаросы катэгарычна не згодныя з бюджэтам, унесеным прэм'ер-міністрам, а таксама з прапанаванымі ім антыкрызіснымі мерамі. «Таму гаварыць аб тым, што мы, і асабіста я, ва ўсім падтрымліваем Уладзіміра Пуціна, гэта ўжо ўстарэлая інфармацыя», — адзначыў спікер Савета Федэрацыі.

Сяргей Міронаў прадстаўляе ў верхняй палаце Заканадаўчы сход Санкт-Пецярбурга, дзе «Адзіная Расія» валодае большасцю галасоў. «Лічу лагічным і мэтазгодным, пракансультаваўшыся з нашымі калегамі з Заканадаўчага сходу паўночнай сталіцы, пачаць працэдуру адкліканя Сяргея Міронава», — заявіў кіраўнік Цэнтральнага выканкама «Адзінай Расіі» Андрэй Вараб'ёў.

Афіцыйна

ДЗЯРЖАЎНЫ РЭЕСТР НА 1 ЛЮТАГА ЎКЛЮЧАЕ 1048 ДРУКАВАНЫХ СМІ

Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі Беларусі па стане на 1 лютага 2010 года ўключае 1048 друкаваных СМІ. Аб гэтым карэспандэнту паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі.

У дзяржрэестр уключаны 536 газет і 475 часопісаў, 30 бюлетэняў, 6 каталогаў, 1 альманах, а таксама 6 інфармацыйных агенцтваў. З ліку газет і часопісаў адпаведна 371 і 351 з'яўляюцца недзяржаўнымі. Усяго 749 недзяржаўных друкаваных СМІ і 5 інфармагенцтваў уключана ў Дзяржрэестр.

У тым ліку прайшлі перарэгістрацыю ў сувязі з прыняццем закона «Аб сродках масавай інфармацыі» ўсяго 889 друкаваных СМІ (з іх 622 — недзяржаўныя). Гэта 68,1 працэнта ад колькасці зарэгістраваных па стане на 8 лютага 2009 года, г.зн. на момант уступлення ў сілу новага закона аб СМІ. Перарэгістраваны 5 інфармагенцтваў. У тым ліку праведзена дзяржаўная рэгістрацыя 158 новых друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, з якіх 127 недзяржаўныя.

Перарэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі ў рэспубліцы праходзіць у адпаведнасці з новым законам аб СМІ, які ўступіў у дзеянне 8 лютага 2009 года. На момант уступлення ў сілу закона ў Беларусі было зарэгістравана 1305 сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку 413 дзяржаўных і 982 недзяржаўныя. Перарэгістрацыя СМІ, зарэгістраваных да 8 лютага 2009 года, заканчваецца 8 лютага 2010 года. У адпаведнасці з падпунктам 2.1 пункта 2 артыкула 16 закона «Аб сродках масавай інфармацыі» рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі — Міністэрства інфармацыі Беларусі — анулюе пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, якія не пройдуць перарэгістрацыю.

БЕЛТА.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона)
9 марта 2010 года по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукционы по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи объектов, равной одной базовой величине, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

Сведения о предметах аукционов	
Аукцион в 11.00	Не завершенное строительством капитальное строение – здание физкультурно-оздоровительного комплекса и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания. Здание трехэтажное, 5113,41 кв.м, стены кирпичные, готовность строения 25 % (строительство велось в период с 1989 по 1991 г.). Объект расположен по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167, на земельном участке площадью 0,5109 га с кадастровым номером 640400000002000644. Срок аренды земельного участка – 25 лет. **Условия аукциона:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 3-х лет; создание покупателем не менее 3-х дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.
Начальная цена предмета аукциона – 22 921 627 рублей (в том числе объект — одна базовая величина, начальная цена права заключения договора аренды — 22 886 627 руб.). **Размер задатка для участия в аукционе** – 2 200 000 рублей.	
Продавец: Государственное учреждение образования «Институт переподготовки и повышения квалификации» Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь (Минская область, Борисовский район, пос. Светлая Роща, тел.: (8 0177) 74 84 51, 76 08 21). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).	
Аукцион в 12.00	Капитальное строение (инв. № 643/С-8425) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания. Одноэтажное с пристройкой здание производственного цеха, 130,1 кв.м, 1958 г/п, стены и перегородки кирпичные, перекрытие чердачное – деревянное. Объект расположен по адресу: Минская область, Любанский район, г.п. Уречье-2, швейный цех, на земельном участке площадью 0,0303 га с кадастровым номером 623483600001000001. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия аукциона:** ввод объекта в эксплуатацию в течение 2-х лет с момента государственной регистрации договора купли-продажи; обязательное создание покупателем не менее 3-х рабочих мест в течение 2-х лет с момента государственной регистрации договора купли-продажи; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте в течение не менее 5-ти лет с даты государственной регистрации договора купли-продажи; запрещение покупателю продажи либо иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.
Начальная цена предмета аукциона – 238 305 рублей (в том числе объект — одна базовая величина, начальная цена права заключения договора аренды 203 305 руб.). **Размер задатка для участия в аукционе** – 23 800 рублей.	
Продавец: Республиканское унитарное предприятие художественных изделий «Слуцкие пояса» (Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, 16, тел.: (801795) 45 280, 45 492). **Арендодатель земельного участка:** Любанский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 24а)	
Задаток для участия в аукционе перечисляется в срок **по 5 марта 2010 года до 13.00** на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».	

В случае изменения размера базовой величины на дату проведения аукциона начальная цена продажи объектов корректируется с учетом изменения базовой величины.

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица), представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, заявление на участие в аукционе, внесшие в установленном порядке сумму задатка, заключившие с фондом «Минскоблгосимущество» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. К заявлению на участие в аукционе прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица так же – документ, подтверждающий его полномочия.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: подписать протокол о результатах аукциона. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, в установленном порядке заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Представить копии платежных документов организатору аукциона в течение одного рабочего дня со дня оплаты.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел.: 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявлений **5 марта 2010 г. до 13.00.**

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона) 19 февраля 2010 года

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом принадлежащих ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район (продавец) зданий, сооружений и иного имущества, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, район поселка Гатово.
В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование и характеристики продаваемого имущества
1.	Здание производственного корпуса общей площадью 8957,0 кв. м, инв. номер 600/С-118240
2.	Склад ОКСа (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ площадью 430,9 кв. м, инв. номер 600/С-104462)
3.	Контрольно-пропускной пункт № 3 (здание неустановленного назначения площадью 6,9 кв. м, инв. номер 600/С-104457)
4	Подъездные автодороги (асфальт) – 8470 кв. м
5	Металлосетчатый забор (прямоугольные рамные конструкции из проволочной сетки на металлических опорах) – 374,0 м
6.	Железобетонный забор (железобетонные панели на железобетонных опорах) – 139,0 м
7	Озеленение внешней площадки территории завода – 9193 кв. м
8.	Подъездные железнодорожные пути – 108,2 м
9.	Машина холодильная ХМ-ФУ 401
10	Бак для охлаждения воды
11.	Бак для разведения рассола ВПС-2,0-0,2 Г
12.	Градирня
13.	Шкаф силовой ЩР 11-73504
14.	Плита электрическая П-4
15.	Кипятильник КН 100 м
16.	Линия ЛГС

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 2,8839 га, кадастровый номер 623684300001000395.

Имущество, входящее в состав лота, обременено договорами аренды.

Начальная цена – 8 000 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 470 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в следующем порядке: 15 (пятнадцать) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, с учетом внесенного задатка, перечисляются победителем торгов продавцу в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

4 лютага 2010 г. № 5 (199)

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ЦІШЭЙ. ЯШЧЭ ЦІШЭЙ!..

Як утаймаваць шумнага суседа?

Суседзяў, як і радзіму, не выбіраюць. Жыць, ці суіснаваць, у межах адной лесвічнай пляцоўкі (пад'езда, дома) даводзіцца з тым, што маеш. Цудоўна, калі гэта мілыя, інтэлігентныя людзі, якія ветліва вітаюцца пры сустрэчы, не ўчыняюць па вечарах сямейных разборак, не «свінячаць» каля смеццеправодаў, не кураць не лесвічнай пляцоўцы пад тваімі дзвярыма, не ўключаюць па начах тэлевізар на поўную гучнасць, не водзяць дадому шумныя кампаніі, не свідруюць па выхадных сцены, не злоўжываюць спіртным і не брыдкасловяць... І калі ў вашым пад'ездзе жывуць такія людзі (няхай яны валодаюць хоць бы паловай з вышэйпералічаных вартасцяў), лічыце гэта падарункам ад Бога. Таму што ў адваротным выпадку ваша жыццё можа ператварыцца ў суцэльны кашмар, імя якому — дрэнныя суседзі.

— Чалавек, які жыве ў шматкватэрным доме, па сутнасці, не мае права выбару. Пашанцавала з суседзямі — ты ў выйгрышы, не пашанцавала — ты прайграў, — уздыхае Ганна Фёдараўна Данілава, адзінокая пенсіянерка, якая пражывае ў Мінску, у пяціпавярховай «хрушчоўцы» па вуліцы Веры Харужай (**прозвішча жанчыны па яе просьбе зменена, але ўсе «каардынаты» ў рэдакцыі ёсць — Н.К.**). Ёй якраз «пашчасціла» трапіць у катэгорыю тых, каму не пашанцавала.

Праблема ўзнікла паўгода таму, калі сусед з 4-га паверха (яго кватэра знаходзіцца якраз над кватэрай заяўніцы) вырашыў здаць сваю жылплошчу кватарантам. З таго часу і пачалася ў Ганны Фёдараўны вясёлая «паласа» — у прамым сэнсе гэтага слова. Маладыя людзі прыходзілі з заняткаў, пэўны час адпачывалі, і якраз пасля адзінаццаці вечара ў іх пачыналася актыўнае жыццё, з музыкай і танцамі аж да раніцы. Было відавочна, што знаходзяцца ў кватэры зусім не два чалавекі, а значна больш...

Ганна Фёдараўна, чалавек адукаваны і інтэлігентны (усё ж былая супрацоўніца Акадэміі навук), нейкі час цярпела, спадзеючыся, што рана ці позна ў моладзі прачнецца сумленне. Не дачакаўшыся, паднялася аднойчы ўвечары на чацвёрты паверх і пазваніла ў дзверы. Не адразу, але ўсё ж ёй адчынілі. Маладыя людзі аказаліся студэнтамі БНТУ, цалкам адэкватнымі — ва ўсякім разе заўвагу Ганны Фёдараўны, выказаную ў ветлівай форме, яны выслухалі спакойна і, як ёй падалося, з разуменнем. Але прайшоў дзень, другі — і ўсё пачалося спачатку.

— Мае далейшыя спробы дастукацца да сумлення гэтых хлопцаў ні да чаго не прывялі, — расказвае жанчына. — Патэлефанавала нашаму ўчастковаму ў РУУС Цэнтральнага раёна — як на тое, ён перайшоў на іншае месца працы, а новага чалавека яшчэ не прызначылі. Звярнулася ў ЖЭС № 38, у падпарадкаванні якога знаходзіцца наш дом. Са мной вельмі ветліва пагаварылі, сказалі, што пастараюцца дапамагчы. Але пакуль што ніякіх станоўчых зрухаў я не бачу. Як быў над галавой бардак, так і застаўся.

Я спытала ў Ганны Фёдараўны, чаму яна не выклікала нарад міліцыі. У рэшце рэшт, з хамамі трэба размаўляць на іншай мове.

— Ведаеце, — патлумачыла яна, — мне ўсё ж хочацца спадзявацца на мірнае вырашэнне праблемы. Міліцыя прыехала і паехала, а мне тут жыць. Я чалавек адзінокі, часта хварэю... Мне цяжка вытрымаць цяганіну па судах у якасці сведкі...

Спрабавала Ганна Фёдараўна прасіць дапамогі ў іншых суседзяў — усё ж з некаторымі па сорак гадоў побач пражылі, лічы, сваякі. Да таго ж, у пад'ездзе пражывае шмат мужчын, якія пры жаданні маглі б прыструніць аматараў начных дыскатэк. Ды куды там!..

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АПТЫМІЗАЦЫЯ ТЭРЫТОРЫЙ

ЯК ШЛЯХ ДА РАЦЫЯНАЛЬНАЙ УЛАДЫ

Першага студзеня работнікі Ружанскага і Варанілавіцкага сельскіх Саветаў прыйшлі на працу ў Ружанскі пасялковы Савет

Ружанскі раён існаваў у БССР з 1940 да 1962 года. Утвораны 15 студзеня 1940 года ў Брэсцкай вобласці з цэнтрам Ружаны. У снежні гэтага ж года быў падзелены на 13 сельсаветаў: Бярэзніцкі, Варанілавіцкі, Дабрасельскі, Зеляневіцкі, Кавалёўскі, Калазубскі, Лыскаўскі, Магілёўскі, Малочкаўскі, Манцякоўскі, Поланскі, Славаціцкі і Шчытненскі. 8 студзеня 1954 года раён перададзены ў склад Гродзенскай вобласці, а 19 чэрвеня 1954 года зноў вернуты ў Брэсцкую вобласць. У гэтым жа годзе скасаваны Бярэзніцкі, Кавалёўскі, Малочкаўскі, Манцякоўскі, Поланскі і Шчытненскі сельсаветы, утвораны Ружанскі і Кулянскі, а Зеляневіцкі перайменаваны ў Зіновіцкі сельсавет. У снежні 1962 года Ружанскі раён быў скасаваны, большая частка яго тэрыторыі перададзена ў Пружанскі раён, а Дабрасельскі і Славаціцкі сельсаветы перайшлі да Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

Карта цяперашняга Ружанскага пассавета.

Тэрыторыя сучаснай Ружаншчыны шмат разоў падвяргалася адмістрацыйным перабудовам. Вось і цяпер «аптымізацыю структуры», як тут называюць апошнія пераўтварэнні, не разглядаюць у якасці нейкай ісціны ў апошняй інстанцыі. Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч сказаў так:

— Адна з прычын праведзенага ўзбуйнення сельсавета звязана з аб'яднаннем чатырох сельгаспрадпрыемстваў у адно — «Ружаны-агра». Другая прадыктавана працэсам устойлівага памяншэння колькасці насельніцтва ў вёсках. І трымаць ранейшую колькасць сельсаветаў становіцца немэтазгодна. Хто ведае, можа з часам нешта зменіцца, можа нашы паслядоўнікі будуць драбніць сельсаветы. А пакуль што вось гэта структура выглядае найбольш аптымальнай.

Працэс аб'яднання зацягнуўся амаль на год. Пачыналі з сельскіх сходаў. Сходы прайшлі практычна ў кожнай вёсцы. Не праводзілі хіба ў тых, дзе засталося па два-тры жыхары, і тыя «сезонныя». Збіраліся звычайна ў сельскім клубе, або ў хаце старасты, размаўлялі з людзьмі, тлумачылі. Паводле пераканання старшыні райсавета, калі людзям як след растлумачыць, то яны і зразумеюць. Карацей кажучы, ніякіх асаблівых прэтэнзій мясцовыя жыхары не прад'явілі, а праблемы ўздымалі звычайныя — жыццёвыя: дзе не вельмі добра абслугоўвае аўтакрама, а дзе хацелі б, каб часцей прыязджаў доктар. Супраць скасавання сельсаветаў ніхто не пратэставаў, тым болей, што ў Варанілавічах для выдачы даведак, вырашэння іншых неадкладных спраў пакінулі на тры дні ў тыдзень аднаго спецыяліста. Затым прайшлі сесіі мясцовых Саветаў па пытанні ўз'яднання, рашэнне зацвердзілі форумы раённага і абласнога Саветаў. І вось з першага студзеня работнікі Ружанскага і Варанілавіцкага сельскіх Саветаў прыйшлі на працу ў выканкам Ружанскага пасяловага Савета.

Варта адзначыць, што ніхто з былых супрацоўнікаў без працы не застаўся. На заслужаны адпачынак пайшлі толькі два чалавекі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Былы старшыня Варанілавіцкага сельскага Савета стаў вядучым спецыялістам па добраўпарадкаванні, а былая старшыня Ружанскага сельскага Савета — вядучым спецыялістам па рабоце з насельніцтвам. Уладкаваныя і спецыялісты названых сельскіх Саветаў.

Са старшынёй Ружанскага пасялковага Савета Леанідам Маскалевічам разглядаем карту тэрыторыі новаўтворанай адміністрацыйнай адзінкі. Цяпер у яе склад ўвайшлі 32 вёскі. Вёскі вельмі розныя. У Варанілавічах, напрыклад, жыве 293 чалавекі, а ў Перасадзічах засталося тры жыхары. Паводле слоў Леаніда Міхайлавіча, ёсць нават вёска, дзе фактычна ніхто не жыве. У Нікіцічах некалькі чалавек зарэгістравана, але іх ужо даўно забралі гарадскія дзеці. У цэлым жа колькасць насельніцтва новага пассавета складае 6482 чалавекі. 3300 з іх жыхары саміх Ружанаў. Цікава, што колькасць жыхароў пасёлка ў апошнія гады крыху расце, але выключна за кошт міграцыі. Тут шмат прадпрыемстваў, будуецца жыллё, людзі пераязджаюць. Але суадносіны колькасці народжаных да колькасці памерлых, на жаль, не на карысць першых. З кожным годам колькасць жыхароў паменшаецца ў сельскіх населеных пунктах. Адна толькі лічба шмат пра што гаворыць: на 32 вёскі і трохтысячны пасёлак прыходзіцца ўсяго 249 кароў прыватнага сектара. І гэта ўсё давядзецца ўлічваць у сваёй дзейнасці мясцовай уладзе.

Тэрыторыя новага пассавета супараўнальная з памерамі невялікага раёна: з аднаго канца ў другі — больш за 30 кіламетраў. У штаце новага выканкама цяпер — дзевяць чалавек. У іх распараджэнні... адна машына. Апошняе мяне вельмі здзівіла. У кожнага з сельсаветаў, што ўвайшлі ў склад Ружанскага пасялковага, быў свой легкавы аўтамабіль. І лагічным выглядала б аб'яднаць аўтапарк для больш аператыўнага вырашэння надзённых задач. Але нехта недзе ў нейкім рашэнні заклаў такую норму, што сельскі Савет можа мець толькі адзін аўтамабіль. І не важна, шэсць тысяч насельніцтва абслугоўвае мясцовая ўлада ці адну, трыццаць вёсак на яе карце ці тры. Як ні стараліся раённыя ўлады дапамагчы вырашыць гэту праблему на карысць пассавета, нічога не выходзіць.

Сакратар Ніна ДЗЕРБЯНЁВА, спецыялісты Вольга ЁРШ і Таццяна КУЛЬБА, старшыня пасялковага Савета Леанід МАСКАЛЕВІЧ.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЕЗ КАРДЫНАЛЬНЫХ НАВАЦЫЙ,

АЛЕ З ДАДАТКОВЫМІ ГАРАНТЫЯМІ

Новы Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» увойдзе ў сілу 20 ліпеня 2010 года. Гэта базавы нарматыўны дакумент для органаў мясцовага самакіравання. Ён вызначае кампетэнцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, арганізацыйныя і эканамічныя асновы іх дзейнасці, адказнасць за рашэнні, якія прымаюцца. Актыўны ўдзел у яго распрацоўцы прымаў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Гэта работа ажыццяўлялася палатай рэгіянальнага прадстаўніцтва ў цеснай сувязі з мясцовымі органамі ўлады, на падставе вывучэння вопыту іх работы Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, а таксама з улікам міжнароднага вопыту мясцовага самакіравання.

Закон не ўтрымлівае кардынальных навацый, якія істотна мянялі б статус і функцыі мясцовых органаў улады. У цэлым ён базіруецца на палажэннях Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» ад 20 лютага 1991 года. Аднак у ім замацаваны важныя дадатковыя гарантыі мясцовага самакіравання, канкрэтызаваны паўнамоцтвы мясцовых Саветаў. Нормы, якія датычацца арганізацыі іх працы, абноўлены з улікам практыкі правапрымянення.

У прыватнасці, у законе адлюстравана **асаблівая роля органаў мясцовага самакіравання** як органаў народаўладдзя на адпаведнай тэрыторыі. Так, зменены парадак размяшчэння нормаў па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання. Артыкулы закона, якія рэгулююць пытанні мясцовага самакіравання, змешчаны перад артыкуламі аб мясцовым кіраванні. Пры гэтым суб'ектам мясцовага самакіравання вызначана насельніцтва, якое пражывае на адпаведнай тэрыторыі. Нагадаем, што раней мясцовае самакіраванне вызначалася як форма арганізацыі і дзейнасці грамадзян.

Адначасова ўдакладнены **статус мясцовых Саветаў як прадстаўнічых дзяржаўных органаў** на тэрыторыі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Так, новы закон прадугледжвае, што Савет у сваёй дзейнасці па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння зыходзіць з агульнадзяржаўных інтарэсаў і інтарэсаў насельніцтва тэрыторыі. Замацаваныя кірункі дзейнасці мясцовых Саветаў, якіх цяпер у Беларусі функцыянуе каля 1500. Сярод іх — удзел у абмеркаванні пытанняў рэспубліканскага значэння, якія закранаюць інтарэсы адпаведнай тэрыторыі, унясенне па іх сваіх прапаноў у дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, выкананне рашэнняў вышэйстаячых дзяржаўных органаў.

З мэтай гарантавання мясцовым Саветам магчымасці добраахвотна супрацоўнічаць і аб'ядноўвацца для сумеснага вырашэння агульных задач у законе ўпершыню замацавана іх **права на аб'яднанне ў асацыяцыі**. Асацыяцыі могуць стварацца Саветамі ўсіх узроўняў у мэтах эфектыўнага ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў, абароны агульных інтарэсаў і аказання ўзаемадапамогі ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, іншага садзейнічання ажыццяўленню функцый мясцовага самакіравання. Рэгістрацыя асацыяцый будзе праходзіць у абласных (Мінскім гарадскім) выканаўчых камітэтах. Фарміраванне маёмасці асацыяцый прадугледжваецца за кошт узносаў іх членаў і іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам.

Сярод гарантый мясцовага самакіравання замацавана **права мясцовых Саветаў на судовую абарону**. Прадугледжваецца, што Саветы маюць права ў вызначаным парадку звяртацца ў суд для абароны правоў, якія парушаны ці аспрэчваюцца, або інтарэсаў, якія ахоўваюцца законам, у мэтах забеспячэння свабоднага ажыццяўлення імі сваіх паўнамоцтваў.

Работа з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі — адзін з галоўных кірункаў дзейнасці мясцовых органаў улады. У сувязі з гэтым у законе вызначана роля мясцовых Саветаў у яе ажыццяўленні. Так, прадугледжана, што Саветы праводзяць мерапрыемствы па ўдасканальванні арганізацыі работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі, у тым ліку па ўкараненні ў дзейнасць дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый заяўнага прынцыпу «аднаго акна», а таксама ўдзельнічаюць у ажыццяўленні кантролю за правядзеннем такіх мерапрыемстваў. Згодна з законам, Саветы таксама ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры і праводзяць на сістэматычнай аснове мерапрыемствы па іх спрашчэнні.

У законе знайшлі адлюстраванне і іншыя нормы аб **адміністрацыйных працэдурах**, падведамных Савету. Так, да асаблівасцяў кампетэнцыі Саветаў абласнога ўзроўню аднесена рэгуляванне парадку ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур на адпаведнай тэрыторыі.

У мэтах пашырэння магчымасцяў грамадзян у рэалізацыі сваіх ініцыятыў пры вырашэнні пытанняў мясцовага значэння законам прадугледжана такая новая форма мясцовага самакіравання, **як удзел грамадзян у фінансаванні і (або) пакрыцці выдаткаў бюджэту на вызначаныя імі мэты**. Па рашэнні мясцовага сходу або ОТГС (органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання) на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання можа праводзіцца збор сродкаў на мэты, вызначаныя мясцовым сходам або ОТГС. Сродкі самаабкладання будуць уключацца ў адпаведны мясцовы бюджэт і выдаткоўвацца выключна на мэты, вызначаныя мясцовым сходам або ОТГС. У законе падрабязна ўрэгуляваныя і іншыя пытанні, якія датычацца сродкаў самаабкладання.

Цяпер не вызначаны адзіны парадак рэалізацыі пераважнага права мясцовых Саветаў дэпутатаў або па іх даручэнні выканаўчых камітэтаў і мясцовых адміністрацый **на набыццё аб'ектаў нерухомасці, якія знаходзяцца на адпаведнай тэрыторыі** і могуць быць выкарыстаны для мясцовых патрэбаў. Не было адзінага падыходу да вырашэння гэтых пытанняў і ў практычнай рабоце мясцовых органаў улады. На ліквідацыю гэтага прабелу накіраваны нормы новага закона. Яны ўстанаўліваюць, што парадак ажыццяўлення пераважнага права, а таксама пералік катэгорый аб'ектаў нерухомасці, на якія яно распаўсюджваецца, будуць вызначаны заканадаўчымі актамі, праекты якіх Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь даручана ўнесці на разгляд кіраўніка дзяржавы.

Эфектыўнасць дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў значнай ступені залежыць ад аб'ёму паўнамоцтваў, якімі яны надзеленыя. Вялікая ўвага ў новым законе нададзена размежаванню і канкрэтызацыі **кампетэнцыі мясцовых Саветаў**. Замацавана агульная кампетэнцыя мясцовых Саветаў, якая ажыццяўляецца на ўсіх тэрытарыяльных узроўнях, а таксама дакладна прапісаная кампетэнцыя Саветаў кожнага ўзроўню — абласнога, базавага і пярвічнага. Напрыклад, удакладнены і размежаваны паўнамоцтвы Саветаў у дачыненні да ОТГС. Да агульнай кампетэнцыі Саветаў аднесеная каардынацыя дзейнасці ОТГС і вырашэнне пытанняў дэлегавання ім асобных паўнамоцтваў Саветаў. Саветы абласнога ўзроўню правамоцныя сцвярджаць прыкладнае палажэнне аб ОТГС.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗАКЛАД ДЭМАКРАТЫЧНАСЦІ

Павышаная ўвага да праблем мясцовага самакіравання — знак падтрымкі дзяржавай ініцыятывы знізу

Мы на подступах да мясцовых выбараў — яны прызначаныя на 25 красавіка, а кампанія распачынаецца ўжо цяпер. «Новаабранцам» давядзецца мець справу не толькі са змененым выбарчым заканадаўствам, але ж і абноўленымі нормамі ў сферы іх непасрэднай кампетэнцыі. Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» нядаўна зведаў апошнюю працэдуру для набыцця юрыдычнай моцы — быў апублікаваны для шырокай грамадскасці ў нашым выданні. А значыць, праз паўгода па ім пачнуць працаваць на месцах. Пра заканадаўчыя пераўтварэнні і ўражанні ад таго, што атрымалася на выхадзе, гутарым з Генадзем ГРЫЦКЕВІЧАМ, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:

— Калегі праявілі павышаны інтарэс да праекта гэтага закона: яны самі прайшлі выдатную школу мясцовага самакіравання, ды і праблематыка яго сёння вельмі актуальная. Варта адзначыць, што ў працэсе работы над законапраектам з месцаў паступіў шэраг цікавых прапаноў. Аднак не ўсе яны ўвайшлі ў канчатковы дакумент, паколькі для іх рэалізацыі неабходныя час і ўмовы, у тым ліку адпаведнае фінансаванне. Новым законам мы пацвярджаем, што ў нашай краіне заахвочваецца ініцыятыва знізу. Такая ўвага да праблем мясцовага самакіравання — заклад таго, што мы будуем дэмакратычную дзяржаву. І з боку насельніцтва сёння ёсць разуменне гэтага. Па сутнасці самаарганізацыя грамадзян і ёсць увасабленне народаўладдзя. Развівацца нам варта паступова, гарманічна. А патрэбам дня сённяшняга закон адпавядае, адкрываючы пры гэтым вялікія перспектывы, асабліва ў плане працы мясцовай улады з насельніцтвам. Ён адлюстроўвае ўсе аспекты кіравання на лакальным узроўні, сістэматызуе і комплексна рэгулюе грамадскія адносіны ў галіне мясцовага самакіравання, ліквідуе мноства нарматыўных прававых актаў у гэтай сферы, нават элементарна абнаўляе тэрміналогію — час, пагадзіцеся, не стаіць на месцы. Закон дакладна размяжоўвае кампетэнцыю прадстаўнічай і выканаўчай улады. У нас ужо здаўна павялося, што Саветы выконваюць задачы стратэгічнага характару, а функцыі выканання гэтых задач, уключаючы і распрацоўку тактыкі, — на выканкамах. Проста новы закон прапісвае гэтыя моманты больш дбайна і дэталёва. Усё гэта дазволіць працаваць на месцах больш эфектыўна.

— Наколькі мы сінхранізуемся з міжнароднай суполкай у падобных заканадаўчых зрухах?

— Гэта сур'ёзны крок у бок еўрапейскіх стандартаў. Органы мясцовага самакіравання цяпер маюць права весці міжнароднае супрацоўніцтва і прэтэндаваць на судовую абарону парушаных правоў ці інтарэсаў, якія ахоўваюцца законам, у мэтах забеспячэння свабоднага здзяйснення імі сваіх паўнамоцтваў. Мы далі магчымасць мясцовым Саветам аб'ядноўвацца ў асацыяцыі — каб разам вылучаць і рухаць наперад ініцыятывы мясцовага і рэгіянальнага значэння. Дагэтуль можна пералічыць па пальцах колькасць рэгіёнаў, якія сумесна працуюць. Цяпер мы даём ім магчымасць збірацца, сумесна абмяркоўваць актуальныя тэмы і выносіць нявырашаныя праблемы на разгляд на больш высокім узроўні. Гэта важны атрыбут еўрапейскай сістэмы, аднак у нас ён з'явіўся не штучна — такая прапанова прыйшла, як кажуць, ад народа. Мы замацоўваем у законе норму аб фінансавай дзейнасці асацыяцый — за кошт належных ім грашовых сродкаў і іншай маёмасці, у тым ліку атрыманых ад спонсарскай дапамогі, дзейнасці, якая прыносіць даходы, а таксама іншых, не забароненых заканадаўствам крыніц. Цяпер набывае ўзаконены статус Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, утвораны пры верхняй палаце парламента. Ён настолькі сябе рэалізаваў за гэтыя два апошнія гады, само жыццё пацвярджае эфектыўнасць яго існавання. У адрозненне ад асацыяцый, якія будуць праваднікамі ініцыятыў знізу, Савет з'яўляецца каардынуючым органам, даводзіць да органаў мясцовага самакіравання палітыку дзяржавы, выпрацоўвае адзінства падыходаў.

— А што наконт садзейнічання рэалізацыі мясцовых ініцыятыў у матэрыяльным плане?

— Закон вельмі прагматычны, яго чакаюць на месцах. Ён пашырае магчымасці папаўнення бюджэтаў мясцовых Саветаў. У яго ўключаны палажэнні Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», паводле якіх Саветы могуць адразу папаўняць даходную частку за кошт зямельнага падатку, падатку на нерухомасць з фізічных асобаў і мясцовых падаткаў. Цяпер не трэба чакаць, пакуль гэтыя сродкі кансалідуюцца ў абласным ці гарадскім бюджэце. І ў некаторых рэгіёнах такая практыка добра сябе паказала — ужо назіраецца скарачэнне датацыйнасці. Можа таксама здзяйсняцца самаабкладанне грамадзян — добраахвотны ўзнос уласных сродкаў на грамадскія патрэбы. Сабраныя такім чынам грошы плануецца ўключаць у адпаведныя мясцовыя бюджэты і выкарыстоўваць па мэтавым прызначэнні. А значыць, з'яўляецца магчымасць хутчэй выдаткоўваць на нешта, жыццёва неабходнае людзям. Ёсць станоўчыя прыклады, калі жыхары сваімі сіламі і на падставе ўласнага рашэння і ёлку ўсталёўвалі, і свята двара ці вуліцы ладзілі, забяспечвалі ўзорнае ўтрыманне пад'ездаў... У цэлым правы органаў мясцовага самакіравання ў плане фінансавага забеспячэння, паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы новым законам пашыраныя.

— Якім чынам закон заахвочвае да самаарганізацыі?

— Камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — гэтыя самаарганізацыі, што аб'ядноўваюць грамадзян на добраахвотнай аснове, — атрымліваюць пуцёўку ў жыццё. Ім у законе нададзеная вялікая ўвага, прадугледжаная прафесійная, арганізацыйная дапамога, каб падтрымаць іх на першым часе. Неабходна, каб людзі адчулі, што яны самаарганізаваліся і вырашылі праблему. Варта ўтвараць камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з людзей ініцыятыўных, якія хочуць удзельнічаць у вырашэнні праблем, кіраванні на месцах. Дэмакратычныя падыходы ў нашай краіне заўжды былі скіраваныя на тое, каб тыя, каму гэта цікава і патрэбна, маглі працаваць у адной звязцы з уладамі. На жаль, папаўненне такіх структур моладдзю ідзе вельмі слаба. Хацелася б бачыць большую актыўнасць моладзі ў працы па месцы жыхарства... Закон спрашчае парадак стварэння органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, прапісвае нюансы іх рэгістрацыі і ліквідацыі. Удакладняецца сфера іх кампетэнцыі, сярод задач гэтых структур — садзейнічанне рэалізацыі правоў, свабодаў і законных інтарэсаў грамадзян, вывучэнне іх меркаванняў па пытаннях мясцовага значэння і гэтак далей.

— Чаго чакаеце ад рэалізацыі закона, Генадзь Паўлавіч?

— Ён вельмі працаздольны, і думаю, яго дзеянне будзе паспяховым. Многае значыць удзел самога насельніцтва ў вырашэнні наяўных праблем. Вельмі хацелася б, каб як мага больш актыўна працаваў на месцах дэпутацкі корпус усіх узроўняў. Каб дэпутаты былі ініцыятыўныя, не забываліся на тое, што абралі іх жыхары рэгіёна, і каб праносілі праз сябе іх праблемы, уносілі прапановы, якія далі б магчымасць жыць і працаваць таму рэгіёну. Чарговыя мясцовыя выбары адбудуцца нават тады, калі на ўчастак прыйдзе толькі адзін чалавек. На мой погляд, грамадзяне пойдуць на выбары толькі ў тым выпадку, калі будуць бачыць, што спаборнічаюць людзі, словам якіх можна верыць. Уся сутнасць у чалавеку, яго ўнутранай адказнасці, стаўленне да іншых. Што да тых кандыдатаў, якія назаўтра пасля абрання начыста забываюцца пра тое, што абяцалі, — упэўнены, іх час прайшоў. Нашы людзі за час будаўніцтва незалежнай дзяржавы набылі дастатковы вопыт, падмануць іх сёння цяжка, выбаршчыкі ў нас падрыхтаваныя. Я цвёрда перакананы, што аўтарытэт дэпутата любога ўзроўню зарабляецца і ўмацоўваецца не статусам і абяцаннямі, а здольнасцю «прызямліцца» да рэальных патрэбаў свайго выбаршчыка, да тых клопатаў і цяжкасцяў, з якімі людзі сутыкаюцца ў паўсядзённым жыцці, і забяспечыць змяненні сітуацыі ў лепшы бок. А спрыяльная заканадаўчая база для гэтага ёсць.

Зоя ВАРАНЦОВА.

АПТЫМІЗАЦЫЯ ТЭРЫТОРЫЙ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Увогуле работнікі спадзяюцца, што паступова многае ўладзіцца, утрасецца, увойдзе ў сістэму. Ніна Мікалаеўна Дзербянёва — сакратар вельмі вопытны, на сваёй пасадзе адпрацавала больш за 24 гады. А цяпер на яе рукі звалілася сакратарская работа практычна трох сельсаветаў: запісы актаў грамадзянскага стану, натарыяльныя дзеянні і процьма іншых спраў, якія вядзе менавіта сакратар. У пакой увесь час заходзяць людзі, хоць прыём вядуць і іншыя спецыялісты. У момант майго знаходжання нават сабралася невялікая чарга, бо цэлыя паўтары гадзіны сакратар займалася справай аднаго чалавека. Памёр бомж, што шмат гадоў жыў у Ружанах, і ніякіх дакументаў пры ім не было: ні пашпарта, ні працоўнай кніжкі. Давялося апытваць сведак, афармляць кіпу дакументаў, каб адпаведныя службы выдзелілі грошы на пахаванне...

Такіх штодзённых празаічных праблемаў нямала ў мясцовай улады. Паводле слоў старшыні пасялковага Савета Леаніда Маскалевіча, галаўным болем з'яўляюцца так званыя няўдалыя сем'і — іх каля пяці дзясяткаў. Праблемай пасёлка, які знаходзіцца на скрыжаванні дарог, па-ранейшаму застаюцца напаўбезгаспадарчыя пабудовы. Дамы-развалiны і знесці нельга, бо фармальна спадчыннікі гаспадароў недзе ёсць, а вось прыводзіць у парадак ці зносіць жыллё яны не хочуць.

Сёлета Ружаны павінны стаць аграгарадком. Будзе праведзена адпаведная работа па паляпшэнні дарог, вуліц, тратуараў. Адказвае за работу па добраўпарадкаванні былы старшыня Варанілавіцкага сельскага Савета Віктар Руды. У Віктара Рыгоравіча планы на гэты конт вялікія. На яго думку, у пасёлку неабходна пракладваць тратуары. Гэта паказала сёлетняя снежная зіма. Дарогі расчышчаюць адпаведныя службы, транспарт ходзіць без праблем. Але людзям, асабліва пажылым, цяжка дабірацца па дарозе ў паліклініку ці краму, увесь час азіраючыся на машыны. Трэба, каб былі тратуары. Тым больш у Ружанах, слаўных сваёй гісторыяй, у Ружанах, якія спадзяюцца з пачаткам аднаўлення сапегаўскага замка, стаць прыцягальнымі для турыстаў. Хоць варта сказаць, што і цяпер праз Ружаны едзе нямала людзей — побач жа знакаміты санаторый «Ружанскі», маляўнічае возера Паперня. Ды і для сябе, лічыць Віктар Руды, трэба старацца жыць з пэўным камфортам. А ў маленькіх вёсках важна хоць бы падтрымліваць належным чынам вулічнае асвятленне.

Пакуль што ўсе спецыялісты новага пасялковага органа ўлады месцяцца ў старым будынку. Але хутка іх чакае навасэлле — Савет будзе пераведзены ў будынак, дзе цяпер знаходзяцца бібліятэка і музычная школа. Сюды ж пераедуць канторы ЖКГ, энергетыкаў, дарожных участкаў, іншых службаў, каб лягчэй было каардынаваць і ўзгадняць свае дзеянні.

Каментарый старшыні Пружанскага райвыканкама Аляксандра ЮРКЕВІЧА:

Падчас работы па аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага будавання мы ставілі мэту стварыць паўнацэнную ўладу на месцах. Арганізацыйна і структурна зрабіць гэта аказалася нескладана. А вось напоўніць зместам, гэта значыць, пераламаць псіхалогію кіраўнікоў мясцовай улады — вялікая праблема. Сёння райвыканкам гатовы аддаць бюджэт на адукацыю, культуру, ахову здароўя, на сацыяльныя патрэбы мясцовай уладзе: бярыце, размяркоўвайце. Але ці гатовыя яны ўзяць, вось пытанне. Нават у тых сельсаветаў, што далучылі да Ружанскага, па выніках года засталося нявыкарыстанымі 90 мільёнаў рублёў. А па ўсіх сельсаветах — пад 400 мільёнаў набярэцца. Кіраўнікі часам любяць паплакацца, што ва ўлады на месцах няма грошай. У сапраўднасці ж выходзіць, што не ўмеюць выкарыстоўваць нават таго, што ёсць. Было б зразумела, што грошай сапраўды не хапае, калі б у канцы года да мяне прыйшоў які старшыня сельсавета або некалькі іх з просьбай купіць, скажам, машыну для збору смецця. Такога няма. Як і не было прэцэдэнту, каб нехта з кіраўнікоў мясцовай улады ўзняў пытанне аб адпаведнасці пасадзе кіраўніка сельскагаспадарчага альбо іншага прадпрыемства на яго тэрыторыі, хоць закон дае такое права старшыням сельскіх Саветаў. Не гатовыя нашы сельскія Саветы ўзяць усю ўладу на месцах, а павінны гэтаму вучыцца і ў рэшце рэшт навучыцца. Улада павінна павесці справу так, каб прымусіць сябе паважаць — тады яна стане сапраўднай уладай, гатовай узяць на сябе адказнасць не толькі за распараджэнне мясцовым бюджэтам, а і за ўсё, што робіцца на тэрыторыі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

ЦІШЭЙ. ЯШЧЭ ЦІШЭЙ!..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Кожны заняты сваімі праблемамі, ніхто не хоча ўмешвацца. Жывуць па прынцыпе «мяне гэта не датычыцца — і добра». Я ўвесь час задаю сабе пытанне: ці ёсць у нас, жыхароў шматкватэрных «вулляў», элементарныя правы на сон, на адпачынак, на спакойнае жыццё? Яны, правы, быццам бы гарантуюцца — у прыватнасці, загадам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі № 177, у адпаведнасці з якім зацверджаныя правілы карыстання жылымі памяшканнямі. Але, на жаль, гэты дакумент, добра вядомы ЖЭСам горада, не вельмі актыўна даводзіцца да жыхароў мікрараёнаў. Людзі чулі, што ёсць «нейкія правілы», нехта іх, можа, і чытаў, заходзячы са сваімі пытаннямі ў той жа ЖЭС... Але ў пераважнай большасці жыльцы не ведаюць дакладна, у які час сутак у доме павінна быць поўная цішыня, якімі часовымі рамкамі абмежавана правядзенне рамонтных работ і гэтак далей. І нават не падазраюць, што існуе адміністрацыйная адказнасць за парушэнне гэтых правілаў. Інакш паводзілі б сябе больш карэктна і паважліва ў дачыненні да суседзяў, — гаворыць Ганна Фёдараўна.

Каб атрымаць пацвярджэнне яе слоў (у сэнсе ведання намі правілаў карыстання сваім жыллём), далёка хадзіць не спатрэбілася. Апытаўшы пару-тройку сваіх знаёмых («да якога часу можна карыстацца гукавымі прыборамі?» і «ў колькі неабходна заканчваць рамонтныя работы ў кватэры?»), я атрымала роўна столькі ж адказаў, якія абсалютна не супадалі адзін з адным. Так што наша чытачка мае рацыю — у гэтым плане ЖЭСы недапрацоўваюць. Некаторыя з правілаў карыстання жыллём можна было б змяшчаць хоць бы на тых жа «жыроўках». Як і адпаведныя артыкулы з Адміністрацыйнага кодэкса — аб адказнасці за парушэнне гэтых правілаў. Глядзіш, і аматараў свідраваць сцены ў дзевяць гадзін вечара паменела б...

Па дадатковыя тлумачэнні адносна праблемы, узнятай нашай чытачкай, я звярнулася ва ўзгаданы ЖЭС № 38 Цэнтральнага раёна сталіцы. Пытанне ў мяне, уласна кажучы, было адно: як паўплываць на суседзяў, якія забыліся аб межах прыстойнасці?

Аказваецца, пасля звароту Ганны Фёдараўны работнікі ЖЭСа правялі пэўную работу. Каб высветліць, хто пражывае ў кватэры № 16, на якую скардзілася жанчына, зрабілі запыт у службу «Адно акно» адміністрацыі Цэнтральнага раёна (яна рэгіструе ўсе дагаворы найму паміж уладальнікам кватэры і тым, хто яе здымае). Адтуль паведамілі, што ніякіх дагавораў найму гаспадары кватэры не рэгістравалі (дакументамі гэта не пацверджана). А значыць, **юрыдычна** кватэру яны нікому не здаюць і пражываюць у ёй самі.

— Таму на адрас гаспадароў кватэры № 16 яшчэ ў снежні мы адправілі афіцыйнае прадпісанне, — расказалі ў ЖЭСе. — Назад заказны ліст не вярнуўся, з чаго можна зрабіць выснову, што адрасат яго атрымаў.

— Але Данілава сцвярджае, што начное жыццё ў кватэры не спыняецца і што гаспадары там не жывуць...

— Разумееце, мы не маем права прымаць на веру ўсе «сігналы» жыльцоў — іх абавязкова трэба правяраць. Мы можам накіраваць запыт у міліцыю з просьбай дапамагчы з выяўленнем сапраўднага месцазнаходжання ўладальніка кватэры. Але для гэтага нам неабходна пісьмовая заява Ганны Фёдараўны. А такой заявы яна не напісала... Ну падумайце самі: на якой падставе мы будзем распачынаць пошукі ўладальніка кватэры? Як можам пацвердзіць, што на яго скардзяцца жыльцы? Вусную ж скаргу да справы не падшыеш... Безумоўна, мы будзем кантраляваць ход падзей. Але вырашэнне праблемы паскорыцца, калі Ганна Фёдараўна выкладзе скаргу ў пісьмовай форме, пакінуўшы нам свой хатні адрас і кантактны тэлефон. Сітуацыя ў яе зусім не такая безнадзейная, як здаецца. Наадварот — усе падобныя праблемы, як правіла, вырашальныя. Уладальнікаў кватэр звычайна знаходзяць, папярэджваюць, калі не падзейнічала — прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, прызначаюць ім штрафы.

Апошняе, праўда, здараецца ў рэдкіх выпадках — грамадзяне ў нас у асноўным законапаслухмяныя і ім дастаткова папярэджання. Пасля чаго, як правіла, яны скасоўваюць дагавор з кватарантамі, якія парушалі спакой суседзяў, і шукаюць іншых.

Калі папярэджанні ўсё ж не падзейнічалі і начныя шоу працягваюцца, службовыя асобы ЖЭСа разам з участковым складаюць на месцы пратакол і накіроўваюць яго ў суд. Суд ацэньвае сабраныя доказы і прызначае ўладальніку кватэры штраф — ад 10 да 30 базавых велічыняў.

Магчымы і іншы варыянт развіцця падзей. На думку работнікаў ЖЭСа, нават больш эфектыўны: дачакацца, пакуль пачнецца «дыскатэка», і выклікаць нарад міліцыі па простым нумары 102 (дарэчы, міліцыя не паведамляе суседзям, хто на іх паскардзіўся). Нават калі прадстаўнікоў аховы правапарадку не пусцяць у кватэру, яны ўсё адно зафіксуюць наяўнасць за дзвярыма недапушчальных для начнога часу гукаў. Матэрыялы праверкі дашлюць у ЖЭС, работнікі якога, зноў жа, складуць пратакол і накіруюць яго ў суд.

— Управа на парушальнікаў спакою знаходзіцца практычна заўсёды, хоць выпадкі бываюць самыя розныя, — каментуе сітуацыю галоўны спецыяліст аддзела арганізацыйна-кадравай і прававой работы дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Святлана Флюрык. — Хтосьці баіцца суда, хтосьці — штрафу. Выключэнне складаюць хіба што асобы, якія зусім ужо... дэградавалі. Але ў цэлым адпрацаваная сістэма дзейнічае даволі паспяхова — для гэтага дастаткова звярнуцца з адпаведнай заявай у ЖЭС.

Суседзяў не выбіраюць. Аднаму пашанцавала, іншаму — не вельмі. На адной лесвічнай пляцоўцы вымушаны суіснаваць чалавечнасць і эгаізм, культура і поўная яе адсутнасць, выхаванасць і хамства... На жаль, нярэдка незалежна ад узроўню адукацыі, прафесійнай прыналежнасці і службовага становішча.

Некалькі гадоў таму мае суседзі «зверху» памянялі месца жыхарства, а ў іх кватэру пераехала сям'я банкаўскага работніка — ён, жонка, сын і дачка. Не ведаю, чаму — але менавіта пасля 11 гадзін вечара, а то і пазней у шасцігадовага хлопчыка пачыналася надзвычай актыўнае жыццё: скокі па кватэры, беганіна, якія суправаджаліся гучным віскатаннем і крыкамі. Гэта працягвалася не тыдзень, не месяц і не год... З невялікімі, праўда, перапынкамі (калі сям'я ад'язджала на дачу ці на адпачынак або хлопчык хварэў). З дзясятак разоў мая рука цягнулася да тэлефона, а ў галаве пракручвалася гнеўная тырада, дзе далёка не ўсе словы былі цэнзурнымі (прызначалася тырада, зразумела, бацькам, якія дазвалялі такія вольнасці свайму неразумнаму нашчадку). Але я так і не патэлефанавала, кожны раз супакойваючы сябе тым, што гэта ўсё ж дзіця, і рана ці позна бацькі зробяць яму заўвагу... Ды і псаваць адносіны з новымі суседзямі не вельмі хацелася.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Цяпер шкадую, што тады не выказалася — у цэнзурнай форме, вядома. Што хамскія паводзіны дарослых людзей (бо дзеці — вынік іх выхавання) так і засталіся беспакаранымі. Што пазіцыя «хачу і буду» пусціла карані і прарасла дзякуючы ў пэўнай ступені і маёй уласнай бесхарактарнасці.

...Днямі ў кватэры знізу пачаўся рамонт. У першы ж дзень характэрнае «гукавое суправаджэнне» доўжылася да позняга вечара... Не вытрымаўшы, спусцілася да суседзяў і ветліва патлумачыла, што да 19.00 усе рамонтныя работы, якія ствараюць шум, павінны завяршацца. Суседзі папрасілі прабачэння і цяпер кожны дзень стараюцца ўкладвацца ў азначаны тэрмін.

Прыемна ўсё ж мець справу з выхаванымі людзьмі...

Наталля КАРПЕНКА.

«Грамадзяне абавязаныя... не здзяйсняць дзеянняў, якія прыводзяць да псавання жылых памяшканняў і дапаможных памяшканняў жылога дома, ствараюць павышаны шум ці вібрацыю, парушаюць нармальныя ўмовы пражывання грамадзян у іншых жылых памяшканнях... З 23 да 7 гадзін павінна захоўвацца цішыня».

(«Правілы карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў жылога дома ў Рэспубліцы Беларусь», п. 6.11).

* * *

«У перыяд правядзення перабудавання і перапланіроўкі памяшкання забараняецца:

выконваць у выхадныя і святочныя дні работы, якія ствараюць шум ці вібрацыю;

пачынаць работы, якія ствараюць шум ці вібрацыю, раней за 9 гадзін і заканчваць іх пазней за 19 гадзін у працоўныя дні».

(«Палажэнне аб парадку перабудавання і перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах», п. 20)

Інтарэсы мясцовыя — выгада агульная

Шэраг сумесных праектаў маюць намер ажыццявіць Гродна і Беласток у рамках нядаўна падпісанага дагавора аб партнёрскіх адносінах.

Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Барыс Казялкоў расказаў, што агульныя праекты ёсць у розных галінах, у прыватнасці, у медыкаў, камунальшчыкаў, пажарных службаў. Пры гэтым польскія калегі, больш вопытныя ў пытаннях узаемадзеяння са структурамі Еўрасаюза, падкажуць нашым спецыялістам, як правільна і эфектыўна афармляць заяўкі на міжнародныя гранты.

У найбліжэйшых планах — канцэрт у гонар Чэслава Немэна, які пройдзе ў Гродне з удзелам польскіх і беларускіх артыстаў, а таксама візіт нашай бізнэс-дэлегацыі ў Беласток.

Цікавыя і карысныя для абодвух бакоў справы прадугледжаны таксама дагаворамі аб партнёрстве Гродна з Сувалкамі, Аўгустовам (Польшча), Алітусам і Лаздзіяем (Літва). Напрыклад, фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Гродне, Сувалках і Алітусе будуць супрацоўнічаць у развіцці спорту і арганізацыі міжнародных турніраў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Новая бібліятэка ў Маларыце

Бібліятэка хоць і засталася ў старых сценах, але яна поўнасцю новая. Бо на рэканструкцыю галоўнага кніжнага дома ў райцэнтры затрачана каля мільярда рублёў. Новыя шафы і стэлажы, наноў пераабсталяваныя кабінеты і залы стварылі камфорт і ўтульнасць у памяшканні. Акрамя таго, бібліятэка адрамантавана і пафарбавана звонку, заменены стары дах. І самае галоўнае, што да ўрачыстага адкрыцця абноўленага аб'екта культуры набытая партыя новай літаратуры на суму 70 мільёнаў рублёў.

Яна СВЕТАВА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон
292 21 03.

3 чаго хоцімская цэгла?

Буйное радовішча трэпелу, адкрытае ў 1930-я гады ў памежным з Расіяй Хоцімскім раёне, нарэшце будзе запатрабавана. Новае прадпрыемства выкарыстае асадачную пароду для вытворчасці цэглы.

ТАА «Хоцімская цэгла» плануе сёлета атрымаць першую партыю керамічнай цэглы. Пакуль жа новае прадпрыемства існуе толькі на паперы і рыхтуецца да распрацоўкі бізнэс-плана.

Доследныя цагліны, адна з якіх захоўваецца і ў кабінеце старшыні Хоцімскага райвыканкама Фёдара ВІШНЕЎСКАГА, цяпер праходзяць выпрабаванні ў навукова-даследчым інстытуце.

— Крызіс міне, а будаўнічы бум працягнецца, — лічыць кіраўнік Хоцімскага раёна. — Людзі жывуць лепей і актыўна будуюцца. Цяпер яны ўжо не хочуць мірыцца з цеснымі кватэрамі ў «хрушчоўках», і зусім не завоблачныя грошы патрэбны для будаўніцтва невялікага лецішча альбо загараднага дамка. Растуць пасёлкі не толькі вакол сталіцы, але і ў правінцыі. Пакуль людзі будуць выдаткоўваць грошы на нерухомасць, спатрэбяцца і будаўнічыя матэрыялы. А значыць, і хоцімская цэгла будзе запатрабаваная.

Папярэдне інвестыцыі ў праект складуць каля 1 мільёна долараў: крэдытныя рэсурсы і грошы прыватных інвестараў. Абсталяванне можа быць закуплена на магілёўскім заводзе «Строммашына». Колькасць новых працоўных месцаў будзе залежаць ад аб'ёмаў вытворчасці: спачатку на «Хоцімскую цэглу» мяркуюць набраць 15 чалавек.

Ілона ІВАНОВА.

Пракуроры б'юць трывогу

У Віцебскай вобласці толькі за няпоўны студзень на пажарах загінулі каля 50 чалавек. Для параўнання — за ўвесь мінулы год каля 200. Такога раней не было. У Віцебскай абласной пракуратуры забілі трывогу і заклікаюць чыноўнікаў пайсці ў народ, каб спыніць «канвеер» смерці ад агню.

Вялікую колькасць загінулых можна растлумачыць моцнымі маразамі, печы ў многіх няспраўныя, таксама часта парушаюцца правілы бяспекі.

Таму, лічаць у абласной пракуратуры, трэба прыйсці ў кожную хату, каб праінструктаваць людзей, калі трэба — аказаць рэальную дапамогу, каб пазбегнуць трагедый. Кантроль за гэтым будуць ажыццяўляць пракуроры.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕЗ КАРДЫНАЛЬНЫХ НАВАЦЫЙ,

АЛЕ З ДАДАТКОВЫМІ ГАРАНТЫЯМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Гарадскія Саветы (гарадоў з раённым падзелам), Саветы пярвічнага ўзроўню вылучаюць кандыдатаў у члены калегіяльных ОТГС, прымаюць рашэнні аб ліквідацыі калегіяльнага ОТГС у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім патрабаванняў заканадаўства, ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю ОТГС. Акрамя таго, да асаблівасцяў кампетэнцыі Саветаў пярвічнага ўзроўню таксама адносіцца зацвярджэнне палажэння аб аднаасобным ОТГС.

Пры гэтым у законе адлюстраваны не ўсе, а толькі асноўныя паўнамоцтвы мясцовых Саветаў. У закон не ўключаны іншыя канкрэтныя іх паўнамоцтвы ў асобных сферах адносінаў, якія ўжо вызначаныя ў спецыяльных заканадаўчых актах, што рэгулююць гэтыя адносіны. Такі падыход найбольш мэтазгодны: ён выключае дубляванне нормаў прававых актаў. Пры гэтым аб'ём паўнамоцтваў мясцовых Саветаў ні ў якім разе не звужаецца.

Так, у закон не былі ўключаны палажэнні, што датычацца фарміравання даходнай часткі мясцовых бюджэтаў і вызначэння напрамкаў выдаткоўвання іх сродкаў. Гэтыя пытанні падрабязна ўрэгуляваны ў Бюджэтным кодэксе Рэспублікі Беларусь. Разам з тым, законам вызначана, што арганізацыйна-тэхнічнае і іншае забеспячэнне дзейнасці Савета і створаных ім органаў ажыццяўляецца апаратам Савета і выканкамам за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту. Пры гэтым да кампетэнцыі Саветаў аднесены зацвярджэнне мясцовага бюджэту і справаздачы аб яго выкананні. Такім чынам, новы закон захоўвае паўнамоцтвы мясцовых Саветаў у бюджэтна-фінансавай сферы. У сукупнасці з палажэннямі Бюджэтнага кодэкса яго нормы павышаюць фінансавую самастойнасць Саветаў усіх узроўняў, заканадаўча замацоўваюць іх бюджэтныя паўнамоцтвы, ствараюць умовы для эфектыўнага бюджэтнага планавання выдаткаў мясцовых органаў улады.

Для забеспячэння найбольш поўнай рэалізацыі функцый мясцовага самакіравання ў новым законе ўдакладнены **правілы дэлегавання паўнамоцтваў** яго органамі. Вызначана, што мясцовыя Саветы дэпутатаў розных узроўняў маюць права дэлегаваць адзін аднаму паўнамоцтвы толькі разам з неабходнымі для іх ажыццяўлення рэсурсамі. Саветы таксама маюць права дэлегаваць свае паўнамоцтвы выканкамам, іх старшыням, ОТГСам па просьбе або са згоды гэтых органаў, за выключэннем паўнамоцтваў, якія ажыццяўляюцца выключна на сесіях Саветаў.

З мэтай найбольш поўнага забеспячэння легітымнасці дзейнасці мясцовых Саветаў і рашэнняў, якія імі прымаюцца, у законе ўтрымліваюцца **ўдакладненні працэдуры і арганізацыі іх дзейнасці**. Гэтыя ўдакладненні патрабуюць унясення змяненняў у рэгламенты Саветаў. Так, дадаткова вызначаны агульны тэрмін пачатку паўнамоцтваў Савета: з дня адкрыцця яго першай пасля выбараў сесіі. Таксама ўстаноўлена, што дзейнасць Савета, парадак вырашэння ім усіх пытанняў вызначаюцца рэгламентам, які зацвярджаецца Саветам. Пры гэтым нормы рэгламенту павінны адпавядаць палажэнням закона. На падставе практыкі, якая склалася, у ім цяпер знайшлі дакладнае адлюстраванне асновы парадку дзейнасці Саветаў, формы такой дзейнасці, пералік органаў, якія яны ствараюць, замацавана магчымасць стварэння і дзейнасці ў Саветах дэпутацкіх груп і іншых дэпутацкіх аб'яднанняў. У законе таксама прадугледжана патрабаванне аб тым, што органы Савета павінны быць самастойна ім утвораны не пазней чым у двухмесячны тэрмін з дня склікання першай сесіі.

Зменены і кворум сесіі. Згодна з новым законам, **сесія правамоцная**, калі ў ёй удзельнічаюць не менш як дзве трэці ад ліку выбраных дэпутатаў. У дзейным законе кворум сесіі Савета прадугледжаны колькасцю больш за палову ад ліку выбраных дэпутатаў.

Удакладнены парадак галасавання і кворум прыняцця рашэнняў Савета і яго органаў. Вызначана, што рашэнні Савета і яго прэзідыума прымаюцца простай большасцю галасоў. Пры гэтым большасць галасоў лічыцца ад ліку выбраных дэпутатаў Савета, а рашэнні прэзідыума — ад поўнага складу прэзідыума (гэта значыць, ад агульнай колькасці членаў прэзідыума, якія павінны ўваходзіць у яго склад згодна з законам і рашэннем Савета).

Некалькі абмяжоўваюцца **функцыі прэзідыума Савета** па скліканні сесій. Раней сесіі маглі склікацца як па ініцыятыве старшыні Савета, так і па ініцыятыве прэзідыума Савета. Новым законам прадугледжана, што сесіі Савета склікаюцца і праводзяцца старшынёй Савета (яго намеснікам), а прэзідыум можа склікаць сесію толькі пры пэўных умовах. У шэрагу выпадкаў перазмеркаваны паўнамоцтвы Савета і прэзідыума. Напрыклад, згодна з дзейным законам, прэзідыум арганізоўваў кантроль за выкананнем рашэнняў Савета. Паводле новага закона, прэзідыум будзе забяспечваць гэты кантроль.

З улікам адзінства задач органаў мясцовага кіравання і самакіравання па збалансаваным і комплексным развіцці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак прадугледжана, што пытанні на сесію Савета могуць уносіць, у ліку іншых, старшыня выканкама, выканкам. Раней яны маглі ўносіць пытанні на сесію Савета толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

У цэлым можна адзначыць, што новы Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», з'яўляючыся чарговым этапам развіцця мясцовага самакіравання, замацоўвае існуючую структуру яго органаў, фіксуе іх кампетэнцыю, надзяляе сродкамі і інструментамі, неабходнымі для выражэння задач, якія стаяць перад імі.

Наталля КАРПОВІЧ, начальнік Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» – продавец (организатор аукциона) 05 марта 2010 года проводит открытый аукцион по продаже имущества

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Забор, длина – 138,15 м Склад, площадь 402,4 кв. м Ремонтные мастерские-гараж, площадь 737,74 кв. м Тепловые сети 146,72 м Канализационная сеть 87,9 м Электрические кабельные сети 29,5 м Водопроводная сеть 276,8 м Административное здание, площадь 445,12 кв. м Благоустройство территории, площадь 4086,4 кв. м Котельная, площадь 305,4 кв. м Здание для хранения изношенных шин, площадь 83,7 кв. м Туалет, площадь 4,9 кв. м Колодец, площадь 0,6 кв. м	336 211 139	Могилевская область, Кричевский район, г. Кричев, ул. Комсомольская, 126А	33 621 110

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23 64 24, 28 41 00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 05.03.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 1,0792 га, кадастровый номер – 724050100001005035.

5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 04.03.2010 г.; время: 17.00.

7. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе:

а) заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в настоящем извещении;

б) индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации;

в) юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

г) иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

д) представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

е) представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

Копии документов, указанные в настоящем пункте, должны быть заверены оригинальной подписью должностного лица и скреплены печатью юридического лица (индивидуального предпринимателя).

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

8. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

Інфармацыйная бяспека

БАЙНЭТ: КАНТРОЛЬ? АБАРОНА!

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 3 лютага.)

Згодна з Указам кіраўніка дзяржавы, адказнасць нясуць першым чынам асобы, якія размясцілі інфармацыю. Правайдары могуць быць прыцягнутыя да адказнасці, калі не выканалі загад кампетэнтных органаў.

У гэтым сэнсе паказальная формула Еўрапейскай Камісіі: «Тое, што незаконна афлайн, застаецца незаконным анлайн».

У Францыі правайдары могуць несці грамадзянскую адказнасць у сувязі з дзеяннямі карыстальніка, якія пацягнулі размяшчэнне ў інтэрнэце супрацьзаконнай інфармацыі, калі правайдар валодаў звесткамі аб супрацьзаконным характары гэтай інфармацыі або, з моманту атрымання такой інфармацыі, не пачаў аператыўна выдзяляць яе з сеткі або закрываць доступ да яе.

У законе абумоўлена — правайдары павінны забяспечыць магчымасць любой асобе інфармаваць іх аб фактах размяшчэння ў інтэрнэце інфармацыі, якая ўтрымлівае апалогію злачынстваў супраць чалавецтва, распальванне расавай нянавісці і дзіцячую парнаграфію.

Самі правайдары павінны неадкладна інфармаваць аб гэтых фактах праваахоўныя органы і, з іншага боку, інфармаваць грамадскасць аб сваіх метадах барацьбы з названымі фактамі. Невыкананне гэтых палажэнняў закона цягне за сабой адказнасць у выглядзе года пазбаўлення волі альбо 75 000 еўра штрафу.

Быў і прэцэдэнт. У верасні 2004 года французскія ўлады закрылі тры сайты, якія ўтрымоўвалі апісанне спосабаў вырабу выбуховых рэчываў і прынцыпаў іх ужывання. Аўтар аднаго з іх быў затрыманы паліцыяй.

Бельгійскі Закон ад 11 сакавіка 2003 года «Аб некаторых юрыдычных аспектах службаў інфармацыйнага грамадства» прадугледжвае, што як толькі правайдар даведаецца аб тым, што яго рэсурс выкарыстоўваецца альбо для незаконнай дзейнасці, альбо для перадачы незаконнай інфармацыі, ён павінен паведаміць аб гэтым каралеўскаму пракурору, які абавязаны распачаць прыняцце мераў у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам. Да моманту прыняцця пракурорам рашэння аб капіраванні, знішчэнні альбо адмове ў доступе да дакументаў, правайдар можа самастойна распачаць меры па прадухіленні доступу да гэтай інфармацыі.

Правайдары абавязаныя неадкладна інфармаваць выканаўчыя і судовыя ўлады аб незаконнай дзейнасці альбо незаконнай інфармацыі, якой займаюцца (якую падаюць) карыстальнікі рэсурсаў.

Як толькі становіцца вядомым факт парушэння гэтага закона, міністр эканомікі альбо адказная асоба міністэрства можа накіраваць правайдару афіцыйнае папярэджанне з патрабаваннем спыніць парушэнне. Папярэджанне можа быць накіраванае правайдару не пазней чым праз тры тыдні пасля выяўлення факта парушэння заказным лістом. У выпадку невыканання патрабаванняў правайдарам міністэрства апавяшчае каралеўскага пракурора.

У рамках Міністэрства эканомікі створаная арганізацыя «Назіральнік за правамі ў інтэрнэт», якая выпрацоўвае рэкамендацыі па працы ў сетцы. Таксама функцыянуе служба «eCops» (Electronic Complaints Prosessing System), якая займаецца разглядам скаргаў насельніцтва і прадпрыемстваў з нагоды падману ў інтэрнэце.

Крымінальнае заканадаўства Германіі утрымлівае мноства артыкулаў, якія прадугледжваюць адказнасць за розныя злачынствы, учыненыя з дапамогай камп'ютараў і камп'ютарных сетак.

Вядомы выпадак, калі аўстралієц нямецкага паходжання Фрыдрык Табэн размясціў на сваім сайце ў Аўстраліі аспрэчанне халакоста, а падчас свайго візіту ў Германію быў арыштаваны, абвінавачаны і ў лістападзе 1999 года асуджаны да дзесяці месяцаў пазбаўлення волі.

У адпаведнасці з паўднёваамерыканскімі законамі, распаўсюджвальніка лжывых звестак у інтэрнэце могуць прысудзіць да пяці гадоў турэмнага зняволення. Іншай мерай пакарання з'яўляецца штраф у памеры больш за 37,5 тысячы долараў. Летась на падставе гэтага артыкула быў прыцягнуты да адказнасці блогер, які распаўсюджваў інфармацыю аб хуткім абвале нацыянальнай валюты.

Паўнамоцвы Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, вызначаныя пунктам 13 Указа, таксама далёка не з'яўляюцца беспрэцэдэнтнымі.

«Патрыятычны Акт» ЗША (2001 год) дазволіў спецслужбам ажыццяўляць маніторынг усяго міжнароднага трафіку — на пунктах доступу ў міжнародныя сеткі ўсталявана адмысловае абсталяванне, якое дазваляе перахапляць электронную пошту і адсочваць зносіны ў чатах і форумах. Існуе і адмысловая інфармацыйная праграма дзярждэпартамента «Каманда па лічбавых знешніх кантактах», якая прызначана для супрацьдзеяння так званай «антыамерыканскай дэзынфармацыі» ў інтэрнэце ў замежных сегментах сеткі. 30 кастрычніка пры Міністэрстве ўнутранай бяспекі быў адкрыты Цэнтр інтэграцыі кібербяспекі і камунікацый. Адначасова ўлады заявілі аб пачатку будаўніцтва цэнтра камп'ютарнай бяспекі ў Солт-Лейк-Сіці (кошт — 1,5 млрд долараў). Паводле слоў кіраўніка Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША Кейта Александэра, кібервойскі ў ЗША надзеляць не толькі абарончымі, але і наступальнымі функцыямі.

У Вялікабрытаніі, згодна з новай стратэгіяй бяспекі, прадстаўленай прэм'ерам летам 2009 года, у сакавіку 2010 года плануецца адкрыццё ўрадавага цэнтра кібернетычнай бяспекі. Супрацоўнікі цэнтра будуць шукаць патэнцыйныя пагрозы інфраструктуры краіны ў сетцы інтэрнэт і арганізоўваць контратакі.

У Швецыі з 1 студзеня 2009 года дзейнічае закон, паводле якога Радыётэхнічная служба абароны (FRA) атрымала права перахапляць патокі інфармацыі, якія перасякаюць мяжу краіны. А Швецыя, як вядома, — найбуйнейшы транзітны вузел еўрапейскага інтэрнэту. Праз яе тэрыторыю праходзіць да 80 працэнтаў трафіку паміж Еўропай і Расіяй. Цяпер гэтыя патокі інфармацыі на законнай падставе могуць вывучаць спецслужбы...

Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.

Факт!

Не паверылі версіі

жыхара Рэчыцы, які атрымаў цяжкае кулявое раненне жывата, супрацоўнікі КДБ па Гомельскай вобласці. Як мы паведамлялі («Малатком па патроне» — 20 студзеня 2010 года, № 9), 38-гадовы мужчына сказаў міліцыі, што параніўся, калі цюкнуў малатком па патроне, знойдзеным у лесе ля вёскі Зялёная Паляна Чачэрскага раёна.

У прэс-групе КДБ расказалі, што грамадзянін трапіў у поле зроку супрацоўнікаў упраўлення некалькі раней — у выніку мерапрыемстваў, накіраваных на папярэджванне злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў як магчымых сродкаў здзяйснення тэрарыстычных актаў. Супрацоўнікі УКДБ правяралі інфармацыю аб тым, што мужчына захоўвае незарэгістраваную зброю. Выпадак, які ледзь не скончыўся трагедыяй (мужчыну на працягу чатырох гадзін рабілі аперацыю, наклалі больш за 20 швоў), прывёў да добраахвотнай здачы зброі. Прадпрымальнік М. выдаў чэкістам пяцізарадны паляўнічы карабін «ТОЗ-17» калібру 5,6Х16R. Па словах пацярпелага, карабін ён знайшоў у лесе.

Узяў прыклад з грамадзяніна і яго сябар. Ён добраахвотна здаў супрацоўнікам КДБ аднаствольную паляўнічую стрэльбу марэлі «ЗК» калібру 16Х70 і 50 патронаў, якія ён таксама знайшоў у лесе пад Чачэрскам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У Магілёва і Бабруйска з'явяцца сірыйскія пабрацімы

Сірыйскія гарады Хомс і Хама стануць партнёрамі двух буйных гарадоў Магілёўскай вобласці. **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў Беларусі Фарук Таха** наведаў Магілёў і прапанаваў завязаць пабрацімскія сувязі ў эканоміцы, гандлі і культуры.

Пасол спадзяецца на развіццё турызму і, на яго погляд, паток людзей у абодва бакі павялічыцца з адкрыццём прамых паветраных рэйсаў паміж Мінскам і Дамаскам. Беларусаў прыцягнуць міжземнаморскае ўзбярэжжа і рэлігійныя славутасці, сірыйцы зацікавіліся нашым паляваннем.

Фарук Таха пабываў у Беларуска-Расійскім універсітэце. Цяпер у Магілёве вучацца больш за дзясятак сірыйскіх студэнтаў і аспірантаў. Пасол адзначыў, што цяпер у Сірыі ідзе пераацэнка замежных дыпломаў. Паводле яго слоў, высокі ўзровень і цэласнасць адукацыі дазволіць адстаяць гонар беларускіх навучальных установаў.

Ілона ІВАНОВА.

У **суд Любанскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым грамадзяніна **Пяткевіча Мікалая Міхайлавіча**, 15.11.1966 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства якога: г. Мінск, вул. Дзянісаўская, 5-109.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Пяткевіча Мікалая Міхайлавіча, паведаміць іх суду Любанскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання.

Суд Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сувязі з паступіўшай заявай аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **Мерана Аляксандра Пятровіча**, 23 лістапада 1959 года нараджэння, ураджэнца с. Кароткае Слабадзейскага раёна Рэспублікі Малдова, які пражываў у в. Глыбочка Ушацкага раёна, просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра ўказанага грамадзяніна, паведаміць іх суду па тэл. 8 02158 2 13 38, 2 21 47 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Зварот у карпункт

Новая шафа з... «дзіркамі»?

З кастрычніка мінулага года жыхар Віцебска Сяргей ПЯТРОЎСКІ спадзяецца, што яму заменяць шафу, якую ён купіў у віцебскай краме («Юпітэр») або вернуць грошы за яе. Па дапамогу чытач звярнуўся ў віцебскі карпункт «Звязды».

— Падкажыце, што мне рабіць? — пытае ён. — Купілі мы шафу больш чым за 1 мільён 600 тысяч рублёў. Прывезлі дамоў, пачалі збіраць. Зверху на ёй атрымаліся нейкія адтуліны, якіх на чарцяжы няма. Ды і паліца ўсярэдзіне няправільна замацоўваецца. Я ў краму. Яны мне: мадэль эксперыментальная, звяртайцеся да вытворцы.

Я — вытворцы (прадпрыемству з Магілёва), на сайт, дзе ёсць адпаведны раздзел па рабоце з пакупнікамі, напісаў пра праблему. Але ніякай рэакцыі, нават адказу. Больш за тое, ліквідавалі з сайта маю скаргу, а добрыя каментарыі там ёсць. У краме мне не адмовілі ў дапамозе, але сказалі, што вернуць грошы, калі забяруць маю шафу на рэалізацыю. Або прапанавалі прысласць майстра ўсё наладзіць. Але ж, прабачце, нешта свідруюць і гэтак далей у шафе за 1,6 мільёна рублёў? Час ідзе.

Пасля першай размовы з чытачом я зноў з ім звязаўся.

— Сёння патэлефанавалі мне з Магілёва і паабяцалі, што могуць выслаць паліцы для шафы, а для верху шафы, калі не памыляюся, — драўнянастружкавыя пліты, — расказвае чытач. — Мой суразмоўца з Магілёва падкрэсліў, што шафа вельмі добра прадаецца за мяжой.

Паколькі віцебскае таварыства па абароне правоў спажыўцоў, як мне растлумачылі ў гарвыканкаме, пакуль не функцыяніруе (ліквідавана), па каментарый я звярнуўся непасрэдна ў Віцебскі гарвыканкам.

Намеснік начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага гарвыканкама Святлана МУХІНА параіла чытачу напісаць пісьмовую скаргу ў Кнігу заўваг і прапаноў крамы, дзе ён набыў шафу. На працягу 15 дзён з заявай пакупніка павінны разабрацца.

У любым выпадку, згодна з адпаведным артыкулам Закона аб абароне правоў спажыўцоў, пакупнік, якому прададзены тавар неадпаведнай якасці, калі ягоныя недахопы не былі агавораныя гандляром, мае права на замену на аналагічны якасны тавар або на вяртанне грошай, якія заплаціў за тавар.

А згодна з іншым артыкулам (№ 20) таго ж Закона, спажывец таксама мае права і на суразмернае памяншэнне пакупной цаны тавару (праўда, пра памер гэтай суразмернасці нідзе не гаворыцца, значыць, як дамовяцца пакупнік і гандляр, так і будзе. — **А.П.**). Гандляр па жаданні пакупніка таксама павінен адразу і бясплатна ліквідаваць недахопы або кампенсаваць выдаткі па ліквідацыі недахопаў.

Прадугледжаны Законам і вырашэнне спрэчных выпадкаў, якія датычацца якасці. Калі тавар на гарантыі, гандляр (або той, хто зрабіў тавар) абавязаны за свой кошт правесці экспертызу тавару. Больш за тое — пры гэтым павінны паведаміць пісьмова пакупніку пра месца і час правядзення экспертызы. І пакупнік мае права прысутнічаць падчас правядзення экспертызы. Калі чамусьці спажывец не давярае экспертам, да якіх звярнуўся гандляр (той, хто вырабіў тавар), можа сам замовіць экспертызу. І калі неадпаведная якасць будзе даказана, усе выдаткі спажыўца аплацяць «апаненты».

Нямала прыкладаў, калі аналагічныя спрэчныя пытанні разглядаліся ў судовым парадку. У такім выпадку спажывец можа, акрамя вяртання грошай, кампенсацыі ўсіх уласных выдаткаў: на транспарціроўку, экспертызу, папрасіць яшчэ кампенсаваць і атрыманую маральную шкоду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЖЫЛЛЁ

У сталіцы пабудуюць 920 000 м² для чаргавікоў

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, летась у Беларусі было здадзена ў эксплуатацыю 5 млн 849 тысяч квадратных метраў жылля, што на 0,8 працэнта больш за гадавое заданне.

За грошы грамадзян пабудавана 2738,1 тысячы кв. метраў, за крэдыты банкаў — 2565,4 тысячы кв. метраў, за кошт бюджэту — каля 280 тысяч і 265 тысяч кв. метраў жылля за сродкі арганізацый і з замежных крыніц.

Год таму ўрад краіны запатрабаваў ад будаўнічай галіны ўзводзіць не менш за 78 працэнтаў жылля менавіта для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Летась для чаргавікоў было пабудавана 2641,8 тысячы кв. метраў, што перавысіла заданне адразу на 10 працэнтаў. За дадзены паказчык на 3 працэнты не выканаў Мінск, дзе для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў было пабудавана 798,2 тысячы «квадратаў», а таксама Гродзенская вобласць (пабудавана 302,9 тыс. кв. м), дзе да плана не хапіла 10,4 працэнта.

Выканаўца абавязкаў старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Мікалай БУТРЫМ адзначыў журналісту «Звязды», што ў Мінску будуецца самы вялікі аб'ём жылля з дзяржаўнай падтрымкай. Летась будаўнікі не адпачывалі ў курылках, а працавалі часам у 2—3 змены, запэўніў кіраўнік камітэта. Сёлета ў сталіцы неабходна пабудаваць ужо 920 тысяч кв. метраў для чаргавікоў. Мікалай Бутрым упэўнены, што запланаваныя метры для бескватэрных гараджан будуць абавязкова ўзведзеныя, калі фінансаванне будаўніцтва з боку Беларусбанка будзе ажыццяўляцца своечасова ў поўным аб'ёме.

Усяго летась у Мінску ўведзена ў эксплуатацыю 1 млн 235 тысяч квадратных метраў жылля, у Мінскай вобласці — 1 млн 88,9 тысячы, у Брэсцкай — 878,4 тысячы, Гомельскай — 771 тысяча, Гродзенскай — 702,1 тысячы, Віцебскай — 592,3 тысячы, Магілёўскай — 581,3 тысячы кв. метраў.

Летась у вёсках і малых гарадах было пабудавана 2 млн 168,4 тысячы кв. метраў жылля, што амаль на 20 працэнтаў больш за гадавы план.

За кошт уласных сродкаў банкаў у мінулым годзе на будаўніцтва і набыццё жылля выдадзена крэдытаў у памеры 5221,7 млрд рублёў, з якіх па лініі льготнага крэдытавання — на суму 4554,9 млрд рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гродзенскай нерухомасцю зацікавіліся расіяне

Упершы месяц года на жыллёвым рынку гэтага заходняга фарпоста назіраецца істотнае ажыўленне. Патэнцыяльныя пакупнікі сталі не толькі цікавіцца цэнамі на жыллёвую нерухомасць на другасным рынку абласнога цэнтра, але і пачалі актыўна заключаць здзелкі, паведаміў карэспандэнту «Звязды» кіраўнік дзяржаўнай рыэлтарскай канторы Гродна Валяр'ян СТОКА.

Падаражэла новае жыллё

Менавіта ў студзені галоўны забудоўшчык горада Гроднажылбуд істотна павялічыў кошт будаўніцтва кватэр для нечаргавікоў. Цяпер па лініі долевага будаўніцтва кліентам прапануюць заключаць дагаворы, у якіх квадратны метр агульнай плошчы кватэр каштуе ад 2200 да 2500 тысяч рублёў. Нагадаю, што па такім кошце прапануецца будаваць кватэры без аздаблення. У сувязі з гэтым амаль імгненна пачаў павялічвацца попыт на таннейшыя кватэры другаснага рынку горада. Гэта і не дзіўна, бо мінімальны кошт квадратнага метра немаладых кватэр у Гродне сёння складае каля 700—750 долараў.

Максімальным попытам карыстаюцца двухпакаёўкі

Паводле інфармацыі спецыялістаў дзяржаўнай рыэлтарскай канторы, сёння мінімальны кошт аднапакаёвых кватэр у старых пяціпавярховых дамах горада складае 26—30 тысяч долараў, а стандартныя аднапакаёўкі магчыма набыць за 35—36 тысяч долараў. Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» тут прапануюцца ад 28 да 35 тысяч, а крыху лепшыя двухпакаёвыя кватэры з аднасна прыемнай планіроўкай — да 40 тысяч долараў. Выбар трохпакаёвых кватэр цяпер не самы вялікі, а каштуюць яны ад 16 да 60 тысяч долараў.

Валяр'ян Стока адзначае, што максімальны попыт сёння прыпадае на маленькія па плошчы, а таму і танныя адна- і двухпакаёвыя «хрушчоўкі» і «брэжнеўкі». Павышаным попытам карыстаюцца не толькі танныя аднапакаёўкі, а галоўным чынам невялікія двухпакаёвыя кватэры ў старых дамах. Колькасць прададзенага жылля, у параўнанні з леташнім перыядам, у гэтым студзені павялічылася ў разы. Разам з тым, спецыялісты адзначаюць, што сур'ёзны попыт на танную нерухомасць пакуль амаль ніяк не паўплываў на кошт кватэр. Людзі купляюць жыллё, але ў любым выпадку актыўна таргуюцца за кожны рубель. Стандартныя зніжкі па невялікіх кватэрах складаюць 1-2 тысячы, а вось па шматпакаёвым дарагім жыллі — да 10 тысяч долараў.

Разглядаючы перспектыву развіцця другаснага рынку Гродна, Валяр'ян Стока адзначыў, што на стандартныя кватэры будзе трымацца сённяшні стабільны цэннік на працягу мінімум трох месяцаў. Нейкіх сур'ёзных падстаў для істотнага падаражэння кватэр сёння няма, лічыць кіраўнік агенцтва.

Загарадныя дамкі скупляюцца расіянамі?

Недзе з другой паловы студзеня патэнцыяльныя пакупнікі сталі больш актыўна цікавіцца недарагімі катэджамі і прыватнымі дамамі, якія былі пабудаваныя 12—15 гадоў таму. Цяпер такая жыллёвая нерухомасць прапануецца кліентам па кошце ад 70 да 110 тысяч долараў. На рынку існуюць і элітныя дамы і катэджы коштам да 400 тысяч долараў, аднак у такім дыяпазоне цэнаў жыллёвая нерухомасць не прадаецца ў Гродне ўжо на працягу 1,5 года.

Сёлета ў гэтым абласным цэнтры пачала назірацца тэндэнцыя сур'ёзнай актыўнасці пакупнікоў з Расіі. Усё часцей багатыя людзі з суседняй краіны пачалі купляць сучасныя ўтульныя дамкі ў зялёнай зоне прыгарада. У агенцтвах расіяне замаўляюць такую жыллёвую нерухомасць у якасці летніх бунгала абавязкова ў месцах з цудоўнай прыродай побач з возерам ці ракой. За такія летнія дамкі з усімі выгодамі замежнікі гатовыя заплаціць да 200 тысяч долараў.

Ну другасным рынку жылля Гродна пачалі з'яўляцца і адносна танныя элітныя двухузроўневыя кватэры. Так, сёння ў продажы знаходзіцца падобная вялікая кватэра агульнай плошчай каля 160 квадратных метраў. Каштуе цяпер гэта кватэра «ўсяго» 160 тысяч долараў. Атрымліваецца, што жыллёвы «квадрат» элітнай кватэры «цягне» толькі на 1 тысячу долараў. Мабыць, фінансавы крызіс «б'е» менавіта па такой нерухомасці?

Сяргей КУРКАЧ.

Памяць

ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ КАЛІНОЎСКАГА ПРАЙШОЎ У ВІЛЬНІ НЕЗАЎВАЖАНЫМ?

Карэспандэнт «Звязды» ледзьве адшукаў пад снегам месца гібелі паўстанца

Другога лютага (паводле новага стылю) 1838 года нарадзіўся Вінцэнт Канстанцін Каліноўскі. Заўчора беларусы адзначалі ягоныя 172-я ўгодкі. Я ў гэты дзень якраз апынуўся ў Вільні — і, вядома, накіраваўся на Лукішскі пляц, дзе 22 сакавіка (паводле новага стылю) 1864 года царскія ўлады павесілі Кастуся Каліноўскага за арганізацыю паўстання.

Якая ж была мая роспач, калі я пабачыў, што знак на месцы пагібелі Каліноўскага... знаходзіцца пад метровым сумётам! Я разумею, што дата не круглая. Разумею, што ў Беларусі і за мяжой так ці інакш гэтая дата адзначаецца штогод. Аднак у Вільні жыве столькі беларусаў, там вучыцца столькі нашых!.. Няўжо нікому не дрыгнула прыйсці на Лукішскі пляц і прынесці сімвалічную кветку, запаліць сімвалічную свечку?

Бо месца пахавання Каліноўскага дагэтуль дакладна невядома — царская ўлада пахавала героя цішком, каб магіла не стала месцам пакланення свядомых беларусаў. Мяркуецца, што пахаваны Каліноўскі на схіле гары пры вежы Гедыміна. Таму ў якасці сімвалічнай магілы людзі прыходзяць на Лукішскі пляц.

Я не хачу пасаромець нікога асабіста. Але, шаноўныя віленскія беларусы, вам там бліжэй — давайце памятаць нашых нацыянальных герояў!

Хачу адзначыць пры гэтым, што асадак пакінуў канкрэтны факт — выгляд сімвалічнай магілы Каліноўскага ў ягоны Дзень народзінаў. Агулам жа віленскіх беларусаў цяжка папракнуць у няўвазе да нашага нацыянальнага героя — у мінулым годзе, напрыклад, нашыя суайчыннікі змагаліся з віленскімі ўладамі за тое, каб гэты знак Каліноўскаму быў пакінуты ў прынцыпе, бо яго збіраліся прыбраць.

Аднак, мне здаецца, памятаць пра герояў варта не толькі ў круглыя даты ці хвіліны змагання...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

У Дзень нараджэння Каліноўскага ўшанаваць яго памяць на Лукішскі пляц прыйшоў толькі карэспандэнт «Звязды».

Лінія жыцця

ПРОСТА ТАК

З усіх начэй, праведзеных не дома, гэта была ці не самай багатай — на ўражанні. Прычым неспадзеўкі! Бо ўсё ж, як заўсёды: перад камандзіроўкай яна пазваніла на прадпрыемства, куды збіралася ехаць, узгадніла сустрэчы, замовіла гасцініцу. А далей...

Дзверы ёй адчыніў... мужчына — не сказаць, што малады і прыгожы, не сказаць, што не... Уважлівы — гэта факт, бо адразу ж забраў сумку, павесіў плашч, спытаў, чаго выпе — кавы-гарбаты? Віна? Каньяку?

Хацела сказаць: «Хоць чаго», бо стамілася, змокла, змерзла... Але час быў позні — ад кавы ці гарбаты, дакладна ведала, потым не заснем... Папрасіла апошняга — глыток, калі можна?.. «Трэба!» — пераканаўча зазначыў сусед і тактоўна знік — даў магчымасць хоць трохі агледзецца.

Гасцініца, мяркуючы па ўсім, была ведамаснай, складалася з некалькіх перапланаваных кватэр — з утульнымі пакоямі, з агульным холам-калідорам, з кухняй... «Вас як завуць? — даносілася адтуль. — Надоўга прыехалі?.. А я во заўтра з'язджаю... Цяпер перакусіць збіраўся. Так што вы там хуценька — мыйце рукі».

Альтэрнатывы не было: памыла, прыхапіла свой «тармазок» (бацька вучыў: хто хлеб носіць, той есці не просіць), падалася на голас.

Кухня была на здзіў прасторнай. Стол — ужо накрытым. Сусед галантна прапанаваў ёй крэсла, на донцы ў келіхах наліў каньяку... Ён знайшоў, што сказаць (і расказаць — таксама, бо на гэтым жа прадпрыемстве скончыў праверку), знайшоў, пра што папытацца. За размовамі неўпрыкмет павячэралі. І разышліся...

Але ж ненадоўга: варта было ёй распрануцца, выключыць святло, з-за дзвярэй пачуўся далікатны стук. «Адчыніце...», — прасіў сусед, нешта хуценька ўмольна гаварыў, потым маўчаў, курыў, зноў далікатна стукаў, смяяўся, як быццам сыходзіў? І... зноў вяртаўся!

Колькі гэта цягнулася, яна сказаць не магла, бо такі ж заснула.

Калі прачнулася, сам сусед ужо знік, але «след» застаўся — у выглядзе каробкі цукерак з размашыстым: «Прабачце, што непакоіў... Але гэта, каб вы не падумалі, што я не мужчына. Ці вы не спадабаліся мне».

*...Ён — па вялікім рахунку — **проста так** ёй стукаў.*

***Проста так** яна магла адчыніць.*

Паварот ключа — паварот жыцця. У некага, што цалкам магчыма, да лепшага. У большасці ж...

Ехаць некуды падчас водпуску Надзя ў той год не збіралася. Ды і не магла — усе сілы, усе грошы «высмактаў» рамонт, пасля якога ўсяго і жаданняў было, што нічога з будматэрыялаў болей не шукаць, нікога з маляроў-сантэхнікаў-электрыкаў болей не бачыць, схавацца... Прычым ад усіх.

— То навошта ў горадзе? — здзівілася яе прыяцелька. — У вёску едзь, у мяне там хата пустая, я ключы табе дам... Зачыняцца не трэба — і так не зойдзе ніхто, тэлефона з тэлевізарам няма... Астатняе ж — дом, сад, лес, усё, як кажуць, уключана...

На Надзіна шчасце (ці на бяду?), уключана было куды больш: яна ніколі ў жыцці не бачыла такога дома, такога саду!.. Старыя пакручастыя яблыні, падступаючы да самых вокнаў, быццам прасіліся ў такую ж старую вялікую хату — з драўлянымі, ні разу не фарбаванымі столямі-падлогамі, з высокімі жалезнымі ложкамі, з рудой кафлянай печкай і печчу, з безліччу місак, гаршкоў, збанкоў...

Кожную пасудзінку, у бальшыні — старую, гліняную, «цёплую» — Надзі хацелася паразглядаць, патрымаць у руках. Але найперш яна паадчыняла вокны, павыносіла на сонца коўдры-падушкі, працерла падлогі...

Толькі пад вечар няспешна памыла посуд, парасстаўляла на месцы, што-кольвечы з самага патрэбнага і — быў грэх — прыгожага пакінула на стале, пад рукамі. Прайшлася па хаце. Тут ёй падабалася ўсё — яшчэ з вечара.

Што ўжо казаць пра раніцу, калі яна, выспаўшыся, выйшла на ганак, напоўніцу хапіла роснага паветра, птушынай гаманы і ўбачыла... два белыя слоікі прыкрытыя ад сонца лістом лопуху і паспешлівай запіскай: «Калі нешта трэба, заходзьце». Да каго і куды, звестак не было, як і намёку на тое, колькі ж яна вінная — за смятану, за малако...

Цікавыя людзі!

Надзя зразумела гэта надоечы, калі побач з назвай вёскі ўбачыла высокі хораша прыбраны крыж і за ім — два рады з большага акуратных, дагледжаных дамкоў, калі пачула дасюль нечуванае «Памагай Бог!» і ў адказ на яго (ад старых, што рэзалі дровы) «На Бога не налягай, ідзі сам памагай!»...

Канчаткова ж «дабіла» пачціва «Добрага здароўечка!», якое, гаварылі... ёй (?!), прыўзняўшы кепку (!).

(«І вам!..» — ляпнула Надзея, не ведаючы, што адказаць)...

Цяпер, акурат таксама, яна не ведала: не ведала, што рабіць — ісці шукаць таго, хто прынёс малако, ці...

Есці... хацелася больш. Яна занесла слоік у сад, паставіла на столік, туды ж з лустай хлеба і кубкам прыйшла сама: такога, ні з чым непараўнальнага сняданку ў яе не было ніколі!

І ніколі, як падалося, гэтулькі сілаў. Ліда агледзела кветнік, знайшла за садам некалькі градак, — старанна прапалола, мімаходзь убачыла кусты з гіблотай спелых парэчак. Спусцілася ў склеп, дастала слоікі і слоічкі — рашала наварыць варэнняў. Не, не сабе (сабе — хіба крыху) — таму, хто будзе прыязджаць у гэты шыкоўны дом, таму, хто будзе жыць тут пасля яе, потым...

Наабірала ягад, схадзіла ў краму па цукар. Вярнуўшыся, убачыла на ганку... міску з тварагом.

Зноў падумала, што трэба знайсці тую дабрачынніцу (ці дабрачынніка?), разлічыцца. Але тварог быў такі...

Занесла ў сад на столік, туды ж прыйшла сама — з боханам хлеба, смятанай і кавай!..

У яе ніколі не было такога абеду!

А потым — столькі варэння...

Ім, конча, трэба было пахваліцца (і падзяліцца). Як і ўражаннямі — ад сняданка-абеду, ад дома і саду, ад вёскі...

Малочніца (з хаты насупраць) слухала яе, мусіць, так, як сваіх унукаў — моўчкі, з усмешкай, зрэдзь дзе ўстаўляючы слоўка. Кшталту: «А як жа гэта — прайсці і «добры дзень» не сказаць? Ты казала? То во і маладзец...», «Як жа не падсобіць, калі чалавек стаў нешта рабіць?.. І «Памагай Бог!» яму трэба аддаць».

— Ды я хацела... — засмяялася Надзя. — Уяўляеце: іду па цукар, бачу — мужык на дварэ штось мые ды вешае... Ледзь не ляпнула яму «Памагай Бог»... Во каб «падсобіць» паклікаў!.. П'яніца нейкі... А хатка нішто яшчэ — жоўтая, вясёлая.

— Гэта, дзетанька, звонку, — уздыхнула жанчына, — унутры ж там... Кабета лежма ляжыць. А мужчына, што ты бачыла — гэта сын яе, Лёнік. Уперад недзе ў Расіі жыў, жонка была, кватэра, дачка. Маці як захварэла, усё там кінуў. Сам цяпер корміць, сам абмывае.

Яны размаўлялі пра нешта яшчэ, але не доўга і неяк бяздумна, бо думаць аб нечым яшчэ Надзя не магла: яна бачыла цяжка хворых, прыкаваных да ложка людзей, яна ведала, што жонкі кідаюць сваіх мужоў, яна чула, што дзеці ахвяруюць дзеля бацькоў, але гэта было ўсё паасобку і недзе далёка, у кіно, у кніжках...

Цяпер — побач, на яе вуліцы, у адным, суседнім дамку. І праходзіць міма яго, кінуўшы (услых ці маўчком) сваё «Памагай Бог!» Надзі не выпадала.

Апоўдні наступнага дня яна з'ездзіла ў горад — прапытала, як, дзе, за колькі (у прынцыпе...) можна здабыць інвалідную каляску, купіла вялізны пакет памперсаў для дарослых, прывезла апошнім аўтобусам (не бачыў ніхто), паставіла (у цемры...) праз плот ля «вясёлага» дома — ёй стала хоць трохі лягчэй.

Снедала і абедала зноў у садзе. Вячэрась збіралася там жа, калі скрыпнулі веснічкі і з'явіўся... Лёня. Не высокі, як хорт, худы, але ж чыста паголены, чыста апрануты... Ён «аддаў» ёй гарадское «Здравствуйте» і тутэйшае «Доброго здароўечка!», паклаў штось на стол, сказаў: «Дзякуй... Гэта ад мамы».

Яна, разгубіўшыся, не паспела сказаць нічога. А потым — тым больш: «ад мамы» былі два творы мастацтва: белыя вязаныя рукавічкі з вышытымі на іх матылькамі і шаль.

Прыняць гэта Надзя не магла. Панесці назад... таксама. Лічачы сябе абавязанай, яна дачасна з'ехала дамоў і рэштку водпуску патраціла на тое, каб такі дастаць і адправіць у вёску амаль новую інвалідную каляску...

«Атрымальнікі» ў той жа вечар пазванілі. Спачатку Лёня сказаў, што яны (пасля кожнага слова кліч нік) з мамай ездзілі сёння па хаце, што яны заўтра, калі знесці парогі (а за гэтым не стане...) будуць снедаць у кухні і што яна во хоча падзякаваць.

Праз кароткую паўзу ў трубцы пачулася ціхае «Алё» і... усё — жанчына плакала.

Недзе праз тыдзень Лёня пазваніў зноў — «па дзелу», але ж перш пахваліўся, што парогаў няма, што яны ўжо ездзілі на сяло і ў краму. «Для дзела» «даў слова» маці. Тая цяпер не плакала — падзякавала ёй за вазок (Надзя — за цудоўны дарунак...) і дадала, што мае нешта сказаць — важнае, з вока на вока. «То ты, дзетачка, можа, прыедзь калі?.. Я буду чакаць... Кожны дзянёк».

Каб не гэтае, апошняе, Надзя, відаць, не паехала б. А так...

Яе чакалі.

У яе быў час.

І яна, як быццам, нічога не траціла...

Бабуля і напраўду чакала. У новай мультановай блузцы, у новай хустцы яна доўга распытвала госцю, «чыіх» яна і адкуль, ці мае сясцёр і братоў, дзе працуе, расказвала штось пра сябе, хвалілася, «колькі дабра саткала, звязала і вышыла» (Лёня прынёс яго... Цэлае бярэмя...). Надзя таксама ўмела вязаць, і хутка яны ўжо лічылі вочкі на нейкай безрукаўцы, «падбіралі» пруткі, сядзелі за сталом на верандачцы — пілі «шампанскае» і елі торт.

Пасля чаго, бабуля паслала такі Лёню «пагуляць», дастала з-за пазухі загорнутыя ў хустачку долары, сказала: «Я ведаю, дзетачка, вазок табе не задарма далі. То вазьмі во... Я хацела з Лёнікам перадаць, але пабаялася. Ён то хлопец харошы, але запівае».

Каб не пакрыўдзіць бабулю, Надзя ўзяла ў яе адну купюрынку і міма вушэй прапусціла апошнія словы, бо ВЫпівалі ж амаль усе — яе брат, яе суседзі (і нават суседкі), супрацоўнікі, м

Трагедыя

Пакуль бацькі былі на працы...

Дзіця загінула ў пажары, які адбыўся 2 лютага ў кватэры жылога дома на станцыі Буйнічы Магілёўскага раёна. Там знаходзіўся 2-гадовы хлопчык, якога пакінулі дома аднаго. Бацькі былі на працы, а старэйшая дачка — у дзіцячым садку. Прыкладна за гадзіну да здарэння тата паклаў хлопчыка спаць і пайшоў.

Пах дыму пачула суседка, якая выклікала выратавальнікаў. На момант прыбыцця падраздзяленняў МНС у выніку пажару ў кватэры быў пашкоджаны вугал канапы, закопчаныя сцены і маёмасць. Каля канапы, якая тлела, і месціўся дзіцячы ложак з маленькім хлопчыкам. Выратавальнікі вынеслі малога на свежае паветра, аднак медыкам, якія прыбылі на месца здарэння, не ўдалося выратаваць дзіця.

Ілона ІВАНОВА.

Бівень слана «загнаў» за 70 тысяч рублёў

Не давярай абы-каму!

На кватэру да сталічнай прадпрымальніцы ў адсутнасць гаспадыні наведаўся 28-гадовы раней судзімы за крадзяжы зладзюжка з працяглым стажам спажывання наркотыкаў і вынес адтуль шмат дабра...

Паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Андрэя Сасонкі, у пацярпелай крымінальнік бываў раней — слаў там лінолеум. Аднак у наступны раз наведаўся ў жыллё, калі жанчыны не было дома. Між іншым, папярэдне, калі працаваў у кватэры, ён прыхапіў з тумбачкі ключы ад дзвярэй: такім чынам, трапіць у чужыя пакоі злачынцу цяжкасцяў не складала. Даведаўшыся, што прадпрымальніца на выездзе, ён, як кажуць, не на жарт разышоўся: некалькі разоў наведваўся ў жыллё, адкуль вынес дарагую шубу, плазмавы тэлевізар, відэамагнітафон, баявыя ордэны і медалі, што належалі бацьку гаспадыні, сталовае серабро і падносы, дэкаратыўны бівень слана і шмат іншых каштоўнасцяў на агульную суму 10 мільёнаў рублёў. Потым пачаў збаўляцца ад крадзенага. Што адметна, дарагі слановы бівень злачынца прадаў усяго за 70 тысяч рублёў. За ўзнагароды прыватны калекцыянер выклаў злодзею 60 долараў, да таго ж у якасці бонуса атрымаў ад апошняга сярэбраныя лыжкі і падносы. «Бізнэс» прадпрымальнага крымінальніка спынілі праваахоўнікі, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

ХТО ПЛАЦІЦЬ...

ПРЫВАТНАЯ перавозка пасажыраў стала неад'емнай часткай дзейнасці некаторых прадпрымальнікаў, і чалавека ўжо мала цікавіць, хто яго вязе і на чыёй аўтамашыне ён едзе. Галоўнае, каб даехаць хутка і з камфортам.

Пад Баранавічамі каля в. Лесіна («Звязда» паведамляла) сутыкнуліся «Жыгулі» з мікрааўтобусам «Форд». У той аўтаварыі загінуў вадзіцель «Форда» і пацярпела сем пасажыраў. Пазней было вызначана, што вадзіцель мікрааўтобуса перавозіў пасажыраў нелегальна, бо ў 2009 годзе яго пазбавілі правоў на кіраванне аўтамашынай.

У гэтым выпадку пацярпелі пасажыры. Мала таго, што яны апынуліся ў бальніцы, дык і прэтэнзіі прад'явіць не могуць. Калі б мікрааўтобус належаў прыватнай фірме, то можна было б дабіцца матэрыяльнай кампенсацыі, а з мёртвага вадзіцеля што возьмеш?

Аднойчы падчас паездкі на рынак у Баранавічах убачыў, што вадзіцель маршруткі збірае з пасажыраў грошы, а квіткоў нікому не дае. Нагадаў вадзіцелю раз, а рэакцыя нулявая, на другі — кароткі адказ: «Вам ён трэба?» і толькі на трэцяе запатрабаванне адарваў квіток і пракаментаваў: «Усе як людзі...»

Даволі зняважлівы эпізод, бо ўсе пасажыры едуць спакойна, а табе нешта карціць, нейкіх правоў дабіваешся...

Гэта здарылася ў нядзелю, а ў панядзелак патэлефанаваў ва ўпраўленне эканомікі гарвыканкама і выказаў свае прэтэнзіі, назваў нумар маршруткі. Фірму, якой належала «Газэль» там ужо ведалі, ды і на квітку яна пазначана.

Праз некалькі тыдняў я атрымаў адказ, у якім гаварылася, што дырэктар ПГУП «Бізнэс КСН» аб'явіў вадзіцелю вымову, а яшчэ «Інспекцыяй па г. Баранавічы і Баранавіцкім раёне накіравана інфармацыя ў інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах па Брэсцкай вобласці з мэтай прызначэння пазапланавай праверкі прыватнага ўнітарнага прадпрыемства».

Неўзабаве зноў давялося ехаць на маршрутцы, і зноў вадзіцель (іншы) квіткі пасажырам не даваў. І самае сумнае, што іх ніхто і не патрабаваў...

Я не ўнікаў, што ў такіх выпадках атрымліваецца: ці вадзіцель ашуквае гаспадара фірмы, ці дзяржава нясе страты. Але квіток з'яўляецца дакументам, і ў выпадку аўтаавары ці нейкага здарэння пасажыр без праблем можа даказаць, што ехаў у тым мікрааўтобусе, а без квітка ўсё ўскладняецца.

Пры падвядзенні вынікаў работы транспартнай інспекцыі па Брэсцкай вобласці яе кіраўнік Мікалай Стрыж падкрэсліў, што пастаянна даводзіцца змагацца з парушэннямі транспартнага заканадаўства. Інспекцыяй у 2009 годзе праверана 5 тысяч транспартных сродкаў і амаль у кожным пятым аўтамабілі былі такія парушэнні.

У некаторых аўтамашынах заблакіраваны задні выхад, а здараецца, што нехта, каб мець большы прыбытак, ставіць у маршрутку дадатковыя месцы для сядзення. Бывае, што ў вадзіцеля няма пуцявога ліста, аўтамашына не прайшла тэхагляд, не застрахаваная...

Акрамя гэтага, вялікая колькасць «левых» вадзіцеляў выязджае на маршруты ў гарадах. Часта на чыгуначным вакзале «Баранавічы-Палескія» пасажыраў сустракаюць маладыя мужчыны. «Вас падкінуць? Куды едзем?» — пытаюцца яны, выглядваючы сярод сышоўшых з электрычкі сабе кліентаў. Гэта якраз і ёсць «левыя» вадзіцелі, бо таксісты сядзяць у сваіх машынах на стаянцы праз дарогу.

«Левыя» не плацяць падаткаў, складаюць канкурэнцыю вадзіцелям, якія працуюць афіцыйна, ды і падчас дарожна-транспартнага здарэння пасажыр у «левай» аўтамашыне застаецца са сваёй праблемай сам-насам.

Але выявіць і затрымаць вадзіцеля, які займаецца нелегальнымі перавозкамі, працуе без ліцэнзіі, няпроста. «Чалавек папрасіў, мне па дарозе, то чаму не падвезці», — скажа вадзіцель інспектару, а пасажыр гэта пацвердзіць. І нічога ў такім выпадку не дакажаш.

Неабходна «левака» схапіць за руку, напрыклад, разлічыцца мечанай купюрай і затым ужо інспектар можа спадзявацца на нейкі вынік.

Як вылавіць нелегальных перавозчыкаў, як прымусіць вадзіцеляў выконваць транспартнае заканадаўства — гэта праблема адпаведных структур, але яе немагчыма вырашыць, пакуль пасажыры будуць да гэтага пытання абыякавыя. Калі б пазіцыя пасажыраў маршруткі была акрэсленая, то ў вадзіцеля не ўзнікла б пытання, даваць тыя квіткі ці не. Калі чалавек садзіцца ў аўтамашыну «нелегала», то...

Трэба зразумець адну простую ісціну. Мы вадзіцелю, прадаўцу, цырульніку, чыноўніку... нічым не абавязаныя. Апошні працуе ў народа па найме, а астатнім за паслугі плацім. А хто плаціць...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

МАСЛЕНІЦА ІДЗЕ!

Да 10 лютага паласавацца смачнымі блінамі з мёдам, а таксама набыць запасы цудадзейных лекаў можна будзе ў сталічным Палацы чыгуначнікаў (на вул. Чкалава), а з 5 лютага — у Палацы мастацтваў (на вул. Казлова).

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

Далёкае — блізкае

«Была зіма снежная ды лютая...»

ПРА ХАЛАДЫ, ЯКІЯ ВЫПАЛА ПЕРАЖЫЦЬ НАШЫМ ПРОДКАМ 300—400 ГАДОЎ ТАМУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле паведамленняў сіноптыкаў, такі ж халодны, як сёлета студзень, быў у 1987 годзе. А на пачатку лютага за адзін дзень у шмат якіх рэгіёнах Беларусі выпала амаль палова месячнай нормы снегу, таўшчыня якога даходзіла да пяўметра. Многія могуць узгадаць марозныя і снежныя зімы 1970-х гадоў і ранейшага часу. Падумалася: а што на гэты конт пісалі беларускія летапісы і хронікі? Пагартаем іх старонкі...

Найбольш інфарматыўнай у гэтым пошуку з'яўляецца «Баркулабаўская хроніка». Яе аўтар, мясцовы праваслаўны святар, добра ведаў і адчуваў жыццё і клопаты так званых простых людзей. З вялікім болем і суперажываннем апісаў ён падзеі, што выпалі мясцовым людзям на пераломе XVI—XVII стагоддзяў. Прапусцім у гэтым даследаванні ўзгаданыя ім войны, эпідэміі, летнюю спёку і іншыя няшчасці — прывядзём прыклады анамальных халадоў.

Адным з такіх халодных гадоў быў 1585-ы. Тады, як піша аўтар, **«Господ Бог вялікае мноства страшных і вялікіх цудаў пажадаў паказаць: град і перуны вялікія, засуха, маразы ці не ўвесь год былі ў Літве. Ад вялікіх маразоў жыта ў полі пасохла, а мноства дамоў паноў шляхетных ад вялікіх перуноў пагарэла, зімой жа ад маразоў і завірух загінула на дарогах вялікае мноства жабракоў і купцоў».**

Такія халодныя зімы, як сведчыць аўтар хронікі, былі ў той час не рэдкасцю. Найбольш іх выпала на самы пачатак XVII стагоддзя. Працытуем на мове арыгінала: **«Року 1600. Того року была зима люта и снежная», «Того ж року (1601. — М.Г.) была зима злая, снеги великие и сильные были морозы. Многим людем помозило кому ногу, кому пальцы, другому вид: уши, нос; а другие з морозу померли».**

Халодныя зімовыя месяцы —з'ява ўсё ж зразумелая. Нашмат больш перажывае аўтар за людзей, якія трапілі пад анамальнае надвор'е ў іншыя поры года. Часам зімовыя халады прыходзілі вясною. У 1587 годзе **«была зіма вельмі снежная, з моцнымі маразамі, ды вялікімі завеямі. Гэтакая ж і вясна была вельмі няўстойлівая, рэдкі дзень мінаў без снегу, аж да святога Юр'я»**. Вельмі нядобрым, па словах аўтара, быў 1597 год — **«Былі хваробы ўсялякія, шматлікія, вялікія. Зіма была снежная ды лютая, на санях ездзілі пасля Вялікадня яшчэ два тыдні».** (А Вялікдзень, як мне ўдалося высветліць, быў у той год 6 красавіка. — М.Г.). У 1602 годзе **«на дзесятым тыдні ў Вялікі чацвер быў страшны мароз. Што было кветак — то ўсё памарозіў. Пачатак быў грозны, а канец — слёзны. Усю агародніну — капусту, буракі, цыбулю, мак, гарох, ячмень, яравую пшаніцу — мароз пабіў. Слёзна было бачыць гэтых галодных людзей, якія толькі агароды пасеялі...»**. Халодна было і ў 1603 годзе: «...**вясна была вельмі сцюдзёная, марозлівая, аж да тыдня святога Фамы»** (другі тыдзень пасля Вялікадня, які быў 4 мая. — М.Г.), і ў 1604 годзе — **«...тады жыта ў квітненні мароз пабіў. Таксама агуркі ў квітненні мароз пабіў. На той час у гаспадарцы мала хто мог пахваліцца агуркамі, хаця іх і добра даглядалі. Ягадаў, яблыкаў ды іншае садавіны мала засталося з-за вялікіх дажджоў, маразоў і граду».** Тут жа аўтар запісвае цікавую звестку, што **«расказвалі, быццам бы сярод лета ў Маскве быў вялікі снег і мароз, некалькі тыдняў на санях летам ездзілі»**.

У некаторыя гады зіма пачыналася занадта рана і таксама прыносіла шмат шкоды і бяды гаспадарам. У 1587 годзе **«не змаглі ўратаваць пасеваў ад вялікіх маразоў, якія пачаліся ад дня першай Святой Прачыстай»**. У 1600 г. **«у самую восень насуперак звычаю 17 верасня ў аўторак з захаду ў нас былі вялікія грымоты і з усіх бакоў вельмі моцна грымела. Таксама і маланка бліскала. А ўначы быў вецер з марозам»**.

Анамальным выдаўся і 1601 год — **«У тым жа годзе, 10 кастрычніка, цэлы дзень ішоў моцны ды густы снег, выпаў на паўгалёнкі. Была і моцная бура... Ляжаў той снег два тыдні, ажно да Дзмітраўскай суботы. Вялікія маразы скавалі Дняпро, і ездзілі па ім быццам сярод зімы...»** Апісваючы такое надвор'е, аўтар ізноў жа суперажывае людскому гору: **«Тады пшаніцу, ярыну, авёс, грэчку, гарох ды ўсю гародніну, усё, што было на палях несабранае, а таксама жатыя копы пазамятала снегам, было балюча і страшна глядзець і чуць уздыхі і плач людзей убогіх, аратаяў бедных. ... А потым пачалі жаць-гараваць па снезе ў сцюжу. Былі маразы вялікія, вогнішчы раскладалі, самі грэліся, аж страшна і балюча было глядзець...»**.

Знойдзем у «Баркулабаўскай хроніцы» і ўзгадванне цёплых зім. Напрыклад, у 1588 годзе **«...18 студзеня, пасля святога Афанасія на трэці дзень быў вялікі дождж, аж снег сагнала. Было амаль як увесну: пастухі ў бор статкі пагналі пасвіць, а потым праз тры тыдні — зноў лютая зіма»**. Маласнежная зіма была ў 1598 годзе — **«хоць рана стала, але дружна сышла»**. Пасля папярэдніх трох халодных зімаў **«у год 1604 на святога Васіля, інакш кажучы — на Новы год, была зіма вельмі добрая, пагодлівая да вялікага посту. А потым на пятым тыдні вялікага посту снег з дажджом быў вялікі, ажно Дняпро разліўся і снег сагнала...»**.

Чытаючы гэтую хроніку, можна заўважыць, што пасля халодных зімаў у той жа год летам была або вялікая спёка, або моцныя навальніцы з градам.

Анамальныя халады, як усё ж нязвыклая з'ява, траплялі на старонкі і іншых хронік. Навагрудскі падсудак Фёдар Еўлашоўскі запісаў у сваім «Дзённіку»: **«Року 1594, мая 20, в пяток, припадла хмура сроде зимна, спустила снег велкий и лежал три дни. Помарло от тэй хмуры и зимна и ветру кгвалтовного сила людей, по трою индэл вэспол, а не мокгли собе помочи. Птаства по гнездах, самэм видял, барзо веле поздэхлых. Страх был и под дахэм седячи»**.

«Віцебскі летапіс» паведамляў, што ў 1570 годзе **«з-за доўгай і цяжкай зімы людзі з лісця рабілі сабе ежу і елі трупы, ішлі ў лясы на з'ядзенне звярам...»**. Засведчыў летапісец таксама «галодную і марозную» зіму 1601 года.

Халодную зіму адзначыла і «Магілёўская хроніка». Здаецца, там толькі раз узгадваецца пра надвор'е — відаць, гэта была значная падзея для горада — **«Год 1709. У гэтым годзе была лютая зіма, стаяла доўга, снягі былі невыносныя і нечувана вялікія, што не толькі звяр'ё, птаства, але і людзі на дарогах мерзлі»**.

Вось такія халады выпала перажыць нашым продкам 300—400 гадоў таму. Дык хіба ж ёсць нешта анамальнае сёлетняй зімою?

Мікалай ГАЙБА, дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча.
г. Навагрудак.

МАГІЛЁЎСКІ ПРАРЫЎ У КІНО

У магілёўскім кінатэатры «Радзіма» адбылася прэм'ера стужкі «Трэці званок», якая здымалася ў абласным цэнтры і расказвае пра жыццё акцёраў.

Зала, поўная гледачоў, вітала апладысментамі стваральнікаў свайго кіно. У фільме здымаліся акцёры абласнога драматычнага тэатра. **Аўтар ідэі і рэжысёр — магілёўскі акцёр Вячаслаў СІКОРА.** Ён разам з сябрамі па тэатры прыдумаў расказаць у серыяле не толькі пра парадны выгляд акцёраў са сцэны, але пра іх сапраўднае жыццё са звычайнымі чалавечымі праблемамі.

— Ды проста надакучылі ўсе гэтыя «мянты» — серыялы з падобнымі сюжэтамі і аднымі і тымі ж акцёрамі, — шчыра сказаў рэжысёр.

Фільм «Трэці званок» сапраўды не вельмі падобны на звычныя расійскія серыялы. Іншы рытм, шмат музыкі, фрагменты спектакляў, шмат цікавых дэталяў тэатральнага жыцця, студэнцкія заняткі, творчыя праслухоўванні.

Магілёўцам было прыемна пазнаваць вуліцы, будынкі і дворы роднага горада. Гледачы адчувалі гонар ад таго, што і ў правінцыйным Магілёве знайшліся людзі, якія маюць выдатныя творчыя ідэі і не баяцца рызыкаваць, каб іх ажыццявіць.

Вячаслаў Сікора дзякаваў на прэм'еры ўсім сваім калегам, якія паверылі ў яго «вар'яцкія» ідэі і бясплатна здымаліся ў фільме падчас сваіх законных жнівеньскіх водпускаў.

Мясцовыя ўлады падтрымалі ідэю новага магілёўскага кіно. Рэжысёру і яго камандзе далі магчымасць здымаць у сценах Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра — прыгожага старажытнага будынка.

— Культурныя традыцыі Магілёўшчыны вялікія і разнастайныя, але гэта першы наш прарыў у кіно, — сказаў на прэм'еры **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**. — Ідэя зняць фільм у Магілёве спраўдзілася, і я жадаю гэтаму фільму шырокай творчай дарогі.

Сярод тых, хто падтрымаў магілёўскую ініцыятыву, і вядомыя расійскія артысты: **актрыса і культуролаг Людміла МАЛЬЦАВА і народны артыст Расіі Юрый НАЗАРАЎ.** Госці з Масквы прыехалі на магілёўскую прэм'еру. Праект Вячаслава Сікоры Людміла Мальцава назвала «сапраўдным творчым учынкам» і ўручыла рэжысёру віншавальны адрас Гільдыі акцёраў кіно Расіі.

Праўда, на экране гледачы так і не ўбачылі Юрыя Назарава. Яго эпізоды рэжысёр уключыць у наступныя серыі. Пасля прагляду знакаміты акцёр выступіў з прамовай.

— Цяпер у нас навокал толькі шоу, якія не прымушаюць людзей думаць, — сказаў Юрый Назараў. — І гэта стужка дае мне надзею, што мы, акцёры — не скамарохі, а людзі, у якіх ёсць душа і імкненне падзяліцца вечнымі каштоўнасцямі з нашым сучасным прагматычным светам.

Фільм сапраўды прымушае задумацца. У яго герояў хапае жыццёвых праблем: адзінота, цяга да алкаголю, цяжкія хваробы, хранічны недахоп грошай, заблытаныя асабістыя адносіны. Многія персанажы выклікаюць шчырае спачуванне, іншыя — абурэнне. Праўда, усё ж падалося, што нестае ў штодзённым жыцці правільчыных акцёраў шчырых усмешак, гумару і самаіроніі, якія дапамагаюць людзям спраўляцца з нягодамі. І ці не зашмат п'юць і курыць на экране? Аднак агульнае меркаванне магілёўскіх гледачоў такое: «Вельмі цікава, і ўжо хочацца пабачыць працяг».

Фільм «Трэці званок», прадэманстраваны магілёўскай публіцы, называюць маленькім фундаментам вялікага праекта. Вячаслаў Сікора здымаў яго за ўласныя і пазычаныя сродкі. У лютым першыя тры серыі рэжысёр-дэбютант пакажа ў Маскве і Пецярбургу. Калі праект прымуць да паказу на тэлебачанні, то яго вытворчасць набудзе фінансавы падмурак, і здымкі ў Магілёве працягнуцца.

Ілона ІВАНОВА, фота Мікалая ЦІТОВА.

Тарыфы на электраэнергію будуць дыферэнцыяваныя?

Спробы прывучыць насельніцтва эканомна расходаваць тую ж электраэнергію вядуцца ўжо не першы год. Як вядома, для яе вытворчасці выкарыстоўваюцца мазут і прыродны газ, якія паступаюць у Беларусь з іншых краін. Вядома ж, не за так. Таму нядаўна Савет Міністраў прыняў пастанову, згодна з якой у найбліжэйшы час будуць зроблены новыя захады, скіраваныя на выкананне раней пастаўленай задачы — дабіцца эканоміі энергіі, у тым ліку і электрычнай, пра што паспелі ўжо паведаміць некаторыя СМІ.

У гэтай сувязі можна прыгадаць, што, напрыклад, Парадак нарміравання спажывання і разлікаў за электраэнергію з насельніцтвам быў распрацаваны ў мэтах выканання пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 1999 года № 941 «Аб падрыхтоўцы народнай гаспадаркі рэспублікі да работы ў асенне-зімовы перыяд 1999/2000 гадоў». Ён прадугледжваў устанаўленне нормаў спажывання, у межах якіх вялася аплата насельніцтвам электраэнергіі па вызначаных заканадаўствам тарыфах, а таксама памер аплаты электраэнергіі, спажытай звыш нормы. Нарматывы спажывання электраэнергіі на камунальна-бытавыя патрэбы вызначаліся ў сярэднім на аднаго чалавека і для сем'яў з рознай колькасцю членаў зыходзячы з сярэдніх фактычных значэнняў: забеспячэння сацыяльнай нормай жылля; неабходнай магутнасці крыніцы святла на адзін квадратны метр, колькасці гадзін выкарыстання лямпаў асвятлення і каэфіцыента іх адначасовага ўключэння; мінімальна неабходнага набору электрапрыстасаванняў бытавога і культурна-інфармацыйнага прызначэння на адну сям'ю, і сярэдніх гадавых расходаў электраэнергіі адным прыборам; тыпам абсталявання для прыгатавання ежы. Такім чынам, у аснову разліку нарматываў закладваліся прынцыпы забеспячэння дастатковага ўзроўню жыццядзейнасці і паслуг насельніцтву, зацікаўленасць апошняга ў эканомным выкарыстанні электраэнергіі і скарачэнні яе нерацыянальнага расходавання, набліжэнне ўзроўню аплаты за электраэнергію, якая спажываецца насельніцтвам, да сабекошту яе вытворчасці.

Цяпер выкарыстанне павышаючых каэфіцыентаў за неэканомнае выкарыстанне электраэнергіі, як паведамляецца, фактычна прызнана немэтазгодным: міністэрствам эканомікі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, энергетыкі і Дзяржстандарту даручана на працягу даволі кароткага тэрміну распрацаваць новую сістэму аплаты за энергію, узяўшы за аснову дыферэнцыяванасць тарыфаў. Чым канкрэтна не задавальняў ранейшы падыход?

У пэўным сэнсе можна меркаваць, што да магчымасці перагляду сістэмы аплаты насельніцтвам электраэнергіі прывяло паляпшэнне ўзроўню жыцця — у параўнанні хоць бы з названымі 1999—2000 гадамі. У дамах і кватэрах з'явілася сучасная бытавая тэхніка, павялічылася яе колькасць у адной асобна ўзятай сям'і, што прывяло да павышэння спажывання энергіі. Чаго хаваць, напэўна, не заўсёды рацыянальнага. Заклікі эканоміць часам у асобнай сям'і застаюцца не пачутымі. Гэта ўсё зразумела. Толькі якім чынам плануецца змяніць існуючую сістэму аплаты? Мы звярнуліся практычна ва ўсе пералічаныя вышэй структуры, на якія пастановай ускладзена задача па яе рэарганізацыі. Канкрэтнага адказу пакуль не трымалася дабіцца нідзе. Дзе спасылаліся, што гэта прэрагатыва, хутчэй, іншага міністэрства, недзе казалі, што афіцыйна яшчэ ніякіх дакументаў не атрымлівалі, паколькі мінула зусім мала часу, і раілі турбаваць з гэтай нагоды пазней. Прагучалі і першыя — пакуль неафіцыйныя — сумненні адносна таго, што пэўныя захады ў гэтым кірунку можна будзе ажыццявіць на практыцы пры існуючых тэхнічных умовах уліку спажытай насельніцтвам электраэнергіі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

«БЕЛАРУСКАЯ ЛЫЖНЯ» АДКРЫЕЦЦА ЭСТАФЕТНЫМІ ГОНКАМІ СЯМЕЙНЫХ КАМАНДАЎ

«Беларуская лыжня» пройдзе 20 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы». Пасля сямейных камандаў на старт па чарзе выйдуць каманды арганаў дзяржаўнага кіравання. Усяго іх будзе 40. Пасля на лыжы стануць ветэраны спорту, працы і Вялікай Айчыннай вайны. Таксама тут адбудуцца эстафетныя забегі сярод самых моцных лыжнікаў з усіх раёнаў сталіцы і Мінскай вобласці.

Для ахвотных наведаць спартыўнае свята наладзяць дадатковы аўтобусны маршрут з аўтавакзала «Маскоўскі». У гэты дзень у Раўбічах будуць працаваць пункты пракату спартыўнага інвентару, грамадскага харчавання. Акрамя таго гледачоў чакае насычаная культурна-забаўляльная праграма.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск—Навіны».

Жаночыя сакрэты

15 СПОСАБАЎ ЗАХАВАЦЬ ЗДАРОЎЕ НА ДОЎГІЯ ГАДЫ

СТРАЦІЦЬ каштоўнае здароўе лёгка, а вось пазбавіцца ад балячак не ў прыклад больш складана. Нашмат прасцей выконваць наступныя немудрагелістыя правілы — і сустракаць кожны дзень бадзёрай і моцнай.

Кожны дзень

1. Сачыце за чысцінёй поласці рота. І справа не толькі ў хваробах зубоў і дзяснаў: у роце збіраюцца мільёны бактэрый, якія, калі іх своечасова не выдаляць, садзейнічаюць павелічэнню рызыкі ўзнікнення шмат якіх хваробаў. Двойчы ў дзень чысціце зубы і язык, а пасля кожнага прыёму ежы старайцеся прапаласкаць рот.

2. Канталюйце сваю вагу. Штодзённае ўзважванне зніжае рызыку набору лішняй вагі і развіцця атлусцення.

3. Прымайце кантрасны душ. Чаргаванне халоднага і гарачага душу ўмацоўвае імунітэт і надае пругкасць скуры.

4. Здымайце з ежы тлушч. Прамакнуўшы папяровай сурвэткай лішкі тлушчу з катлеты, мяса, смажанай агародніны, вы пазбавіцеся ад 14 % тлушчу без урону для смаку.

Штотыдзень

5. Ешце рыбу і морапрадукты, у тым ліку марскую капусту. Гэта прадухіліць цэлы шэраг захворванняў і ўмацуе імунітэт.

6. Рабіце доўгія прагулкі ў лес, у парк, да возера. Або пагуляйце з дзецьмі, прарыхліце градку, выгуляйце сабаку даўжэй, чым звычайна. Фізічныя нагрузкі неабходныя хоць бы 1—2 разы на тыдзень.

Раз у паўгода

7. Наведваць стаматолага трэба рэгулярна, прыкладна раз у 6 месяцаў, нават калі ў вас здаровыя зубы. Бо шмат якія праблемы можа ўбачыць толькі ўрач пры старанным аглядзе поласці рота. А своечасова залечаны карыес, выдалены зубны налёт і рэстаўрацыя старой пломбы змогуць значна падоўжыць жыццё вашым зубам. Дарэчы, пратэзаванне зубоў — нашмат больш дарагое задавальненне, чым замена пломбы, і лепш гэтага пазбегнуць.

8. Не забывайце пра візіты да гінеколага — гэта таксама варта рабіць не радзей чым раз у паўгода. Унутрыклетачныя інфекцыі могуць доўгі час ніяк не праяўляць сябе, ціха наносячы шкоду арганізму ў выглядзе развіцця бясплоднасці, павышаючы рызыку выкідышаў і стваральчы спрыяльны асяродак для з'яўлення пухлін.

9. Рабіце электракардыяграму — гэта дазволіць выявіць магчымыя сардэчна-сасудзістыя паталогіі на ранняй стадыі.

10. Здайце агульны аналіз крыві: ён своечасова пакажа наяўнасць запаленчага або алергічнага працэсу ў арганізме, недахоп жалеза, хваробы крыві.

Штогод

11. Наведвайце мамолага. Малочныя залозы — вельмі далікатны і адчувальны орган, таму развіццё новаўтварэнняў у іх адбываецца дастаткова часта.

12. Наведвайце дэрматолага-анколага. Яму трэба паказаць тыя радзімкі, якія змянілі апошнім часам сваю форму, колер, памер.

13. Вымярэнне ўнутрывочнага ціску павінна стаць штогадовым ужо пасля спаўнення 30 гадоў — з мэтай выяўлення і папярэджання развіцця глаўкомы.

14. Флюараграфію неабходна рабіць штогод для своечасовага выяўлення раку лёгкіх і ачагоў туберкулёзу. Асабліва важна захоўваць гэта правіла, калі вы жывяце ў мясцовасці з дрэннай экалогіяй і/або курыце.

15. Рэгулярна правярайце ўзровень халестэрыну і кантралюйце каэфіцыент атэрагеннасці, які гаворыць аб суадносінах «добрага» і «дрэннага» халестэрыну (калі КА больш за 3, існуе рызыка развіцця атэрасклерозу).

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Даслоўна

ХТО КІРУЕ ЕЎРАПЕЙСКІМ САЮЗАМ?

Пад такім загалоўкам польская газета «Жэчпаспаліта» публікуе вялікі аналітычны артыкул, які пралівае святло на некаторыя праблемы, што маюць месца ў самай магутнай на сёння супольнасці дзяржаў.

Прэм'ер Іспаніі, адзначаецца ў публікацыі, з'яўляецца, калі можна так сказаць, узорным еўрапейцам. А таксама амбіцыйным палітыкам з галавой, поўнай ідэй. У дадатак да ўсяго ён не цураецца тэлевізійных камер. Іспанія фармальна старшынствуе з 1 студзеня ў ЕС, але Хасэ Луіс Радрыгез Сапатэра — ужо не. Урад у Мадрыдзе на працягу першых шасці месяцаў 2010 года будзе вызначаць прыярытэты, вылучаць пастулаты, арганізоўваць сустрэчы, але самае большае, што можа сам кіраўнік урада, дык гэта павітаць гасцей, якія прыязджаюць на саміт, і прасачыць, каб на сталах хапала хрумсткіх палачак і мінеральнай вады. Лісабонская дамова прывяла да таго, што Сапатэра павінен быў саступіць месца Герману Ван Рампею, першаму паўнамоцнаму прэзідэнту Еўрасаюза. Кіраўніку іспанскіх сацыялістаў моцна не пашанцавала, таму што яму на ўласнай скуры давялося выпрабаваць новае размеркаванне роляў ва ўстановах Еўрасаюза. І гэтае тэставанне балючае.

Ужо ў першы тыдзень прэзідэнцтва Іспаніі Сапатэра прадэманстраваў сваю адданасць еўрапейскай інтэграцыі. Шмат гаварыў аб «Стратэгіі 2020» — новым, шматабяцальным праекце, які павінен прынесці ўсім еўрапейцам яшчэ большы дабрабыт і садзейнічаць таму, што Еўропа будзе больш дынамічнай і канкурэнтаздольнай, чым ЗША і Кітай. Ён прапанаваў кароць краіны, якія не адпавядаюць крытэрыям стратэгіі і не будуць, напрыклад, вылучаць дастатковыя сумы на зялёную энергію або сацыяльнае страхаванне. Хутчэй за ўсё, Сапатэра цвёрда вырашыў для сябе, што выразная прапанова «тузаць за лейцы» сустрэнецца з цікавасцю, прынамсі, самых буйных гульцоў у ЕС, і, магчыма, нават з авацыямі.

Пралічыўся. Прамовіў адзін лішні сказ — і сутыкнуўся з рэаліямі палітыкі Еўрасаюза. Гэтыя рэаліі ён, як рэвалюцыянер з гарачай крывёй, хацеў бы сапраўды змяніць, але, на жаль, ён змагаецца не ў сваёй вагавой катэгорыі. Сапатэра адразу ж сутыкнуўся з рэзкай крытыкай, у асноўным у англа-саксонскай прэсе, а таксама з боку міністра эканомікі ФРГ Райнера Брудэрле, які прызнаў яго прапановы «не занадта слушнымі». Аднак найбольш інтрыгуючым быў рэдакцыйны каментарый у газеце «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг», акцэнты якой, асабліва наконт міжнароднай палітыкі, занадта часта супадаюць з пазіцыяй нямецкага ўрада. «Яны (санкцыі, прапанаваныя Сапатэрам) з'явіліся б грубым умяшаннем у суверэннасць прыняцця рашэнняў нацыянальнымі ўрадамі, у права канструявання ўласнага бюджэту. Такая прапанова магла б зыходзіць толькі з краіны, якая фармулёўку «інтэрвенцыя з Бруселя» разумее як бласлаўленне, а не пагрозу. Бо ў апошнія 20 гадоў Іспанія, як ніякая іншая краіна ЕС, чэрпала шмат грошай з розных фондаў ЕС». «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг» пайшла далей, чым Брудэрле, і назвала план Сапатэры папросту абсурдным. Змест гэтага каментарыя можна перадаць у двух сказах: «Спадар Сапатэра, не вы тут кіруеце. Рукі прэч ад Германіі і ад нямецкай касы».

Праз тры дні іспанскі прэм'ер пачаў апраўдвацца, што зусім не меў намеру ўводзіць штрафы, што журналісты дрэнна яго зразумелі. І што пытанне ўжо знятае. Даволі няпэўны і збянтэжвальны пачатак іспанскага прэзідэнцтва ў ЕС. Магчыма, гэта звязана з пытаннем, хто кіруе сёння ў Еўропе?

Адказ зразумелы: галоўным менеджарам з'яўляецца Германія — самы вялікі плацельшчык грошай у саюзны бюджэт, які выцягвае з фінансавай і эканамічнай бездані Польшчу, Партугалію, Балгарыю і некалькі іншых краін. Германія невыпадкова востра змагалася за лісабонскую дамову, таму што яна нарэшце дае ФРГ палітычную сілу, якая адпавядае статусу самай вялікай і багатай дзяржавы Еўрасаюза. Яна ўжо не абавязаная аглядацца на грымасы брытанцаў, можа нават дазволіць сабе адкрыты канфлікт з Францыяй. Відаць, таму Германія з абурэннем адрэагавала на прапановы Сапатэры, які з'яўляўся процівагай уплыву Берліна. Досыць яму было адзін раз тупнуць нагой, каб план Сапатэры рассыпаўся, што сведчыць аб сіле Германіі, якая праводзіць прагматычную, паслядоўную і вельмі эфектыўную міжнародную палітыку па абароне сваіх эканамічных інтарэсаў у свеце.

Увогуле сёння ў дзеяннях Берліна мала чаго агульнага з міфічнымі «агульнымі саюзнымі каштоўнасцямі», затое даволі шмат — з інвестыцыямі нямецкіх канцэрнаў. Канцлер Ангела Меркель па-майстэрску авалодала мастацтвам лавіравання паміж штучным клопатам аб лёсе Еўрапейскага саюза і праўдзівай заклапочанасцю будучыняй «Фальксвагена» або «Баера». Пытанне газаправода «Паўночны струмень» па сутнасці ніколі не было прадметам агульнаеўрапейскіх дэбатаў, хоць урады Германіі і Расіі неаднойчы падкрэслівалі, што гэта інвестыцыя самая што ні ёсць еўрапейская. Інтарэсы «Сіменса», які вырабляе цягнікі для хуткаснай чыгункі «Масква—Пецярбург» важнейшыя, чым якія-небудзь інфраструктурныя праекты ў рамках ЕС. А лёс «Опеля» больш істотны, чым лёс польскіх суднаверфяў, якія, на бяду, можна было прызнаць часткай еўрапейскай суднабудаўнічай прамысловасці. Барацьба з кліматычнымі зменамі? Так, вельмі высакародная мэта, але калі Еўракамісія захацела знізіць ліміты эмісіі выхлапных газаў для вытворчасці новых аўтамабіляў, то менавіта нямецкі ўрад уважліва сочыць за тым, каб абмежаванні не пахіснулі стан айчыннага аўтамабілебудавання.

Найбліжэйшыя партнёры Германіі ў ЕС, французы, ідуць такім жа цынічным, хоць часам менш далікатным шляхам. Апошнім самым вялікім унёскам Францыі ў будучыню Еўропы (і адным з самых шкодных) было выдаленне з лісабонскай дамовы фармулёўкі аб свабодным рынку і канкурэнцыі. Французы ніколі не націскалі б так моцна на стварэнне сумеснай еўрапейскай абароннай палітыкі, калі б не былі саўладальнікамі «Аэробуса» і не выраблялі знішчальнікі «Рафаль». Ніколі не выступалі б з такой сілай за барацьбу з эмісіяй CO_2, калі б не маглі зарабіць на продажы сваіх атамных рэактараў (не выключана, што яны патрапяць таксама ў Польшчу), і ніколі не клапаціліся б так моцна аб механізмах кантролю еўрапейскіх банкаў і фондаў, калі бы не мелі намеру дапячы Лондану і не хацелі стварыць буйны фінансавы цэнтр у Парыжы. Французы вядуць таксама ўласную (прынамсі, не саюзную) палітыку ў дачыненні да Масквы, робячы часам дзівосныя крокі: праз год пасля ўвядзення расійскіх войскаў у Паўднёвую Асецію і Абхазію вырашылі прадаць расіянам вялікі верталётаносец класа «Містраль», які, магчыма, будзе патруляваць... чарнаморскае ўзбярэжжа Грузіі.

Здавалася б, зразумела, што ўрад Германіі і Францыі, у меншай ступені Італіі, выкарыстоўваюць ЕС як інструмент для пабудовы сваёй пазіцыі ў самой Еўропе і на глабальнай арэне. Раздаюць карты і прымаюць ключавыя для старога кантынента рашэнні. Разам са стварэннем корпуса саюзных дыпламатаў роля гэтых краін яшчэ больш узрасце.

Герман ван Рампей лятаў у Афіны, каб пагутарыць на тэму фінансавага крызісу з прэм'ерам Грэцыі. Але не Рампей будзе вырашаць, ці павінен і як павінен дапамагаць Грэцыі Еўрасаюз. Олі Рэн, новы камісар па эканамічных і валютных пытаннях, хоча, каб ЕС заснаваў пасаду высокага прадстаўніка па эканамічных пытаннях. Але досыць адзін раз тупнуць нагой, каб ён хутка забыўся на гэтую прапанову. Жазэ Мануэль Барозу застаўся на пасадзе кіраўніка Еўракамісіі таму, што на гэта пагадзіліся Францыя і Германія. Герман ван Рампей стаў прэзідэнтам ЕС, таму што гэтага захацелі Берлін і Парыж. А канчатковая форма нагляду за фінансавымі рынкамі будзе залежаць ад канцлера Меркель і прэзідэнта Сарказі.

Бо Францыя і Германія застаюцца матарамі ЕС і адначасова кіруюць гэтым аўтобусам, замяняючы адна адну час ад часу за рулём. Ці азначае гэта, што так будзе заўсёды? У будучыні пазіцыя гэтых дзяржаў можа змяніцца. Узровень жыцця ў краінах Еўрасаюза паступова выраўноўваецца, бюджэт ЕС будзе няўмольна памяншацца і праз 20 гадоў аргумент аб шчодрасці Германіі і скандальнай адсутнасці ўдзячнасці ў дачыненні да Берліна з боку Іспаніі або Польшчы можа стаць анахранічным. Роля Германіі, як фінансавай апоры ЕС, ужо не будзе такой відавочнай. Па-другое, Брусель паступова ператвараецца ў еўракратычны двор, у якім былыя і сённяшнія камісары, былыя і сённяшнія еўрадэпутаты, былыя прэм'еры і міністры абменьваюцца партфелямі, займаюць пасады «мудрацоў» і больш-менш фармальных дарадцаў, знаходзяць сабе працу ў розных «мазгавых цэнтрах» і арганізацыях лабістаў. Аднак увесь час круцяцца вакол таго ж саюзнага ядра, таму што Брусель дае ім заробкі, розныя прывілеі і аўтарытэт сучаснага еўрапейца.

Не атрымоўваюць яны толькі аднаго — рэальнай улады. Але па меры таго, як гэтая шкарлупіна еўракратыі будзе станавіцца ўсё цвярдзейшай, палітыкі з розных краін будуць усё часцей глядзець з раздражненнем на ўплыў Германіі і Францыі, усё жывей будуць імкнуцца адрэзаць ад саюзнага пірага як мага больш улады для сябе. Менавіта таму Берлін і Парыж «зарэзалі» кандыдатуру былога прэм'ера Вялікабрытаніі Тоні Блэра на пасаду старшыні Рады Саюза, бо еўракратыя магла атрымаць у яго асобе сапраўднага лідара, які на роўных размаўляе з Меркель і Сарказі, адзначае польская газета.

Падрыхтаваў Міхаіл БАЦЯН.

НЕ ВІНЕН, АЛЕ АДДАЦЬ ПАВІНЕН...

Па такім прынцыпе жылі двое вымагальнікаў, якія ўзялі ў абарот 25-гадовага работніка МАЗа. Да апошняга, паводле звестак прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары Рулінскай, адзін з падазроных прычапіўся ў снежні мінулага года: маўляў, чалавек яму вінаваты грошай. Пад пагрозамі, а дзе і кулакамі крымінальнік выбіваў са сваёй ахвяры «доўг», які пацярпелы плаціў спраўна. Напачатку зламыснік патрабаваў 300 тысяч рублёў, затым яшчэ 300 тысяч, на святкаванне Новага года запрасіў 200 тысяч, потым спатрэбілася ўжо 200 долараў. На чарговую «стрэлку» да сваёй ахвяры злачынца прыйшоў з сябрам: вымагальнікі цяпер патрабавалі ўжо 500 долараў. Праўда, на гэты раз іх чакалі супрацоўнікі міліцыі, якія і затрымалі крымінальны «дуэт».

Ігар ГРЫШЫН.

Ну і ну!

БОЙКА Ў ПАРЛАМЕНЦЕ

Учора ў Кіеве адбыўся чарговы перадвыбарны скандал. На ранішнім пасяджэнні Вярхоўнай Рады ўзнікла бойка паміж прадстаўнікамі Блока Юліі Цімашэнкі і апазіцыйнай Партыі рэгіёнаў, якую ўзначальвае Віктар Януковіч.

Спачатку біліся два народныя выбраннікі, а потым да іх далучылася яшчэ некалькі разгюшаных мужчын. Прычына гарачага канфлікту банальная для ўкраінскага парламента: амаль перад самым перапынкам дэпутаты Цімашэнкі пачалі нечакана збірацца каля стала прэзідыума, а дэпутаты Партыі рэгіёнаў палічылі гэта спробай захопу. Загучалі непарламенцкія выразы, а потым завязалася бойка. У выніку фракцыя Партыі рэгіёнаў заблакавала прэзідыум Вярхоўнай Рады, а дэпутаты Цімашэнкі — парламенцкую трыбуну. Такім чынам, на пэўны час была паралізавана дзейнасць парламента.

Гэта пазачарговае пасяджэнне Рады было склікана пад ціскам фракцыі Партыі рэгіёнаў. На ім прапанавалася разгледзець у другім чытанні законапраект, адзін з артыкулаў якога прадугледжвае адмену колькаснай нормы аб кворуме ў выбарчых камісіях. Змены былі прапанаваныя, патлумачылі «рэгіяналы, у сувязі з магчымым пройгрышам Цімашэнкі 7 лютага, якая можа з гэтай нагоды арганізаваць зрыў выбараў: ёй дастаткова даць каманду сваім прадстаўнікам у выбарчых камісіях не прыйсці ці пакінуць іх у дзень галасавання.

Нагадаем, цяпер у склад усіх выбаркамаў увахо-дзяць прадстаўнікі абодвух кандыдатаў у прапорцыі 50 на 50. У адпаведнасці з цяперашнім законам аб выбарах прэзідэнта, выбаркам будзе лічыцца паўнамоцным, калі ў яго працы возьмуць удзел не менш за дзве трэція ад яго складу. «Рэгіяналы» выступаюць за адмену гэтай нормы на той выпадак, калі прыхільнікі Цімашэнкі нечакана праігнаруюць удзел у працы камісіі. Выбаркам павінен быць паўнамоцным незалежна ад паводзінаў прадстаўнікоў Блока Юліі Цімашэнкі. А тыя ў сваю чаргу сцвярджаюць, што адмена нормы аб кворуме — прамы шлях да фальсіфікацый.

Леанід ТУГАРЫН.

Пог ляд

«РАСІЙСКАЯ КАРТА» ВА ЎКРАІНСКАЙ ГУЛЬНІ

Тэма «маскоўскай пагрозы» і закулісная «змовы з Крамлём» сёння актыўна мусіруецца ў ходзе перадвыбарнай палітычнай барацьбы ва Украіне.

Як ні імкнулася Расія дэманстратыўна трымацца на прыстойнай адлегласці ад выбараў ва Украіне, але ж цень велізарнай і магутнай суседняй дзяржавы нябачна і трывала прысутнічае ў палітычнай гульні, дзе прыз — пасада прэзідэнта. Тым ці іншым бокам постаць афіцыйнай Масквы ўзнікае ў ходзе перадвыбарных баталій, прычым часцей не па добрай яе волі. Расію часам штучна ўцягваюць ва ўкраінскі трылер на адмоўныя ролі. І тон тут задаецца на самым «версе». Яшчэ пакуль дзейны прэзідэнт Віктар Юшчанка прама і адкрыта называў Юлію Цімашэнку і Віктара Януковіча ўдзельнікамі «крамлёўскай кааліцыі», выкрыў іх намер здаць нацыянальныя інтарэсы Расіі ў абмен на падтрымку Масквы на цяперашніх выбарах. А тым часам яшчэ пакуль дзейны прэм'ер-міністр Юлія Цімашэнка моцна хвалюецца за магчымы захоп улады «антыўкраінскай клікай» на прэзідэнцкіх выбарах, якая перакрэсліць усе гады станаўлення незалежнасці, умацавання Украіны.

У палітычную перадвыбарную рыторыку падключыўся нават беглы расійскі алігарх Беразоўскі, які з Лондана звярнуўся да калегаў — украінскіх алігархаў з парадай паўплываць на грамадства, на палітычнае жыццё краіны ў правільным кірунку. Бо Украіне належыць зрабіць складаны выбар паміж мінулым і будучыняй. Як чалавек з вялікім досведам, Беразоўскі строга папярэджвае: вы страціце ўсё, калі выбераце мінулае. А лепшыя шанцы на перамогу, на погляд Беразоўскага, — у Цімашэнкі.

Дзіўныя метамарфозы адбываюцца з дзейнымі і былымі ўкраінскімі палітыкамі ў ходзе перадвыбарнай кампаніі. На мінулых прэзідэнцкіх выбарах першы прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук актыўна падтрымліваў Януковіча, называў яго «чалавекам слова і справы» і сур'ёзным палітыкам, здольным вырашыць любыя праблемы. Цяпер Краўчук — даверараная асоба Цімашэнкі, ён не шкадуе чорнай фарбы, каб звесці да нуля імідж яе канкурэнта. Краўчук у чарговы раз абвінаваціў Януковіча ў намеры зрабіць з Украіны «поўнага сатэліта Расіі». З пафасам гаворыць, што яму сорамна за Януковіча, які заклікаў прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Гэта, на думку Краўчука, сведчыць аб поўнай адпаведнасці з дыпламатычнай практыкай і пратаколам. Нагадаем, Зурабаў быў прызначаны паслом замест Віктара Чарнамырдзіна яшчэ ў пачатку жніўня 2009 года, але тады Крэмль у знак нязгоды з палітыкай Юшчанкі палічыў за лепшае ў «выхаваўчых» мэтах адтэрмінаваць прыезд новага пасла. Ёсць у дыпламатычнай практыцы такі спосаб выказвання незадавальнення іншаму боку. Замест пасла прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў накіраваў адкрыты ліст прэзідэнту Украіны, у якім абвінавачыў яго ў ажыццяўленні антырасійскага курсу. Такое вось узнікла напружанне.

Сітуацыю змякчыў ход выбараў. Паводле слоў кіраўніка расійскага МЗС Сяргея Лаўрова, вынікі першага тура даюць падставы лічыць, што Кіеў перагледзіць стаўленне да развіцця супрацоўніцтва з Расіяй, яно цяпер будзе значна меней ідэалагізаваным. Але не паспеў Зурабаў уручыць міністру замежных спраў Украіны адрасаваныя прэзідэнту Юшчанку даверчыя граматы, як у Кіеў нечакана завітаў былы пасол ва Украіне Чарнамырдзін. Мэты візіту ён патлумачыў проста: аказваць дапамогу Зурабаву, бо для яго Украіна вельмі важная, тут ён прапрацаваў восем гадоў. Па ўсім відаць, пераемніку Чарнамырдзіна спатрэбілася неадкладная кансультацыя альбо экстранная дапамога ва ўсталяванні важных кантактаў.

А работы ў Зурабава ў Кіеве будзе вышэй галавы, як кажуць. За час свайго прэзідэнцтва Юшчанка прыняў шмат, мякка кажучы, спрэчных рашэнняў, садзейнічаў стварэнню шматлікіх неадназначных і канфліктных сітуацый, якія прыйдзецца «разрульваць» новаму паслу. Гэта відавочна. Прысваенне звання Героя Украіны лідару Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў Сцяпану Бандэру можна лічыць у пэўным сэнсе «вышынёй», антыдасягненнем кіравання Юшчанкі. У адказ узнік сапраўдны цунамі абурэнняў як у краіне, так і за мяжой. Яе хвалі дасягнулі Страсбурга, дзе днямі расійская дэлегацыя ўнесла ў сакратарыят Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) праект рэзалюцыі аб асуджэнні ўказа Юшчанкі па ўхваленні памяці нацыяналіста Бандэры. З рэзкім асуджэннем ініцыятывы Юшчанкі выступілі, у прыватнасці, Ізраіль і Польшча. І сапраўды, гераізацыя «бандэраўцаў», якія супрацоўнічалі з нацыстамі, удзельнічалі ў злачынствах супраць яўрэйскага, польскага і ўкраінскага насельніцтва Заходняй Украіны, дрэннае паслуга для Цімашэнкі. Яна ў свядомасці мільёнаў выбаршчыкаў атаясамліваецца як адна з арганізатараў «памяранцавай рэвалюцыі», прадаўжальніцай яе справы.

Напярэдадні як першага, так і другога тура не было дэфіцыту разважанняў наконт расійскага фактару ў лёсе Украіны. І гэта пры тым, што Масква неаднойчы афіцыйна заяўляла аб сваім неўмяшанні ў выбарчы працэс на Украіне і гатоўнасці прызнаць любы выбар яе народа. Але калі на папярэдніх выбарах пераважна гаварылі аб «руцэ Масквы», спробах Крамля прасунуць у прэзідэнты менавіта Януковіча, то цяпер многія сур'ёзныя аналітыкі, у тым ліку і замежныя, пішуць аб неўмяшанні Расіі ў выбарчы працэс. Па назіраннях нямецкіх журналістаў, Расія настолькі халадна і дыстанцыйна паставілася да выбарчай валтузні, быццам гаворка ідзе аб выбарах у бананавай рэспубліцы Лацінскай Амерыкі. Масква зразумела: адсутнасць бачнай падтрымкі і ёсць лепшая падтрымка для пажаданага ёй Януковіча, як лічаць немцы.

Можа і так, але за добрасуседскія і ўзаемавыгадныя адносіны з ёй выступаюць абодва кандыдаты. Яны разумеюць, што без фінансавай дапамогі Масквы Украіне пагражае банкруцтва эканомікі. Ды і Расіі не патрэбна нестабільная, з разбуранай гаспадаркай Украіна, ад якой будзе толькі галаўныя боль.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

В СВЯЗИ С ПРОЦЕССОМ ЛИКВИДАЦИИ УП «ЛАНДЫШ», ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:

Лот 1. Склад для топлива об. пл. 68,6 кв. м, производственный цех об. пл. 272,6 кв. м, котел КСИ-0,09Т, забор чугунный, туалет кирпичный, *Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.* Начальная стоимость с НДС — 31 937 769 бел. руб. (снижена на 40 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

Лот 2. Швейный цех об. пл. 394,2 кв. м. *Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.* Начальная стоимость с НДС — 86 453 439 бел. руб. (снижена на 40 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

Лот 3. Здание цеха об. пл. 3406,5 кв. м, ограждение (кирпичное; ж/б), таль электрическая ТЭ-050, котел КСТ-25, котел КСВ-0,09Т, кабель электроснабжения 0,4 кВ, *г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57 а.* Начальная стоимость с НДС (снижена на 40 %) — 508 987 287 бел. руб. Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 1,6491 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

Объекты продаются без условий. Задаток перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422 УП «Ландыш».

Аукцион состоится 26.02.10 г. в 12.00 по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.

Контактный тел. 801795 2 43 26, м.т. 8029 670 96 63.

12 марта 2010 года состоится общее собрание акционеров **ОАО «ЛУКОМЛЬЭНЕРГОМОНТАЖ»,** расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8

Собрание пройдет по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытия убытков) за 2009 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, на 2010 г. и первый квартал 2011 г.
7. Об увеличении уставного фонда Общества путем увеличения номинальной стоимости акций за счет источников собственных средств.
8. Об утверждении регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 03 марта 2010 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 08.00 до 09.45.

Время начала проведения собрания 10 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 10 февраля 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества — паспорт;
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. БРЕСТЕ

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. 2-я Белорусская, № 140100000001019335	ул. Шоссейная, № 14010000001020247	мкрн. «Вулька-1», ул. Рябиновая, № 140100000001014415	ул. В. Интернационалистов, 19 № 140100000001019530	ул. л-та Рябцева (р-н старого аэропорта) № 140100000001020148	ул. В. Интернационалистов, 23 № 140100000001019531	ул. Октябрьской революции – ул. 28 Июля № 140100000001020990	ул. Волгоградская в районе рынка «Ковалево» № 140100000001020989
№ лота	1*	2*	3*	4*	5*	6*	7*	8*
Начальная цена продажи (руб.)	140 622 262	33 179 042	31 789 154	29 756 431	114 704 023	36 301 217	1 474 838 992	228 628 011
Сумма задатка (руб.)	14 000 000	3 317 000	3 178 000	2 975 000	11 470 000	3 630 000	147 483 000	22 862 000
Расх. по подг. земел.– кадастр. док. (руб.)	1 450 817	1 663 968	1 235 300	5 795 970	1 216 304	5 810 313	3 178 097	1 429 481
Общая площадь (га)	0,8704	0,1079	0,0684	0,0673	0,2835	0,1056	3,5375	0,4910
Срок аренды	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	строительство и обслуживание объекта общественного питания	строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	строительство и обслуживание объекта административно-хозяйственного назначения	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условием создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны	строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления	- 0,0190 га – охранная зона санитарно-защитная полоса водоводов и водопроводов; 0,0047 га – охранная зона газопровода среднего давления	0,0146 га – охранная зона газопровода низкого давления; 0,0160 га – охранная зона напорной канализации	0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	0,0435 га – охранная зона газопровода высокого давления

Адрес участка/ кадастровый номер	район индивидуальной застройки «Вычулки-Ямно» № 140100000001021585	район ул. Коммерческая № 140100000001022617	«ЮЗМР-4» № 18а по ГП № 140100000001022681	«ЮЗМР-4» № 19а по ГП № 140100000001022682	р-н пересечения б-ра Шевченко и Варшавского шоссе № 140100000001024785	ул. Осипенко № 140100000001024784	ул. Шоссейная № 140100000001024786	ул. Гоголя № 140100000001024864	ул. Строительная № 140100000001024865
№ лота	9*	10*	11*	12*	13	14	15	16	17
Начальная цена продажи (руб.)	373 957 964	323 312 090	47 824 428	42 747 422	3 250 403	576 226	4 574 018	5 320 464	689 114
Сумма задатка (руб.)	37 395 000	32 330 000	4 780 000	4 270 000	325 000	57 000	457 000	532 000	68 000
Расх. по подг. земел.– кадастр. док. (руб.)	2 636 253	–	755 221	739 422	626 446	617 626	601 279	627 024	627 024
Общая площадь (га)	2,0631	1,7760	0,1234	0,1103	0,0255	0,0015	0,0299	0,0104	0,0015
Срок аренды	10 лет	25 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения	строительство логистического центра	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	установка и обслуживание базовой станции связи стандарта GSM 900/1800	установка и обслуживание павильона многофункционального назначения	строительство и обслуживание временного объекта технического обслуживания автотранспорта	строительство и обслуживание жилого дома или административно-офисного здания с объектами торговли (услуг) и социально-культурного назначения на 1-м этаже	установка и обслуживание торгового павильона
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	0,3305 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 киловольт; 0,2105 га – охранная зона подземных кабельных линий связи; 0,0240 га – охранная зона воздушных и кабельных линий радиофикации;	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	0,0255 га – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос	0,0006 га – охранная зона магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений	ограничений в использовании земель нет	0,0055 га – санитарно-защитные полосы водоводов	0,0002 га – охранная зона линий электропередачи

*– повторные аукционные торги

Дополнительное условие по лоту № 9 – возмещение потерь с/х производства в сумме 26 094 700 рублей, вызванных изъятием 2,0631 га пахотных земель; **по лоту № 10** – возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией в отношении создания земельного участка и потерь с/х производства в сумме 15 705 400 рублей

Условия продажи - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение расходов, связанных с подготовкой земельно-кадастровой документации и гос. регистрации в отношении создания зем. участков, по лотам 9, 10 возмещение потерь с/х производства; - заключение с Брестским горисполкомом договора аренды зем. участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении участка гос. регистрации прав на него; - начало освоения зем. участка в течение 6 месяцев с даты проведения аукциона и подписания протокола о его результатах; - получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие плодородного слоя почвы и использование его для нужд, связанных со строительством объекта, и на благоустройство г. Бреста

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Перечень документов, представляемых потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенная копия платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. **Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.** Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов. Победитель аукциона обязан:● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка; ● заключить с Брестским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и услов

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Прыгожае жыццё

Партрэт «Міс Беларусь-2010» — высокая брунетка са шматлікімі талентамі і без таму?

СЁМЫ Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь» перайшоў у наступную стадыю: на пачатку гэтага тыдня стала вядома, што з 300 прэтэндэнтак 30 дзяўчат атрымалі пуцёўкі ў фінал. Прычым толькі пяцёра з прыгажунь — бландзінкі! Настолькі відавочна сусветная тэндэнцыя пераваг ў конкурсах прыгажосці цёмнавалосых дзяўчат праявілася ў беларускім адборы ўпершыню.

Паводле слоў кіраўніка праекта Анжэліны Мікульскай, праведзенымі кастынгамі журы, у якое ўвайшлі кіраўнікі вядучых мадэльных агенцтваў Беларусі, засталося вельмі задаволена: сёлета прафесіяналы ўбачылі шмат яркай, цікавай фактуры, новых вобразаў і перспектыўных дзяўчат. І хоць некаторых з іх па ўзросце ў шоу не дапусцілі, запрасіўшы прыйсці яшчэ праз два гады, аднак прыкмецілі, а то і запрасілі да сябе ў агенцтвы.

Па ўзросце ўсе фіналісткі ўкладаліся ў вызначаныя межы — ад 18 да 24 гадоў, але асноўная частка — 22—23-гадовыя. А вось што датычыцца росту (не ніжэй за 175 см), для некаторых прыгажунь суддзі рабілі выключэнне — так, у фінал конкурсу прайшла дзяўчына з Гродзенскай вобласці ростам «усяго» 171 см — на 13 см ніжэй за самых высокіх суперніц. Дапусцілі да ўдзелу і дзвюх кандыдатак з татуіроўкамі — але пры ўмове, што ў найбліжэйшы час дзяўчаты пазбавяцца ад гэтых нацельных роспісаў.

Што да геаграфіі ўдзельніц, то сёлета ў лідарах — Мінск і Мінская вобласць, якія вылучылі па 6 дзяўчат, а ў аўтсайдарах — Віцебшчына, дзе адабралі ўсяго 2-х кандыдатак, хоць планаваліся не менш за 3 ад кожнай вобласці. (Пры тым, заўважым, у папярэдніх конкурсах прадстаўніцы Віцебскага рэгіёна двойчы ўздымаліся на п'едэстал, у тым ліку і «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова, а мінчанкі — ніводнага разу!) 5 дзяўчат будуць абараняць гонар Гомельшчыны, па 4 — Гродзеншчыны і Магілёўшчыны, 3 прэтэндэнткі на карону — прадстаўніцы Брэсцкай вобласці. «Зрэшты, не факт, што ў фінальным шоу мы ўбачым усіх 30 дзяўчат, — расказала «Звяздзе» прэс-сакратар тэлеканала АНТ Таццяна Курбат. — 1 сакавіка фіналісткі збяруцца ў Мінску на падрыхтоўчы этап, і з імі пачнуць займацца спецыялісты па «навядзенні лоску» — харэографы, стылісты, выкладчыкі дэфіле, трэнеры, псіхолагі і г.д. Магчыма, падчас падрыхтоўкі прафесіяналы адсеюць яшчэ некалькіх дзяўчат — тых, хто псіхалагічна няўстойлівы, губляецца на вялікай сцэне альбо празмерна капрызнічае». Словам, да фінальнага шоу, што адбудзецца ў сталічным Палацы спорту 30 красавіка, дойдуць не толькі самыя прыгожыя і таленавітыя, але і самыя цярплівыя, працаздольныя і маральна ўстойлівыя. І яшчэ вельмі добрыя: цягам гэтага месяца ва ўсіх рэгіёнах адбудуцца дабрачынныя акцыі, па выніках якіх будзе вызначана «Міс Дабрачыннасць». Дарэчы, ужо вядома, што сярод фіналістак мы не ўбачым «зорак»: ні прызёрак «Міс Мінска», ні былых фіналістак «Міс Беларусь», ні ўдзельніц папулярных дзявочых гуртоў. Затое ўбачым прафесійную тэлевядучую, віцэ-чэмпіёнку краіны па спартыўна-бальных танцах і вельмі шмат выпускніц музычных школ.

Тэлевізійныя дзённікі конкурсу «Міс Беларусь-2010» АНТ пачне паказваць з канца сакавіка — усяго запланавана 6 выпускаў. Акрамя ўладальніцы галоўнай кароны і дзвюх віцэ-міс, нагадаем, журы вызначыць пераможцаў у міні-конкурсах «Міс Спорт», «Міс Талент», «Міс Фота» і «Міс Топмадэль».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Брунеткі сёлета ў фаворы!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.51	16.56	9.05
Віцебск —	7.45	16.42	8.57
Магілёў —	7.41	16.46	9.05
Гомель —	7.33	16.48	9.15
Гродна —	8.06	17.12	9.06
Брэст —	8.04	17.14	9.10

Месяц

Апошняя квадра 6 лютага. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Георгія, Івана, Макара, Мікалая, Пятра, Цімафея, Якава.*

К. *Веранікі, Андрэя, Юзафа.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Сардэчна віншуем супрацоўніка прэс-службы ААТ «АСБ Беларусбанк» **Сяргея Мікітавіча ВЕРАШЧАКА з 55-годдзем!** Зычым шчасця, здароўя, дабрабыту, творчага натхнення. Хай не стамляецца Ваша залатое пяро.

Калегі.

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Праз «гродзенскі» інтэрнэт (www.forum.grodno.net) пры падтрымцы Чырвонага Крыжа прайшла акцыя дапамогі дзіцячаму дому змешанага тыпу па праспекце Янкі Купалы.

Дабрачынную акцыю падтрымалі каля двухсот гродзенцаў. За два тыдні сабралі і перадалі дзіцячаму дому вялікую колькасць канцтавараў, адзення і абутку, дыскаў з фільмамі і музыкай, настольных гульняў, швейнай фурнітуры для заняткаў у гуртках, камп'ютар, два маніторы і іншыя рэчы. Акцыя завяршылася канцэртам, які арганізавалі члены клуба аматараў японскай культуры і ўдзельнікі Гродзенскага музычнага партала, конкурсамі і «салодкім сталом» для выхаванцаў дзіцячага дома.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Усміхнемся!

— А што гэта ў цябе рука забінтаваная?

— Ды ўчора дзятла з далонькі пакарміла...

☺

Пастаянныя пакупнікі крамы «На рыбалцы» ведаюць адзін аднаго таксама і па клубе ананімных алкаголікаў.

☺

Мужык сустракае сябра.

— Што з табой здарылася? Увесь твар у сіняках і драпінах, ледзь паўзеш... Давай я цябе хоць давяду дадому!

— Ты з глузду з'ехаў? Я з дому іду!

☺

Не ўсё тое жонка, што лаецца.

☺

Дзве суседкі з азвярэннем выбіваюць дываны.

— «Жыгулі» прыдумалі мужыкі. Сволачы.

— Ага, каб па доме нічога не рабіць...

☺

Я дзесяць гадоў займаюся боксам, жонка — кік-боксінгам. Мы не спрачаемся. Нам жахліва.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 4 (336)

Як правільна размясціць дрэвы і кусты ў групах

«Мы набылі ўчастак зямлі на ўскрайку вёскі ў 15 сотак і хацелі б засадзіць яго садовымі і дэкаратыўнымі дрэвамі і кустамі. Можа існуюць нейкія правілы пасадкі дрэў на невялікіх плошчах?»

М. Міхальчонак, *г. Мінск.*

Вось што на гэты конт раяць спецыялісты.

У дэкаратыўных мэтах дрэвы і кусты часта высаджваюць групамі. Па велічыні адрозніваюць дробныя (3-5 раслін), сярэднія (7-15) і буйныя (больш як 15) групы. Пры кампаноўцы драўнінных груп у цэнтры высаджваюць самыя буйныя экзэмпляры, а па краях больш дробныя. Адлегласць паміж дрэвамі залежыць ад пароды. Пасаджаныя блізка адно ад другога (2-5 м), яны ўтвараюць агульную няроўную крону, а пры размяшчэннях на вялікіх адлегласцях (5-15 м) развіваюць свае кроны да поўнага памеру. Дрэвы з кронай вялікага аб'ёму і пароды з буйнымі лістамі размяшчаюць як мага далей адзін ад другога, а пароды з рэдкай і празрыстай кронай высаджваюць гусцей і бліжэй.

Адлегласць паміж буйнымі кустамі павінна быць 2-2,5 м, сярэднімі 1,5-2 м і дробнымі 0,5-1 м. Каб паскорыць змыканне кустоў, іх можна высаджваць і гусцей, але ў наступным неабходна праводзіць праredжванне.

Існуюць пэўныя правілы пасадкі дрэў і кустоў у групах. Напрыклад, у групе, якая складаецца з трох экзэмпляраў, расліны высаджваюць па вуглах роўнастаронняга трохвугольніка, з чатырох — па вуглах — чатырохвугольніка, з пяці — па вуглах няправільнага чатырохвугольніка і адно дрэва ўнутры яго на некаторым аддаленні ад цэнтра.

Плануючы пасадкі вечназялёных раслін, улічыце, што іх часцей за ўсё губіць не мароз, а яркае веснавое сонейка. У нагрэтай кроны абуджаюцца пупышкі, расліны выпараюць ваду, а карані знаходзяцца ў мёрзлай глебе. У выніку гэтага ўсыхаюць цэлыя галіны. Папярэдзіць гэту з'яву можна, прыцяняючы з лютага расліны спанбондам або размяшчаючы пасадкі ў цені.

Парэчкавая пупышкавая моль

Гэта вельмі распаўсюджаны шкоднік чорных, чырвоных і белых парэчак. Зімуе моль у стадыі вусеня ярка-аранжавага колеру ў круглых шчыльных коканах ля асновы куста пад карой, якая адстала ад галінкі, на пяньках, што засталіся пасля выразання старых галін. Выхад з месяцаў зімоўкі ва ўмовах цэнтральнай зоны пачынаецца ў залежнасці ад умоў надвор'я ў канцы лютага—пачатку красавіка ў перыяд набухання пупышак, калі тэмпература паветра дасягае 13—15 градусаў, і працягваецца звычайна 8—10 дзён. Гэта самы лепшы час для барацьбы са шкоднікам. Вусені ўгрызаюцца ў пупышкі на верхавінках галінак, якія ўдзень прагравоюцца мацней за іншых, і выядаюць усё, што знаходзіцца ў сярэдзіне пупышкі, аплятаючы шаўкавінкамі агрызкі і экскрыменты. Пашкоджаныя пупышкі засыхаюць. Харчуюцца вусені ў пупышках 30—40 дзён, гэта значыць да пачатку цвіцення парэчак. За перыяд харчавання кожны вусень пашкоджвае ў асноўным 2—4 пупышкі.

Акукліваецца шкоднік у верхнім слоі глебы на працягу 9—13 дзён, што супадае з перыядам, калі фарміруюцца кветкавыя кісці і пачынаецца масавае цвіценне парэчак. Лёт матылькоў пачынаецца ў маі і заканчваецца, калі парэчкі адцвітаюць. Перыяд лёту 9—10 дзён. Самка адкладвае яйкі ў мякаць зялёных ягад у асноўным групамі па 2—15 як. Вусені адраджаюцца з як праз 5-8 дзён у перыяд заканчэння росту і калі ягады пачынаюць спець. Яны на працягу некалькіх дзён кормяцца насеннем ягад. Пашкоджаныя ягады раней за іншыя мяняюць колер, нібыта пачынаюць спець. Напрыклад, у чорных парэчак чорныя ягады выдзяляюцца сярод зялёных і няспелых.

Своечасовая нарыхтоўка чаранкоў парэчак да выхаду вусеняў пупышкавай молі з зімоўкі дае магчымасць пазбегнуць заносу гэтага шкоднікa з пасадачным матэрыялам. Восеньская абрэзка і спальванне сухіх галін, кароткая абрэзка пянькоў дазволяць знізіць колькасць зімуючых вусеняў молі. Апырсканне кустоў у перыяд, калі пупышкі пачынаюць толькі-толькі распускацца, актэлікам, КЭ 500 г/л (15 мл на 10 л вады) даюць магчымасць знізіць колькасць вусеняў на 84—100 працэнтаў. Можна прымяняць таксама фуфанон, 570 г/л к.э.(4 мл на 10 л вады). Супраць маладых вусеняў праводзіцца апыльванне кустоў тытунёвым пылам, змешаным з попелам або гашанай вапнай (1:1). Перакопванне глебы пад кустамі ў канцы цвіцення парэчак таксама садзейнічае знішчэнню кукалак шкодніка.

Лечыць фасоля

Зараз той час, калі гаспадыня складае план пасадак на агародзе. І многія вельмі карысныя расліны часам выпадаюць з гэтага плана толькі таму, што мы, можа, не ўсё ведаем пра гэтыя расліны. Адвядзіце месца на ўчастку такой сціплай, але вельмі карыснай расліне, як фасоля.

Сярод дэкаратыўных, кармавых, харчовых і лекавых відаў фасолі самы распаўсюджаны — фасоля звычайная. Гэта аднагадовая травяністая расліна з сям'і бабовых. Спелае насенне харчовай фасолі змяшчае да 26 працэнтаў бялку з разнастайным амінакіслотным складам, вітаміны, вугляводы, тлушчы, а таксама солі розных металаў і іншыя элементы. Рэдкі прадукт параўнаецца з фасоллю па пажыўнасці і карысці. Зерне фасолі валодае высокай каларыйнасцю. Яно змяшчае шмат вугляводаў і карыснае пры знясіленні пасля цяжкіх інфекцыйных захворванняў. У склад фасолі ўваходзяць біялагічна актыўныя рэчывы, якія ўплываюць на колькасць, а галоўнае — на склад лейкацытаў у крыві. Яны выпрацоўваюць антыцелы і павышаюць імунітэт.

У народнай медыцыне насеннем фасолі лечаць апёкі. Бабы папярэдне падсмажваюць да светла-карычневага колеру, расціраюць у муку, змешваюць са свежай смятанкай. Муку, замешаную на мёдзе, прымяняюць пры рожыстым запаленні скуры. Здаўна фасолю прымяняюць пры цукровым дыябеце. Стравы з фасолі карысныя пры сардэчна-сасудзістых і ныркавых захворваннях. Зялёная фасоля таксама валодае мачагагоннымі ўласцівасцямі. Яе карысна ўжываць пры падагры, парушэннях солевага абмену.

Сінюха блакітная — добры медонос

Сінюха блакітная або лазуровая, грэчаская валяр'яна, адалень-трава, палемоніум — усё гэта назвы адной расліны. Першую назву яна атрымала дзякуючы ярка-сіняй афарбоўцы кветак. Другая назва — палемоніум — мае цікавую гісторыю. Існуе дзве легенды. У адной з іх гаворыцца, што сінюха была любімай кветкай Палемона, камандуючага флотам арміі Аляксандра Македонскага. Калі верыць другой легендзе, то сінюха паслужыла ў старажытнасці прычынай вайны (на грэчаскай мове «палемос» — вайна, ваеннае майстэрства). Можа гэтыя легенды звязаныя паміж сабой, таму ў сінюхі ёсць яшчэ народная назва: «грэчаская валяр'яна»?

Сінюха — шматгадовая зімастойкая расліна, дасягае вышыні да 1,2 м, яе яркія духмяныя кветкі сабраны ў мяцёлчатыя або шчытападобныя суквецці. Цвіце сінюха ў чэрвені-ліпені, часам другі раз у жніўні. Плод — шматнасенная каробачка з амаль чорным па колеры насеннем. З XVI стагоддзя яна ўведзена ў культуру.

Дэкаратыўнасць сінюхі неаспрэчная. Яе пяшчотныя кветкі з ярка-жоўтымі тычынкамі вельмі зачароўваюць. Існуе садовая форма гэтай расліны з белымі, ружовымі і блакітнымі кветкамі. Ёсць таксама разнавіднасць сінюхі са стракатымі лістамі.

Расліна прывабна выглядае ў групах: каля кустоў, у міксбордэрах, прыгожая яна і ў букетах. На жаль, пасля цвіцення сінюха губляе сваю дэкаратыўнасць, таму яе рэкамендуецца саджаць сярод іншых кветкавых культур на другім плане. Пасля абрэзкі адцвіўшых раслін у сінюхі з'яўляюцца маладыя парасткі і яна набывае яшчэ больш прывабны выгляд — лісты застаюцца зялёнымі да снегу.

Сінюха — не толькі дэкаратыўная, але і лекавая расліна, якая са старажытных часоў выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. І толькі ў 60-х гадах XX ст. сінюхай зацікавілася афіцыйная медыцына. Заспакаяльнае дзеянне сінюхі ў шмат разоў мацнейшае, чым валяр'яны і нават сардэчніку. Выкарыстоўваецца як адхарквальны сродак, добра дапамагае пры лячэнні коклюшу. Яе выкарыстоўваюць пры лячэнні кішачных захворванняў і тых захворванняў страўніка, у аснове якіх ляжыць павышаная нервовая ўзбуджальнасць. Акрамя таго, сінюха валодае раназажыўляльным, антысклератычным, кроваспыняльным дзеяннем, а таксама зніжае крывяны ціск. Нават пры працяглым прыёме прэпараты з сінюхі добра пераносяцца і малатаксічныя.

У лекавых мэтах выкарыстоўваюцца карані. Яны ў сінюхі тоўстыя, да 3 см у дыяметры, кароткія да 5 см. На смак адразу здаюцца горкімі, а потым саладкаватымі з адчуваннем слізі. Карэнне выкопваюць увосень на другі год, хутка мыюць і рэжуць уздоўж, сушаць на сонцы і ў цені. Наземная частка раслін як лекавы сродак менш карысная.

У хатніх умовах лякарства з сінюхі прыгатаваць нескладана. 2 ст. лыжкі сыравіны змяшчаюць у эмаліраваны посуд, заліваюць шклянкай кіпеню (200 мл) і награваюць на вадзяной лазні 20 хвілін, затым ахалоджваюць і працэджваюць. Да атрыманага адвару дадаецца гарачая гатаваная вада да першапачатковых 200 мл.

У якасці адхарквальнага сродку адвар прымаюць па 1 ст. лыжцы 3—5 разоў на дзень, пры хваробах страўніка — па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень пасля яды, пажадана адначасова прымаць адвар травы сушаніцы.

Прасцей за ўсё размнажаць сінюху вегетатыўна, дзяленнем каранёў. Гэта робяць ранняй вясной альбо ўвосень. Яна добра прыжываецца пасля перасадкі на новае месца. Лёгка размнажаецца яна насеннем і нават дае самасеў. Насенне можа прарастаць пры тэмпературы 3-4 градусы. Яго можна сеяць у грунт пад зіму або ранняй вясной, заглыбляючы на 1-2 см. У першы год утвараецца разетка прыкаранёвых лістоў, на другі год усе расліны зацвітаюць.

Аднак пры веснавой сяўбе ў грунт дробнае насенне не заўсёды паказвае высокую ўсходжасць, таму больш надзейна пасеяць яго ў сакавіку ў скрынку, а затым распікіраваць сеянцы ў грунт.

Расліна непатрабавальная да глебы, але лепш расце на акультураных участках, у засушлівае лета патрабуе пастаяннага паліву, інакш сцёблы сінюхі робяцца жоўтымі і яна губляе дэкаратыўнасць. Саджаць яе лепш на заднім плане сярод выносліваых да засухі шматгадовых раслін (лазаніца, герань, манарда і інш.)

І яшчэ адна вартасць сінюхі: яна выдатны меданос. Мёд, сабраны з яе кветак, гаючы і духмяны.

Факт

РЭГУЛЯТАРЫ ЦЯПЛА ЭКАНОМЯЦЬ АД 15 ДА 20 ПРАЦЭНТАЎ ЭНЕРГІІ

У Гродне завершана праца па аснашчэнні прыборамі ўліку і рэгулявання спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў у жылых дамах ад дваццаці кватэр і болей.

Паводле інфармацыі **генеральнага дырэктара прадпрыемства «Гродзенская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка» Мікалая ПЯТРОВІЧА**, эканомія цеплавой энергіі складае ад 15 да 20 працэнтаў у залежнасці ад тэмпературы знадворнага паветра. Тэрмін акупнасці — паўтара-два гады.

У васямнаццаці жылых дамах Кастрычніцкага раёна абласнога цэнтра ўкаранілі сістэму дыстанцыйнага кантролю з вывядзеннем інфармацыі на цэнтральны пульт пры дапамозе тэлевізійных кабельных ліній. За папярэдні ацяпляльны перыяд эканомія цеплаэнергіі па гэтых дамах склала 44 тоны ўмоўнага паліва, альбо 19 мільёнаў рублёў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Дзве даты

4 лютага

Сёння — Сусветны дзень барацьбы супраць рака. Праводзіцца штогод па ініцыятыве Міжнароднага саюза па барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.



1746 год — у сям'і берасцейскага мечніка Людвіга Касцюшкі і Тэклі з роду Ратамскіх нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, які ў далейшым стаў нацыянальным героем пяці краін. Сям'я Касцюшкаў адносіцца да старажытнага беларускага шляхецкага роду. Пачатковую адукацыю Тадэвуш Касцюшка атрымаў у калегіі Любешава на Піншчыне, затым закончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, працягваў навучанне ў Францыі. У 1776-1783 гадах жыў за акіянам, змагаўся ў радах добраахвотнікаў за незалежнасць Злучаных Штатаў. Дзякуючы ваеннаму таленту Касцюшкі, амерыканская армія выйграла ў 1777 годзе адну з найважнейшых бітваў той вайны, якая засталася ў гісторыі як бітва пад Саратогай. Яму быў прысвоены чын брыгаднага генерала, а пазней установлены помнікі ў Чыкага, Кліўлендзе, Вашынгтоне і Мілуокі. У 1794 годзе Тадэвуш Касцюшка ўзначаліў паўстанне ў Польшчы, Беларусі і Літве, быў цяжка паранены, захоплены ў палон і па загаду Кацярыны II пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Вызвалены імператарам Паўлам I. Доўгі час жыў у эміграцыі, памёр Касцюшка ў 1817 годзе.

1977 год — у Мінску пачалося будаўніцтва метрапалітэна.

Цытата дня:

«Вочы — гэта ініцыялы душы».

Дон Амінада (1888—1957), рускі паэт-сатырык.

РЫТУАЛЬНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ВАДЫ НА ПРАЦЯГУ КАЛЯНДАРНАГА ГОДА: ЗІМА

Абапіраючыся на шматлікія фальклорна-этнаграфічныя крыніцы, архіўныя матэрыялы, уласныя запісы, зробленыя ў час экспедыцыйных паездак, мы паспрабуем сістэматызаваць звесткі аб выкарыстанні святой, цудадзейнай, «жывой» вады ў каляндарным колазвароце нашага жыцця, падаць іх у храналагічнай паслядоўнасці са спадзяваннем на тое, што духоўна-аздараўленчы вопыт нашых продкаў хоць у нейкай ступені дапаможа людзям знайсці палёгку целу і душы.

25 снежня або 7 студзеня — першы дзень Калядаў, Раство Хрыстова

● У першы дзень Калядаў яшчэ на досвітку гаспадар прыносіў у хату свежую ваду. У драўляныя ночвы апускалі дробную сярэбраную манету, налівалі ваду. Спачатку «пасярэбранай» вадой мыў твар сам гаспадар, а за ім усе дамачадцы. Людзі верылі, што такі рытуал «забяспечыць» чысціню твару, які не будзе пакутаваць ні ад марозу, ні ад спякоты. Цікава і тое, што кожны, хто далучаўся да выканання абраду, спачатку прамаўляў запаветныя словы: «Будзь здаровы, як вада».

1 або 14 студзеня — Новы або стары Новы год

● Лічылася, што той, хто ў першы дзень новага года першым прынясе вады з калодзежа і першым памыецца, той увесь год па жыцці будзе першым.

● У час першага навагодняга ўмывання ў ваду трэба пакласці медныя або залатыя грошы (або ўпрыгажэнні), каб на працягу года быць прыгожым і здаровым, а сярэбраныя грошы або рэчы — каб мець чысты белы твар.

18 студзеня — пярэдадзень Вадохрышча

● Трэцяя куцця, якой завяршалася двухтыднёвае святкаванне Калядаў, называлася «вадзяной», «ваданоснай». У некаторых сем'ях у гэты дзень увогуле нічога не елі, толькі пілі ваду. Часцей за ўсё гэта былі сем'і пчаловадаў, сярод якіх бытавала павер'е: калі ў гэты дзень устрымацца ад ежы, то добра будуць раіцца пчолы.

19 студзеня — Вадохрышча

● Самай шануемай, выключнай па сваім аздараўленчым статусе лічылася вада, узятая 19 студзеня. Яе абавязкова прыносілі ў хату, крапілі ўсе куты, сцены, умываліся ёю, пілі, каб быць здаровымі і «ачысціцца» ад усялякіх грахоў. Яе бралі як мага больш, каб хапіла на працягу года ў самых розных сітуацыях.

● У дзень Вадохрышча з хаты ні з якой нагоды не дазвалялася выносіць ваду. Не дазвалялася аддаваць яе чужым людзям. А для свойскай жывёлы ваду рыхтавалі загадзя.

20 студзеня — Провады Калядаў, Правадахрышча, Сабор Іаана Прадцечы

● У гэты дзень у цэрквах адбываецца малое асвячэнне вады. У гонар Іаана Прадцечы, аднаго з найвялікшых прарокаў, які завяршыў гісторыю Старога запавета і адкрыў эпоху Новага. У свае трыццаць гадоў ён прыйшоў на бераг Іардані і хрысціў грэшнікаў, а разам з імі і бязгрэшнага Ісуса Хрыста, тым самым ён паклаў пачатак таінству хрышчэння, у аснове якога — амаўненне чалавека святой вадой.

15 лютага — Стрэчанне, Грамніцы

● Акрамя грамнічных свечак, у гэты дзень у храмах асвячалі ваду, якая набывала незвычайныя гаючыя здольнасці, якой лячылі «вогнік», рожыстае запаленне рук і ног, а таксама апёкі і асабліва чырвоныя плямы на целе дзяцей, якія, па народных вераваннях, узніклі з-за таго, што цяжарная жанчына спужалася пажару.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Шчыра віншуем **Лідзію Іванаўну ВОЛАТ з днём нараджэння**. Жадаем моцнага здароўя, аптымізму, сямейнага шчасця, дабрабыту і радасці.

Родныя з г. Слуцка і в. Замосце.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 548. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12